Уладзімір Калеснік

# ПАСЛАНЕЦ ПРАМЕТЭЯ

Дакументальная аповесць

KAMUNIKAT.org

*Мінск “Юнацтва” 1984*

Для старэйшага школьнага узросту

Мастак У.М. Жук

Рэцэнзенты М. С. АРЭХВА, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партьті пры ЦК КПБ, У. А. ПАЛУЯН, доктар гістарычных навук, М. С. СТАШКЕВІЧ, кандыдат гістарычных навук.

kamunikat.org

Калеснік У.

К 17 Пасланец Праметэя: Дакум. аповесць. [Для ст. шк. узросту/Маст. У. М. Жук].— Мн Юнацтва, 1984.— 160 с, 4 л. іл.

30 К.

Пісьменнік У. Калеснік расказвае аб жыцці і дзейнасці Анатоля Альшэўскага, сакратара ЦК камсамола былой Заходняй Беларусі, паплечніка Веры Харужай.

Жыццёвыя шляхі героя аповесці паказаны ў цеснай сувязі з рэвалюцыйпым рухам, з барацьбой працоўных эа сваё сацыяльнае і нацыяпальнае вызваленне.

Ясны агонь ідэі гарыць у чалавечай душы з таго часу, калі Праметэй украў агонь у багоў, шыбеніцы не згасяць гэтага агню...

*ТЭОДАР ДУРАЧ.*
*З прамовы адваката*

KAMUNIKAT.org

## *ДА ЮНЫХ ЧЫТАЧОЎ*

*Я хачу расказаць вам пра жыццё Анатоля Адамавіча Альшэўскага, які ў гады першай сусветнай вайны ў школьным узросце трапіў з Беларусі ў далёкі горад Арзамас, пасябраваў з Аркадзем Тайдарам, а ў памятным 1920 годзе арганізоўваў камсамол на роднай Пружаншчыне, стаў важаком моладзі ў заходнебеларускім падполлі, другам і паплечнікам Веры Харужай, змяніў яе пасля арышту на пасадзе сакратара ЦК камсамола Заходняй Беларусі. У канцы 20-х — сам апынуўся ў Макатоўскай турме, выменяны ў 1928 годзе па дагавору паміж савецкім і польскім урадамі, вярнуўся ў СССР, дзейнічаў у рэвалюцыйным руху Заходняй Беларусі, спачатку як прапагандыст у замежным выдавецтве ЦК КПсБ у Мінску, а ў 1932 годзе — кіраўнік падпольнага краёвага бюро ЦК КПЗБ у Варшаве. Герой аповесці — прафесійны рэвалюцыянер, яго вачыма я меў магчымасць паказаць знутры грамадска-палітычнае жыццё буржуазнай Польшчы 20—30-х гадоў, спрабаваў намаляваць шэраг значных і малавядомых эпізодаў палітычнай драмы.*

*Мне хацелася правесці юнакоў і дзяўчат па жыццёвых дарогах прафесійнага рэвалюцыянера, пазнаёміць з ленінскімі прынцыпамі стратэгіі і тактыкі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, акінуць позіркам гістарычны шлях, поспехі і няўдачы, пошукі і здзяйсненні перадавой моладзі Заходняй Беларусі, яе барацьбы за ўз'яднанне нашага народа ў адзінай сацыялістычнай краіне.*

*Называючы Альшэўскага пасланцом Праметэя, я меў намер падкрэсліць, што герой гэтай кнігі толькі чалавек ля вогнішча гісторыі. Яго станоўчыя рысы і поспехі, могуць дапамагчы арыентавацца ў жыцці тым юным чытачам, якія хочуць свядома фарміраваць свае характары, выпрацоўваць навуковы светапогляд, узбагачаць свае грамадскія і маральныя пачуцці перадавымі ідэаламі.*

**ПІСЬМЫ Ў БЯРОЗУ**

Яго партыйная клічка — Юрка Пружанскі — многае гаварыла камуністам-падпольшчыкам Заходняй Беларусі дваццатых гадоў.

Няўрымслівая натура, акрашаная добрым сямейным выхаваннем, абцёртая на маладзёжна-камсамольскай рабоце, яшчэ ў гады грамадзянскай вайны вылучала яго сярод кіраўнікоў рэвалюцыйна-вызваленчага руху не толькі ў Палескім краі, дзе яму даводзілася бываць найчасцей і дзе ён адчуваў сябе найлепш, але і ў Вільні, і ў Варшаве, і ў Мінску.

Сёння шаноўныя ветэраны ўспамінаюць, што не аднаму з іх даводзілася іншы раз пракарпець дзень і ноч, каб скласці лістоўку ці адозву, а Юрка, бывала, прыткнецца дзе-небудзь да лавы, блакнот на калена — і адным махам напіша лістоўку, ды такую лістоўку, што проста за душу бярэ. Вядомая рэч: каб слова брала за душу, той, хто кажа ці піша яго, сам павінен мець шчырую душу ды чулае і гарачае сэрца.

Публіцыстыка партыйнага падполля ў Заходняй Беларусі была, як правіла, ананімнай, і сёння цяж-ка, бадай немажліва, распазнаць тыя лістоўкі і адозвы, якія — паводле ўспамінаў сяброў — так ёмка і хвацка пісала рука Юркі Пружанскага. Напэўна, ён валодаў пяром публіцыста. Але галоўны сакрэт уздзеяння яго лістовак не ў дары слова, а ў пазіцыі і ў маральным аўтарытэце падполля, да якога ён належаў. Друкаваныя творы, падпісаныя прозвішчам аўтара і псеўданімам «Юрка Пружанскі», «Ю. П.» ці проста Юрка, таксама як і непадпісаныя лістоўкі, расплыліся ў шырокім рэчышчы заходнебеларускай партыйнай публіцыстыкі.

У дваццатыя гады пісьмы Юркі Пружанскага часта імчаў міжнародны экспрэс Масква — Варшава і пакідаў на станцыі Бяроза-Картузская. Са станцыі іх дастаўлялі ў горад, а там начальнік пошты сігналіў каменданту паліцыі: «Ізноў чырвоная зараза!» Сышоўшыся на сутонні ў апусцелым службовым будынку, пан камендант і пан начальнік адпарвалі над рондлікам тоўсты канверт, асцярожна вымалі густа запісаныя прамым ясным почыркам аркушы шэрай сшыткавай паперы, чыталі. Паддаючы адзін аднаму патрыятычнага гневу, лаялі чырвоную «саўдэпію», якая

легальна, па дзяржаўнай пошце шле сабе ў вольную Польшчу бальшавіцкія мікробы. Да слёз умілення расчульваліся служакі над сваёй улюбёнай айчынай: якая яна культурная, еўрапейская, далікатная — не можа ўжыць права і сілы, каб спыніць гэтую шкодную перапіску, нішчыць пісьмы — рассаднікі чырвонай заразы. Абмяжоўваецца толькі «перлюстрацыяй». Паны паўтаралі адзін перад адным гэтае новае і такое далікатнае на слых, пералівістае, як гарэзлівы шчэбет дзіцяці або сваволны бег ручайка, слоўка: «Перлюстрацыя, перлюстрацыя!.. Цікава...»

— Па-хрысціянску яно лепш — не забарона, а перлюстрацыя,— гаварыў ціхманы акураціст, начальнік пошты.— Што каму адрасавана, тое і даставіць ва ўласныя рукі. Саліднасць фірмы...

— Мяккацеласць. Суровую забарону і праследаванне павінна ўвесці дзяржава,— пярэчыў пан камендант.— Мала канфіскаваць! Прымусіць трэба адрасатаў, каб уласнымі рукамі знішчалі гэтакія пісьмы, нават не чытаўшы іх. Публічна! І ў прысутнасці ўлады — вось гэта будзе парадак!

— Хіба што прыняць закон. Забараніць перапіску па закону. А сваевольных — пад суд,—- пачынаў падладжвацца пад тон каменданта ціхманы начальнік пошты.

— Што? Судовыя цырымоніі? — дзівіўся той.— Ці не задужа чэсці будзе для гэтых шэльмаў? Яны толькі таго і чакаюць. Дай ім суд, і дны ператвораць пасядж,энне ў мітынг. Паразяўляюць горлы і данай агітаваць за грамадзянскія вольнасці. Я іх знаю!.. Забараніць і праследаваць у адміністрацыйным парадку. Заціснуць у кут, і баста! — спляча адрубаў камендант і браўся нешта выпісваць з ліста, можа, для дакладу па службе, нейкі факт. Потым моўчкі працягваў канверт субяседніку — заклейвай.

— Увогуле, пан камендант мае рацыю,— пайшоў на папятную начальнік пошты.— Агнём і мячом трэба выпякаць заразу ў самым зародку. Змяіны ўкус выпякаюць... У белых пальчатках дэмакратыі сапраўды з гэтаю эпідэміяй не справіцца. Вядома ж, бязбожная, цёмная чэрнь...

Адчуўшы, што страціў недзе свой твар, начадьнік пошты пераключаўся на хвалю хрысціянскай міласэрнасці — яна, зрэшты, ніколі і нікога не падвяла, апостальская зброя

цярпення і любові. Гэта адзін, канешне, від зброі. Але ж хрысціяне язычнікаў адолелі не агнём і мячом, а любоўю, стойкаю пакорай. Калі па-хрысціянску, дык што, вінаваты, скажам, бацькі? Хіба яны вучаць дзяцей пісаць такія пісьмы і станавіцца бязбожнікамі, разбуральнікамі? Ну, хоць бы вось гэты мілы, пачцівы старушак,— начальнік пошты памахаў канвертам, які толькі што заклеіў,— хіба ён даваў дрэнны прыклад сынам? Пошасць, пане, была такая. Па ўсёй Еўропе, а ў Расіі — чыстае пекла. Няшчасце... Як перад канцом свету, пане...

— А пан, каханы пане начальнік, не літуйся збытна над гэтым старушкам. Сам гаварыў, што сыны яму долары, а не рублі прысылаюць. Долары! Відаць, добрыя чырвоныя тузы! Камісары, псяюха!

— Паліцыя заўжды мае рацыю,— здаваўся начальнік.— Я толькі з хрысціянскай міласэрнасці, так сабе, па-людску. Ды і канфідэнцыяльна ж, без сведак. А на людзях — мы ж палякі! Адна сям'я.

Служакі даходзілі да згоды і раскланьваліся з пачуццём выкананага, хоць і прыкрага, але патрэбнага для дзяржавы абавязку.

Гэта было ў дваццатыя гады. Канстытуцыйная гарантыя тайны перапіскі ўсё ж абавязвала службоўцаў стрымлівацца. У пачатку трыццатых, у спазмах крызісу дайшло і да таго, пра што з цынічным даверам прагнуў камендант правінцыяльнага ўчастка паліцыі. Пісьмы з Савецкага Саюза і нават левыя газеты з краін Захаду «перлюстроўваліся» і пасля службовага выкарыстання проста знішчаліся. Часам дастаўляліся адрасатам дзеля прыманкі, каб выявіць «ласых» на камуністычную прапаганду чытачоў у вёсках, дзе ўся перапіска ішла па грамадзе і чыталася часта ўголас гуртам. Слухачы маглі каменціраваць прачытанае. Людзі параўноўвалі жыццё тут, у буржуазнай Польшчы, з жыццём у СССР. Параўнанні былі нежаданыя, бо выпадалі на карысць Савецкай дзяржавы. А да Саветаў пануючыя колы тагачаснай Польшчы ставіліся незычліва, нават варожа. У Бярозе-Картузскай, як і ў іншых мястэчках і гарадах Заходняй Беларусі, службоўцы мелі ўдосталь бруднай работы.

Пісьмы цікавілі самога міністра ўнутраных спраў Рэчы Паспалітай. У справаздачах Навагрудскага ваяводы міністэрству аб грамадска-палітычным становішчы за чэрвень 1932 года прыведзены вытрымкі з лістоў вясковага хлопца Пятра Бусько, адрасаваных сёстрам у вёску Пагарэлка Стаўбцоўскага павета. Ён бясхітрасна расказваў блізкім пра жыццё-быццё, і, мабыць, у такой свойскай інфармацыі ахоўнікі рэжыму адчувалі асаблівую небяспеку. Бусько пісаў сёстрам: «Як для вас, жанчын, дык буду гаварыць аб жаночай працы, ад якой тамашняя жанчына гіне — а іменна, аб печы. У нас жа большая частка гаспадынь, а гарадскія то напэўна забылі, як паліць печ. Сталуюцца ў сталоўках. Прымаюць яны ўдзел у адбудове краіны, займаюць адказныя пасады і спраўляюцца са сваімі задачамі спраўна... Другая цікавая рэч — тое, што як выйдзеш у горад, дык не пабачыш чалавека, які ішоў бы без кнігі ці газеты. Не магу не ўспамянуць аб нашым парадку, што з кім бы ні сустрэўся... нават хаця б то быў сам Сталін, гаворыцца ўсім «таварыш» і ніхто не мае на нікога ніякай злосці»[1].

Пятро Навумчык родам з Новага Свержна апісваў родным поспехі на працы і ў жыцці: «Выехалі мы ў Перм на работу, будуем новы горад... Жыццё вельмі добрае, можна зарабіць сама мала 3 рублі ў дзень. Работа лёгкая: толькі 8 гадзін у дзень працуем, пасля працы ходзім у школу... Прашу не тужыць. Нам вельмі весела: штовечар ідзём у клуб, глядзім кіно, паказваюць карціны навуковага зместу»2. Савецкі чытач, які звыкся з сацыялістычным укладам жыцця, можа паціснуць плячыма: «А што тут асаблівага?».Але не так думаў навагрудскі ваявода: у памянутай справаздачы міністру ўнутраных спраў ён зрабіў праніклівы каментарый: «Уцекачы, якіх Саветы пакінулі ў сябе, прадаўжаюць прысылаць да родзічаў і знаёмых пісьмы, дзе выхваляюць парадкі ў Савецкай Расіі, намякаючы нярэдка, што хутка настане час сустрэчы... Пісьмы выключна пераканальна прапагандуюць на карысць СССР і ў значнай ступені паглыбляюць дрэнныя палітычныя настроі ў

---

[1] Дзржархіў Брэсцкай вобласці, ф. 28, вопіс 9, звязка 39, спр. 1049 арк. 215

[2] *Тамсама.*

насельніцтва»[3] Службовая сцэнка тэндэнцыйная, падказаная страхам, ператрыманая, але ў аснове сваёй адпавядае праўдзе, і гэта варта ўвагі. Пісьмы былі непрыкметнаю, але грознаю зброяй у барацьбе за душы людзей працы.

Такія пісьмы, апаленыя бяссільнай чыноўніцкай злосцю, прыносіў паштавік у драўляны домік з пафарбаванымі аканіцамі, што туліўся да густога вішняку, па вуліцы Глінкі, 22. Гэта быў дом сціплага пісара з мясцовага міравога суда Адама Іванавіча Альшэўскага: сапраўднае прозвішча Юркі Пружанскага, адправіцеля пісьмаў, было Альшэўскі Анатоль Адамавіч. Праўда, к сярэдзіне 30-х гадоў, на радасць мясцовым чыноўнікам, плодны аўтар нечакана змоўк.

## АРЗАМАС

Калі верыць глухім сямейным паданням, род Альшэўскіх стары, ледзь не «гербоўны», праўда, у гербе мела красавацца на белым фоне шчыта чорная варона... Ды, увогуле, было тое вельмі даўно. Яшчэ продкі страцілі зямлю і сталі чыноўнаю марнотай. Незайздросная доля перадавалася ў спадчыну дзецям. Дзед Анатоля служыў валасным пісарам у ваколіцах Беластока, бацька пайшоў па слядах свайго бацькі. Скончыўшы гарадское вучылішча ў Гродне, ён атрымаў назначэнне на пасаду пісара ў Шэнеўскую воласць Пружанскага павета. Доўга цярпліва працаваў малады пісарэвіч і ўжо сталым кавалерам, прыдбаўшы капейку, рашыўся на шлюб з беднай, але прыгожай дзяўчынай, што працавала служанкай у тутэйшага бацюшкі. Там, у Шэнях, у 1897 годзе нарадзіўся першы сын Албшэўскіх — Яраслаў.

Анатоль прыйшоў на свет у 1904 годзе ўжо ў Бярозе, на новым месцы бацькавай службы, якое стала і месцам аселасці маладой сям'і. Гаспадар быў працавітым, начытаным і надзіва акуратным чалавекам. Летам 1915 года, калі рускія войскі пад націскам немцаў пачалі адступаць і ў горадзе была аб'яўлена эвакуацыя насельніцтва, Адам Іванавіч не рушыў з месца, покуль не адшукаў павятовага начальства і ледзь не сілай прымусіў прыняць пад распіску валасны архіў. Толькі пасля

[3] Дзржархіў Брэсцкай вобласці, ф. 28, вопіс 9, звязка 39, спр. 1049 арк. 187

гэтага павёз ён сям'ю ў далёкі, выбраны наўгад па карце горад з мілагучнаю назвай Арзамас. Выбар аказаўся шчаслівы: горад быў ціхі, заможны. Будзённыя дні Арзамас бавіў у крамах ды ўстановах, святочныя — у цэрквах, якіх тут было каля трыццаці. У Арзамасе знайшоўся для Альшэўскіх дах над галавою і сякая-такая служба гаспадару, а значыць, і пэўны кавалак хлеба для ўсіх.

Яраслаў, дзякуючы дапамозе «Пленбежа», закончыў у 1916 годзе Ніжагародскую гімназію і, зарабіўшы крыху грошай прыватнымі ўрокамі, паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Маскоўскага універсітэта. На жаль, не доўга яму давялося вучыцца, па «экстранаму» прызыву юнак быў узяты ў войска і пасланы салдатам у Царыцынскі вучэбны батальён, а потым як студэнт быў накіраваны ў Іркуцкую студэнцкую школу прапаршчыкаў. На шчасце, пад нямецкія кулі трапіць не паспеў. Выпушчаны ў красавіку 1917 года ў званні прапаршчыка, Яраслаў прыбыў у 108-мы запасны пяхотны полк у Екацерынбург, а ў студзені 1918 года быў дэмабілізаваны.

Анатоль пасля прыезду паступіў у 2-гі клас Арзамаскага рэальнага вучылішча.

Восенню 1915 года вучылішча прыняло цэлую групу вучняў-бежанцаў з Беларусі. Жылося іх сем'ям не соладка, туліліся ў бараках, хібарах, паўпадвалах. Нястачы, клопаты збліжаюць людзей, выклікаюць патрэбу дапамагаць адзін аднаму. А іх яшчэ яднала туга па кінутых сялібах, па далёкай, акупіраванай немцамі радзіме. Асабліва дружна жылі між сабою сем'і Альшэўскіх і Горыных-Калядоў з Пружанаў. Іх дзеці таксама трымаліся дружна, зямляцкім хаўрусам, сваёю кампаніяй, нібыта абараняючыся ад дапытлівасці арзамаскіх калег, якія зайздросцілі навічкам, што прыехалі ажно з-пад самага фронту. Асабліва інтрыгавалі сваім выглядам і манерамі двое — адзін высокі з правільнымі рысамі твару, сур'ёзны хлопец, а другі малы, шустры і жвавы хлопчык з вясёлым позіркам карых вачэй. Ён быў апрануты ў белую касаваротку, падпярэзаную шырокай папругай. Убранне гэтае, здавалася, было такое чыстае, што парушынкі і тыя, лятаючы ў паветры, абміналі яго. Старэйшы быў не толькі акураціст і прыгажун, ён насіў старанна расчасаныя густыя цёмныя валасы, спраўна сядзела на ім роўнымі складкамі сабраная над рэменем кашуля.

Вучням карцела пазнаёміцца з новенькімі бліжэй, хацелася пачуць ад іх расказы пра вайну і незвычайныя прыгоды. Але землякі сціпла трымаліся асабняком, як змоўшчыкі. Сваёй выключнасці яны, мабыць, саромеліся, але неўпрыцям прывыкалі да яе і пачыналі моўчкі ганарыцца. Чым толькі не ганарацца людзі, асабліва ва ўзросце, калі ганарыцца яшчэ няма чым.

Аднак жа знайшоўся адзін смелы, хто нарушыў недатыкальнасць новенькіх. Аднойчы, калі гэтыя двое выйшлі з будынка вучылішча, да іх падступіў не па гадах рослы вучань другога класа. Ён фамільярна ляпнуў меншага па плячы і сказаў:

— Друг майго друга — мой друг. Так? Пазнаём нас, Толька.

— З прыемнасцю. Павел, нанэўна, не супраць. Гэта наш сусед і аднакласнік Аркадзь Голікаў. Павел Горын-Каляда — мой зямляк і старэйшы друг.

— Таксама паляк?

— Не, беларус, гэта не паляк і не зусім рускі.

— Такога не бывае. Паляк,— упэўніўся ў сваім Аркадзь.— І вось што, прыходзьце да нас на чай. З Толем мы суседзі. Кніг у нас — поўная хата. Цікавых!..

Толя Альшэўскі і Аркадзь Голікаў насябравалі. Абодва яны зачытваліся кнігамі, асабліва прыгодніцкімі, ну і часамі тымі, чытаць якія не раілі дарослыя.

Дапытлівы, здольны Альшэўскі хутка стаў любімцам школы. Настаўнік славеснасці даверыў «першаму вучню» ключы ад школьнай бібліятэкі. Прыбегшы дамоў, Толя расчуліўся ледзь не да слёз: «Чаму мне столькі даверу?.. Ох, цяпер я буду чытаць, чытаць, чытаць!» Асвойтаўшыся на становішчы школьнага бібліятэкара, ён клікаў у сваю кніжную скарбніцу сястрычку Зою, яшчэ першакласніцу, і хваліўся, паказваў, уладаром якіх каштоўнасцей зрабіў яго лёс.

Але час не надта спрыяў кніжным захапленням. Хваля рэвалюцыйных падзей дакацілася да горада і падхапіла юнакоў, як падхоплівае вясновая плынь скрышаныя крыгаломам ільдзінкі. Жыццё стала раптам неймаверна цікавым, поўным падзей і таямніц. Традыцыйныя нормы і

граніцы ўзросту, устаноўленыя для малалеткаў, адпалі, школьнікі пачалі адчуваць сябе на роўных правах з дарослымі.

У тыя першыя дні стала вядома, што і ў ціхманым Арзамасе было сваё падполле. Арганізавала яго настаўніца гімназіі і рэальнага вучылішча вядомая ў горадзе дзеячка Марыя Валяр'янаўна Гопіус. Была яна жонкай інжынера, але трапіла ў Арзамас у 1908 годзе з Ніжняга Ноўгарада не па сямейных абставінах, а па прадпісанню губернатара, які звольніў яе з пасады настаўніцы Сормаўскай нядзельнай школы для рабочых і выслаў пад нагляд паліцыі ў Арзамас. Ссылка была карай за выкарыстанне школы для нелегальнага навучання рабочых марксізму. Тэорыю Маркса Марыя Валяр'янаўна засвоіла ў студэнцкія гады ў Маскве, наведваючы гурток, у якім выкладаў Вацлаў Вароўскі. І ў сонным Арзамасе знайшла гэтая энергічная жанчына духоўна актыўных людзей, сабрала іх у падпольны марксісцкі гурток і ў сваім доме тайна вяла заняткі. Там атрымалі ідэйную загартоўку дзесяткі арзамасцаў, а пазней і прыезджая моладзь — бежанцы. У дні лютаўскай рэвалюцыі Гопіус вывела сваіх гурткоўцаў з падполля і паслала весці палітыка-выхаваўчую работу на фабрыку Мачалава, у настаўніцкі клуб і ў школы горада. Яе кватэра на ўскраіне, у канцы вуліцы Сальнікава, ператварылася ў штаб арзамаскіх бальшавікоў. Ля дома ў пачатку сакавіка праходзіў першы рэвалюцыйны мітынг.

Марыя Валяр'янаўна стала працаваць сакратаром павятовага выканкома, але не закінула і сваёй любімай педагагічна-прапагандысцкай дзейнасці. Цяпер яна займалася з гурткоўцамі, чытала лекцыі рабочым, вяла гутаркі ў бараках, заселеных бежанцамі, у лазарэтах — з параненымі салдатамі, прамаўляла на сходах жанчын.

Недзе зімою 1917 года на вуліцы Сальнікава ў Арзамасе адкрыўся легальны бальшавіцкі клуб. Аркадзь Голікаў з Толем Альшэўскім прыдумвалі прычыны абы забегчы туды, пабыць сярод бальшавікоў, паслухаць. Хацелася слова ў слова запамятаць усю лекцыю або даклад, карцела атрымаць даручэнне старэйшых — занесці пакет, расклеіць у горадзе бальшавіцкія лістоўкі і адозвы, даведацца, дзе якая арганізацыя праводзіць мітынг, нарэшце, патруляваць вызначаныя вуліцы, ахоўваць бальшавіцкія сходкі. Аркадзь Гайдар прыгадваў пазней ва ўспамінах: «Як толькі залуналі

чырвоныя сцягі лютаўскай рэвалюцыі, дык і ў такім захудалым мястэчку, як Арзамас, знайшліся добрыя людзі. Прымкнуў я да іх выпадкова, хутчэй за ўсё з цікавасці. Іх было няшмат, трымаліся яны кучкай. Смела выступалі на мітынгах... Пазней я зразумеў, што гэта за людзі. Гэта былі бальшавікі. Пакрысе пачалі яны давяраць мне і даваць розныя даручэнні: збегаць туды, аднесці тое, выклікаць таго. А я бегаў, адносіў, выклікаў, а сам увесь час слухаў ды слухаў». Гайдар у 1918 годзе ўступіў у Чырвоную Армію. Павел Горын-Каляда, які хутка стаў у бальшавіцкім клубе паўнапраўным членам, увайшоў у марксісцкі гурток Марыі Валяр'янаўны Гопіус і неўзабаве быў прыняты ў Камуністычную партыю. Альшэўскі дзейнічаў сярод моладзі.

А падзеі ўсё згушчаліся. У 1918 годзе да горада дакацілася рэха яраслаўскага эсэраўскага мяцяжу: у ваколіцах Арзамаса гойсалі кулацкія ўзброеныя банды, чэкісты выкрывалі контррэвалюцыйныя гнёзды ў самім горадзе. Бальшавікі стараюцца з усіх сіл, каб ахапіць сваім уплывам як мага шырэйшыя пласты насельніцтва, перш за ўсё моладзь і нават падлеткаў, У гэты час Анатоль Альшэўскі па заданню старэйшых стварае арганізацыю юных сяброў рэвалюцыі пад назваю «Дзетвара». Яна супрацьстаяла буржуазным бой-скаўтам. Гэта была адна з першых у краіне папярэдніц піянерскіх арганізацый. Сябры саюза «Дзетвара» выходзілі за горад, купаліся ў Цешы, гулялі, а потым разам чыталі кнігі, развучвалі п'есы, ладзілі спектаклі, бегалі пасыльнымі камсамольскай і партыйнай ячэек. Аддзел народнай асветы выдзеліў для работы з «Дзетварой» настаўніцу спеваў і музыкі, адвёў для арганізацыі спецыяльнае памяшканне. «Дзетвара» мела свой статут, членам выдаваліся пасведчанні. Адно, выдадзенае за подпісам Анатоля Альшэўскага на імя Пятра Мелібеева, сёння даволі вядомага пісьменніка, уцалела ў яго і захоўваецца ў Арзамаскім краязнаўчым музеі.

У пісьме да мяне пісьменнік П. Мелібееў так успамінае пра сябра школьных гадоў: «З Толем Альшэўскім мы разам былі ў саюзе «Дзетвара», адной з дзіцячых культурных арганізацый, папярэдніц піянерскага руху, стыхійна ўзнікшых пасля рэвалюцыі. Арганізатарамі «Дзетвары» ў Арзамасе былі сем'і Альшэўскіх і Каляды. Толя быў камісарам саюза... душою арганізацыі. Тады яму было гадоў 14-15 і ў яго ўжо яскрава

праявіўся талент арганізатара-важака. Толя заўсёды быў вясёлы, жвавы, мог захапіць усіх, і мы, хлапчукі, не адыходзіліся ад яго ні на крок, лічылі за шчасце, калі Толя цябе пахваліць або даручыць зрабіць штосьці патрэбнае для арганізацыі. Не, ён ніколі не камандаваў, не загадваў, а захапляў, заахвочваў справай, і справа тады станавілася страшэнна цікавай».

У органах народнай асветы Арзамаса Анатоль Альшэўскі здабыў такі аўтарытэт, што калі брат Яраслаў, ужо чырвонагвардзеец, прыбыў у водпуск дамоў з-за цяжкай хваробы бацькі, дык малодшы сказаў яму:

— Я ўладкую цябе на працу ў нас. Той усміхнуўся паблажліва:

— Эх ты, клёцка-клёцка, ён будзе мяне на працу ўладкоўваць!..

Але давялося Яраславу змяніць сваю думку пра малодшага на сем гадоў брата. У Арзамаскім аддзеле народнай асветы сказалі яму: «Калі вы такі ж энергічны і дзелавы, як ваш брат, то прымем інструктарам».

Браты нейкі час працавалі поплеч, адкрывалі асветныя курсы, гурткі, агітавалі за бальшавіцкіх кандыдатаў у Саветы, арганізоўвалі камуны, вучылі грамаце ў «лікбезах».

Яраслаў здружыўся з камуністамі Арзамаса Бранштэйнам і Усціновічам і па іх паруцы ўступіў у бальшавіцкую партыю. У канцы 1918 года, калі бацька паправіўся, ён добраахвотна занісаўся ў рады Чырвонай Арміі і быў накіраваны Ніжагародскім губваенкомам на Заходні фронт у якасці агітатара — у 3-ці Літоўскі полк. Хутка Яраслаў Альшэўскі стаў камісарам 132-га палка, а затым начальнікам 4-й часткі ў палітаддзеле 17-й дывізіі.

Вецер вайны захапіў Аркадзя Голікава і Паўла Каляду. Захапіў ды панёс, каб аднаго вярнуць цераз гады рамантычным юначым пісьменнікам Гайдарам, а другога вучоным-гісторыкам, прэзідэнтам АН БССР.

Прыбавіўшы сабе гадоў, рослы Аркадзь пераканаў у 1918 годзе вайсковую камісію і быў залічаны ў Чырвоную Армію. З шабляю і наганам ля боку, ён заходзіў, пазвоньваючы шпорамі, у кватэру Альшэўскіх і доўга расказваў Толю пра сутычкі з узброенымі групамі эсэра-меншавіцкіх мяцежнікаў,

якімі кіраваў мацёры палітыкан, багаты прадпрыемец Растоўскі. Летам, калі Аркадзь Голікаў — баец часці спецназначэння — вяртаўся з дзяжурства дамоў, нейкі затоены бандыт упрыцемках напаў на яго, ударыў нажом у грудзі. Выратавала тоўстая бобрыкавая куртка ды свая цвёрдая рабрына, у якую, на шчасце, трапіла і ўтыркнулася нажавое лязо. Тады ж Аркадзь падаў ва ўездны Камітэт РКП (б) заяву: «Прашу прыняць мяне ў Арзамаскую арганізацыю РКП. Паручаюцца за мяне тав. Гопіус, Вавілаў. 27 жніўня, 1918 г.»[4]. Летам наступнага года Аркадзь Голікаў выехаў на фронт ад'ютантам камандзіра чырвонаармейскага атрада. Папрасіўся ў армію і Толя, але не пусцілі. Пазайздросціў другу, да якога пераходзіла, як вымпел, таямнічасць біяграфіі, што нядаўна ў Арзамасе належала дзецям бежанцаў з Беларусі. Праўда, і тут бывала небяспечна. Хіба мала смеласці і адвагі патрэбна было, каб змагацца за правы падлеткаў, якіх мясцовыя лабазнікі ды прамыслоўцы, гаспадары прыватных майстэрань замучвалі працай ад світання да змяркання. Арзамаскі камітэт камсамола ў лютым 1920 г. склікаў гарадскую канферэнцыю ўсёй рабочай моладзі. Выбралі эканамічна-прававую камісію з давераных маладых рабочых. Яе ўзначаліла дзёрзкая, няўрымслівая агонь-дзяўчына Іда Сегаль. Грамадскія кантралёры павінны былі дапамагчы дзяржаўным інспектарам выявіць факты эксплуатацыі дзяцей. Вінаватых гаспадароў можна было потым прыцягнуць да адказнасці па закону Савецкай улады, які забараняў наймаць на працу дзяцей да 14 гадоў, а падлеткам ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў устанаўліваў працоўны дзень не больш як чатыры гадзіны. Грамадскія кантралёры ўзброіліся інструкцыямі і ўзяліся за справу. Зразумелая рэч, што гаспадары і адміністратары прыватных прадпрыемстваў сустрэлі юных кантралёраў варожа. Але кантралёры не чакалі таго, што і тыя, каго яны абаранялі — рабочыя падлеткі,— стануць глядзець на іх спадылба. Іншыя нават лаяліся са сваімі заступнікамі або ўпрошвалі не ўмешвацца ў іх справы, пакінуць у спакоі адносіны з гаспадарамі: баяліся, што гаспадар прагоніць іх з работы або

[4] Цыт. па кн.: С. Кірылюк. «В годы огневые» (Очерки первых лет Арзамасской комсомолии. 1919—1921 гг.). «Горкаўск. абл. адз-не Т-ва «Веды», 1967, с. 16

паменшыць зарплату прапарцыянальна скарочанаму працоўнаму дню. Не верылася тады, што вызвалены ад працы па малалецтву хлопчык ці дзяўчынка атрымае ад дзяржавы тыя самыя харчовыя і прамтаварныя карткі, ды яшчэ грашовую дапамогу, каб іх выкупіць ды магчы вучыцца. Баяліся ўгнявіць гаспадароў, а тыя нацкоўвалі на кантралёраў сваіх падручных. На двары кашмавальнай фабрыкі паслугачы паднільнавалі Іду Сегаль і ў сіберны мароз аблілі вадой са шланга. Добра, што рабочыя-дзяўчаты заступіліся за актывістку, не збаяліся помсты — забралі ў цэх, далі сухое адзенне, апекаваліся, покуль не сагрэлася і не абсохла.

Сама прыналежнасць да камсамола была ў тыя часы актам грамадзянскай смеласці, бо стары свет помсціў, пагражаў. Абавязкам камсамольца было ісці супраць пагроз, падстаўляць грудзі, адольваць супраціўленне. Адна дзяўчына з інтэлігенцкай сям'і паведаміла ў рэдакцыю газеты «Авангард», што ўступае ў камсамол, каб набыць веды і дапамагаць Савецкай рэспубліцы, якой не хапае рабочых рук, каб ліквідаваць разруху ў гаспадарцы, не хапае рук ахвярных, міласэрных, каб змагацца з сыпным тыфам, даглядаць у шпіталях параненых і хворых. Небяспечна было дзяўчатам, якія бралі шэфства над хворымі тыфам. Часта гэтых хворых яны падбіралі непрытомнымі проста на вуліцы, неслі ў шпіталь, а потым штодня наведвалі, даглядалі, даставалі сёе-тое ядомае, прыносілі кнігі, а па выздараўленні шукалі для сваіх падапечных працы. З працай у Арзамасе было цяжка, вытворчасць ва ўмовах ваеннага становішча згортвалася.

Сама агітацыя за камсамол была небяспечнай, патрабавала смеласці, унутранай незалежнасці. Камсамольцы агітавалі за сваю арганізацыю цвёрдасцю перакананняў, прыкладам. Пасля начнога патрулявання на вуліцах горада днём яны выходзілі на работу нараўне са сваімі калегамі па прафесіі, праводзілі дыспуты, ладзілі вечары, спектаклі, начныя святочныя шэсці з паходнямі. Камсамольцы вучылі пазнаваць край, арганізоўвалі экскурсіі па памятных мясцінах, святкавалі тыдні Чырвонай Арміі, Чырвонай моладзі, вербавалі добраахвотнікаў у армію. Нават удалы танец камсамолкі называлі агітацыйна «Манархія і Рэвалюцыя». Словы і справы, думкі і пачуцці — усё было падпарадкавана аднаму — сцвярджанню маральнай перавагі новага свету над старым і

сваёй камсамольскай перавагі над прыхільнікамі старога. Арзамаскія камсамолкі вышылі на сцягу сваёй арганізацыі дэвіз: «Юные, гордые, сильные, смелые — дело борцов завершим». Гэта былі не толькі словы-жаданні, а праўдзівая, без перабольшання ацэнка ўласных добрых спраў.

Камсамол станавіўся тады акумулятарам грамадскай ініцыятывы. Скутая самадзяржаўнай казёншчынай грамадскасць ціхага гарадка раптам выбухнула, як граната. А дэтанатарам была моладзь. Вялізны зарад энтузіязму, ахвярная апантанасць рабіла мажлівым немажлівае. Толя Альшэўскі быў у цэнтры гэтага віру падзей, праходзіў школу рэвалюцыйнай творчасці і сам сябе тварыў у яе рэчышчы. Арганізацыя «Дзетвара» стала эксперыментальыіай пляцоўкай выхавання падлеткаў. Яна нагадвала своеасаблівую дзіцячую рэспубліку са сваімі органамі самакіравання, камандзірамі і камісарамі. Дзеці як дзеці — гулялі. Але гульня іх была, па сутнасці, мадэліраваннем ідэальнага грамадскага ладу, за які змагаліся дарослыя. Свет дарослых сцвярджаўся і спраўджваўся ўяўленнем дзяцей. А хіба так не можна давесці, што дарослым удалося стварыць такі натуральны свет, які адпавядае здаровай натуры чалавека?

Толя Альшэўскі набываў вопыт гуртавання калектыву і кіравання ім. Спасцігаў умельства ўладкоўваць дзелавыя і асабістыя канфлікты паміж падлеткамі. Ён пазнаваў сілу дружбы, аснову сілы калектыву, І перажываў радасць удзелу ў духоўным жыцці, навучаўся карыстацца публічным словам: выступаў на сходах, рабіў даклады, пісаў першыя допісы ў камсамольскую газету «Авангард», рэдактарам якой быў зямляк і друг родам з Гродзеншчыны, таксама першы камсамолец Арзамаса — Аляксандр Пляско. Толя так уцягнуўся ў гэтае неспакойнае, клопатнае, поўнае нечаканасцей жыццё, так прывык, што іншага жыцця і не жадаў для сябе. Са спачуваннем глядзеў ён на так званых «воспитанных мальчиков» з цёплых дамоў, выцацканых маміных сыночкаў, якія цураліся іх новага неспакойнага камсамольскага свету. Толькі цераз параўнанне Толя па-сапраўднаму зразумеў, якім марным было тое снакойнае «культурнае» жыццё, адгароджанае ад свету сценамі ўтульных кватэр, шчыльнымі аканіцамі акон, моцнымі засаўкамі на варотах. Толя прывык жыць адразу жыццём дзесяткаў сваіх сяброў. Часта лавіў сябе на тым, што,

прымаючы рашэнне, як пастуніць у цяжкой сітуацыі, адразу пачынаў перабіраць у думках: а як бы пастуніў Яраслаў, як бы вырашыў Аркадзь Голікаў, а што б сказаў Павел Каляда? І гэтыя парады з нябачнымі, але роднымі на душы сябрамі дапамагалі выбраць аптымальнае рашэнне, пастунаць так, каб потым не саромецца за свой учынак.

Калі вясною 1918 года, пасля заключэння міру з немцамі, бацькі пачалі гаварыць пра вяртанне на радзіму, Толевы сябры кінуліся ўпрошваць: «Пакіньце Толю з намі...» Маці не магла адважыцца на такое рашэнне. Пераканаў знаёмы настаўнік славеснасці, які згадзіўся прыняць здольнага вучня ў сваю сям'ю, каб той мог скончыць вучылішча. Дзякуючы настаўніку за дабрату і ўвагу, маці прасіла яго і сына: «Толькі ж да канца школьнага года...»

— Сынок,— наказвала яна Толю,— не баўся тут. Скончыш — і адразу ж дамоў.

Толя абяцаў. Але шчасце тварэння новага свету ап'яніла яго. Восенню 1919 года вярнуўся з фронту Павел Каляда, які пайшоў на вайну разам з Яраславам. Бледны, слабы яшчэ пасля шпіталя, ён штодня заходзіў па старой звычцы ў клуб «Дзетвары», з'яўляўся як жывое ўвасабленне гераізму, якім трызнілі падлеткі і дзеці. Павел дапамагаў малодшым выпускаць рукапісны часопіс, а галоўнае, умеў вельмі ўдала разважыць дзіцячыя спрэчкі, памірыць звадыяшаў, устанавіць дух сяброўства і згоды. Каляда з Альшэўскім разам хадзілі ва ўездны камітэт камсамола, дзе Толя працаваў інструктарам, ён расказаў сябру пра першыя крокі камсамольскага руху ў горадзе, непамысную спробу склікаць сход у маі 1919 года, на які не з'явілася нават мінімуму ахвочых запісацца ў камсамол. На арганізацыйным сходзе першага чэрвеня Толю выбралі сакратаром бюро і штатным работнікам камсамольскай арганізацыі ў Арзамасе. Пачынальнікаў было тады толькі васьмёра, а цяпер — глядзі ты — паўсотні членаў!

Паўлу сімпатызавалі камсамолкі, употай падкормлівалі дзяўчаты параненага чырвонаармейца, соваючы ў кішэні шыняля печаныя бульбіны — найлепшы ласунак тых суровых часоў.

Дзейнасць арзамаскай камсамоліі набірала размах: нарасхват ішла газета «Авангард», адкрыўся свой клуб, у якім

чыталіся лекцыі па тэорыі марксізма і рыхтаваўся спектакль па п'есе «За рэвалюцыю, за свабоду». Камсамольцы выступілі ініцыятарамі маладзёжнага руху за правы рабочай моладзі. Актывісгтаў, якія дасягнулі прызыўнога ўзросту, накіроўвалі ў Чырвоную Армію.

Анатоля на фронт не пусцілі. Партыйныя органы прызналі яго асабліва патрэбным тут, на месцы. Толя меў рэпутацыю незаменнага важака, які ўмеў, як ніхто, заімпанаваць падлеткам, абуджаць сімпатыі да тых, хто вёў бітву за новае жыццё, за рай на зямлі. Анатолю лесціла, што партыйная арганізацыя, а не толькі члены саюза «Дзетвара», прызнае яго здольнасці. Прыгадваў сабе першыя крокі арганізацыі, калі сам ён яшчэ саромеўся даваць заданні сябрам і патрабаваць. Сам ды сам імкнуўся зрабіць усё: і цяжкое, і лёгкае, і важнае, і другараднае. Не прывык яшчэ дзяліць справы на адказныя і простыя. Было неўмагату. Цяпер ён смяяўся над тою сваёй сарамлівасцю. Ён раскладваў цяпер усе справы паводле здольнасцей і амбіцый сваіх падначаленых, даваў ім даручэнні ўпэўнена, як бы адорваючы кожнага такім заданнем, якое можа выканаць толькі той адзін. Не ўпускаў Толя выпадку, каб даць зразумець усё гэта падначаленаму. Часам, калі хацеў катораму амбітнаму хлопчыку даць не вельмі прэстыжнае заданне, дык стараўся авансам, пры сведках, публічна пахваліць умельства выканаўцы, запэўніваючы, што ніхто, нават ён сам, кіраўнік саюза, справіцца з такім заданнем так добра не зможа. І гэта дзейнічала. Да скрытых па натуры, што трымалі амбіцыю пад покрывам сціпласці, ён навучыўся ўжываць іншы метад: запрашаў на асабістую размову. Тут шэптам паведамляў, якое няўдзячнае заданне вісіць на ім як кіраўніку і ён не ведае, каму б яго даручыць. Анатоль прасіў параіць, хто з блізкіх сяброў не пагрэбаваў бы і ўзяўся дзеля гонару «Дзетвары» выканаць заданне, за якое нават ён не зможа публічна сказаць дзякуй. Размоўца, звычайна, прапаноўваў сябе.

Анатолю падабалася мець пэўны давер і аўтарытэт, гэтыя таямнічыя рэчы, што давалі яму ўладу над воляй сябрукоў і права кіраваць. Прыгадваючы кепікі Яраслава над яго амбіцыяй і сувязямі, ён цяпер адчуваў нешта накшталт рэабілітацыі; не сам жа набіўся ў важакі і не зверху назначылі — гэта ўсёй грамадзе добра і выгадна, што ён узвальвае на сябе

такую масу абавязкаў, размяркоўвае ды кантралюе іх выкананне дабіваецца спраўнай работы ўсёй арганізацыі.

Здараліся раздарожжы: яго не адпусцілі на фронт, а цяпер вось пасылаюць у Свярдлоўскі універсітэт яшчэ лепш авалодаць навукай рэвалюцыі, стаць майстрам кіравання масамі ў барацьбе. Пра фронт у яго было зманлівае ўяўленне. Ён адхіляў тое страхотлівае, што гаварылі бацькі, з-за чаго яны ўцякалі ад фронту на край свету, і прымаў другое — рамантычнае, што панавала сярод самых баявых сяброў, вучняў рэальнага вучылішча. Вайна, фронт уяўляліся як шлях да славы, неўміручасці. На такую вайну выходзілі з Арзамаса Аркадзь Голікаў і Павел Каляда. Выходзілі і вярталіся паранеными, але не спалоханымі, гатовымі да новых паходаў і новых ахвяр. Праўда, на фронт выходзіў таксама і Яраслаў, але ў яго паходы і вяртанні былі нейкія ціхія, сур'ёзныя, без лаўраў. Спакваля паднімаўся Яраслаў і па службовых ступенях, пісаў пра гэта без зухаватасці: станавіўся чырвоным камандзірам, палітработнікам, але ўсё гэта непрыкметна. І пісьмы, і расказы яго пра фронт былі кароткія, стрыманыя, як бы ён нешта ўтойваў, адчуваў нешта нядобрае. Чырвоны камандзір, камісар, ён, відаць, так і не ўмеў павышаць голасу, больш угаворваў падначаленых, чым камандаваў. Пераконваў прыкладам.

Многа загадак таіла маладое жыццё. Загадкай з загадак быў родны брат Яраслаў і яго фронт. Толя не баяўся небяспекі, не страшыўся цяжкасцей, нягод, адно, што яго крыху бянтэжыла, дык гэта мажлівасць загінуць без вестак. Ну як гэта можна: чалавек ідзе грудзьмі прыкрыць рэвалюцыю, здабыць шчасце для ўсіх, і ён раптам застаецца невядомай ахвярай. Не! Калі ўжо смерць, дык гучная! Або хоць вядомая. А то ж бывае — нават не ў часе атакі і не ў акопе, а дзе-небудзь на пероне вакзала ўпадзе чалавек ад тыфу ды і дойдзе ў шпіталі, дзе змучаны і атупелы ад працы персанал не справіцца аформіць дакументы пра смерць. Каму да таго, хто ты, абы ўсе трупы былі вывезены ноччу за горад. Абы спыніць эпідэмію. Анатоль пацепваўся ад такіх змрочных думак. Ішоў да сяброў, і ўсё забывалася. Але нейкая трывога пасялілася ў ім з таго часу, як выехалі з Арзамаса бацькі і ён астаўся адзін. Трэба было часта ўцякаць ад сваёй трывогі ў калектыў да камсамоліі, каб

падбадзёрыцца. І вось прыйшло назначэнне на вучобу ў Свярдлоўскі універсітэт. Ён прыняў гэта з гонарам і палёгкай. Нарэшце чалавек зрушыўся з месца, а то ўжо смяяліся, што Альшэўскі прырос да «Дзетвары». Сябры то адзін, то другі некуды выязджалі па важных заданнях: Голікаў, Каляда і Яраслаў — у армію. Саша Пляско — на флот. Усе абганялі яго. Не належыць у такі час закісаць ды станавіцца вечным работнікам мясцовых маштабаў. Рэвалюцыя ж набывае сусветныя маштабы!

Накіраванне ў Свярдлоўскі універсітэт абяцала сустрэчу з любімай настаўніцай Марыяй Валяр'янаўнай Гопіус. Анатоль з затоенай радасцю чакаў, як яна яго прыме, як ацэніць работу «Дзетвары», бо яго апякун, настаўнік літаратуры па сваёй інтэлігенцкай мяккацеласці не ўсё ўхваляў з таго, што яны, камсамольцы, рабілі. Анатоль вітаў перамену месца і як спосаб адрэзаць сябе ад таварыства і таварысцкіх абавязкаў, якія часам станавіліся золкімі.

14 чэрвеня 1919 года Арзамаская партыйная арганізацыя прыняла пятнаццацігадовага Анатоля Альшэўскага ў рады РКП(б), а ў пачатку 1920 года накіравала на вучобу ў Маскву. Там слухач Альшэўскі прабыў шэсць месяцаў і... зноў новае адказнае баявое заданне.

## ПАМЯТНЫ 1920

У знаёмым нам ужо доме ў Бярозе, на вуліцы, якая цяпер носіць імя Альшэўскага, жыве яго сястра — Зоя Адамаўна ды яе жанаты сын з сям'ёю. Але нябачна жывуць тут ва ўтульных пакоях сярод кветак і вышывак на фотаздымках яшчэ два чалавекі: Яраслаў і Анатоль — радасць і смутак сям'і, гонар старога дома, чый драўляны фасад сціпла здобіць мемарыяльная дошка, як медаль на грудзях ветэрана. Браты-рэвалюцыянеры перадалі непрыкметнай будыніне гістарычную знатнасць. Яны запоўнілі сваімі справамі і думамі пакоі, яны назаўжды прапісаліся і жывуць ва ўспамінах Зоі Адамаўны, успамінах сардэчных і паэтычных, якія можна сустрэць толькі ў людзей, гато выраслі ў цяпле дружных і моцных сем'яў.

Вось яна, шаноўная гаспадыня, захаваўшая нейкі хвалюючы спакой у манерах — пэўную адзнаку ўласнай

годнасці,— садзіцца ля стала. Засяроджана-спакойны твар яе ажывае, на шчокі прабіваецца хваляванне, калі памяць вяртае сівую жанчыну ў дзяцінства. Чым старэйшы чалавек, тым бліжэйшая краіна дзяцінства.

— Памятаю, у дваццатым годзе летнім днём — гарачы быў дзень, сонечны — гулялі мы з дзяўчаткамі на вуліцы ў Бярозе тут, і раптам — Чырвоная конніца! У горадзе ўсё закіпела. Народ, хто як — на плошчу! Прывітанні, песні. А я прыглядаюся да коннікаў-чырвонаармейцаў. Шукаю вачамі нашага Славу. Ён жа ў Чырвонай Арміі. Углядаюся-ўглядаюся, хоць і мала надзеі сустрэць: армія ж вялізная… І раптам, вачам сваім не веру, як бы знаёмы. Камандзір, сухашчавы, з вусікамі і бакенбардамі, у скураной куртцы, прымятай скураной фуражцы — на аколышы зорачка — едзе на кані ля палкавога сцяга. Паглядзеў проста на мяне. І я пазнала яго.

– Слава! — крычу.— Наш Слава! А ён кіўнуў галавою, усміхнуўся:

– Зоя, скажы маме і тату, што вечарам заеду.

І праўда, полк іхні спыніўся за мястэчкам, а Яраслаў прыехаў. Колькі было радасці! І трывожна было. Гаварыў Яраслаў, што быў камісарам палка, а потым у палітаддзеле дывізіі. Але дывізія мела многа страт, камандзіраў не хапала, і яму даручылі камандаваць батальёнам пяхоты. І адначасна быў ён старшынёю бюро калектыву палка. Паранілі яго вясной на Бярэзіне, пад Аляксандраўкай, у нагу. А скураная куртка і шапка — то ўзнагарода яго. Тады ўзнагароджвалі скураным адзеннем. Начаваў Слава дома. Гэта была яго апошняя ноч дома… Назаўтра полк пайшоў на Варшаву…

А пра Толю мы нічога не ведалі, як застаўся ў Арзамасе. Ажно прыйшоў і ён над восень, таксама нечакана. Худы быў, бледны, але, як заўсёды, вясёлы. Гаварыў, што ў Свярдлоўскім універсітэце ўсе тады недаядалі: жменька вотруб'я або макухі ды бульбіна — увесь паёк на цэлы дзень, але такі ўздым быў, такое ўзбуджэнне, што забывалі пра голад. Толя быў захварэў, дызентэрыю перанёс. Таварышы адхадзілі, дапамаглі акрыяць. І тады яшчэ ён быў такі мізэрны, шчокі бледныя, аж прасвечваюцца, а душа проста гарыць! Увесь свеціцца! Дзяўчаты і хлопцы за ім проста цугам!.. А ён усё пра рэвалюцыю, пра Саветы ды камсамол… Толю прыслалі

камсамол арганізоўваць у Пружанскім павеце. І шмат у нас камсамольцаў стала за некалькі тыдняў. Цікава ўсё гэта было для моладзі…

Слухаю ўзрушаны голас Зоі Адамаўны, і здаецца бачу жывога Анатоля, адчуваю, як свеціць гэтая паходня, запаленая рэвалюцыяй, у нашым краі. Проста з аўдыторыі камвуза ўвайшоў Анатоль Альшэўскі ў гушчу растрывожаных вайною, спакутаваных бежанствам, ахопленых марамі пра новае жыццё хлопцаў і дзяўчат Пружаншчыны. Што ўразіла Анатоля Альшэўскага на радзіме, дык перамена ў людзях, якую прынесла рэвалюцыя сюды, на землі, акупіраваныя кайзераўскімі войскамі. Хоць выехаў, эвакуіраваўся адсюль з набліжэннем фронту самы актыўны пласт насельніцтва.

На сямейных размовах там, у далёкім Арзамасе, калі гаворка заходзіла пра вяртанне, родны край уяўляўся і прыгадваўся такім, якім яго пакінулі: ціхім, спакойным Палессем. І такім ён вабіў бацькоў, што знебыліся на чужыне па сваім куце, па знаёмых людзях і звычных норавах, наіўных паляшуцкіх прымаўках. «О, паляшук! — любіў жартам гаварыць бацька.— Ты яго пусці ў лес, адно «козіка» ў руку дай, а вось босым на ліпку залезе, а злезе абутым — у лапцях. На ўсе рукі здатны, ён табе і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц».

Як толькі газеты ў пачатку снежня 1917 года прынеслі вестку, што ў Брэсце падпісана перамір'е паміж немцамі і Савецкаю Расіяй, бежанцы загаварылі пра вяртанне як пра чаканую і вось нарэшце мажлівую рэч. Але перамір'е гэта толькі часовы перапынак на вайне, а не канец, не мір. Бацька сачыў па газетах за ходам перагавораў у Брэсце, чакаў і горка ўздыхаў, калі перагаворы сарваліся, а немцы пайшлі ў наступленне і захапілі амаль усю Беларусь. Здавалася, канца не будзе гэтай вайне. Аднак жа трэцяга сакавіка прыляцела вестка: Брэсцкі мір падпісан! Бацькі радаваліся. І ўсе бежанцы, хто быў родам з Беларусі, ажылі душою. Загаманілі пра вяртанне. У гасцях добра, а дома лепш. Дома й салома ядома — пасыпаліся ў зямляцтве родныя прымаўкі. Каму не пажадаецца перажыць грозныя гады і крутыя перамены, якія несла рэвалюцыя, там, дома.

У Арзамасе, аказалася, не ўсе былі рады міру. Меншавікі і эсэры паднімалі замятню, абвінавачвалі

бальшавікоў у нястачы патрыятызму, нават у свядомым продажы Расіі немцам. Анатоль памятаў, як ён, жыхар Брэстчыны, станавіўся нібы асабіста вінаватым за Брэсцкі мір: так дзейнічала атмасфера істэрычных воклікаў, нагавораў. З палёгкаю пачуў нарэшце ў бальшавіцкім клубе Марыі Валяр'янаўны Гопіус ды горда паўтарыў словы Леніна, што Брэсцкі мір — самы цяжкі, зверскі ганебны мір!.. Аднак жа падпісаць яго трэба было. Ён карысны, бо дае перадышку маладой рэспубліцы Саветаў і паглыбляе раскол паміж імперыялістамі. Той, хто падпісаў з намі мір, тым самым ужо прызнаў Савецкую ўладу... Вось як яно выходзіць! Тонам першага вучня ў класе растлумачваў Толя тонкасці палітыкі бацьку, хоць той згодзен быў на любы мір па чыста чалавечых меркаваннях. «Лепш кепскі мір, чым добрая вайна»,— паўтараў бацька адвечную народную мудрасць. Потым пайшло нешта такое, што цяжка ўявіць: братанне салдат на фронце, выбух рэвалюцыі ў Германіі! Брэсцкі мір ануліраваны, Чырвоная Армія ў Мінску, Пінску, Целяханах. Ды раптам зноў: адкуль ні вазьміся — белапалякі, Пілсудскі. Што за д'ябальшчына!..

Толькі ў Маскве, ва універсітэце, Толя толкам уразумеў, адкуль узялася такая ўзброеная сіла ў польскай буржуазнай дзяржаве. Ён, праўда, чуў і раней, што царскія афіцэры польскага паходжання кінуліся пры Керанскім утвараць нацыянальныя фарміраванні з палякаў, салдат былой царскай арміі, ведаў, што і на захадзе, на баку Аўстра-Венгрыі ў апошняй фазе імперыялістычнай вайны ваявалі польскія часці, але не думаў, што гэтых войск набярэцца ажно так многа і што яны стануць запорай, якая возьмецца стрымліваць рух рэвалюцыі ў Заходнюю Еўропу. Даведаўся Анатоль пра інтрыгі і змовы імперыялістаў супраць рэвалюцыі, пра ваенную падмогу дзяржаў Антанты польскім нацыяналістычным палітыкам, дзякуючы якой тыя хутка акрэплі і пачалі выцясняць гарнізоны Чырвонай Арміі з Пінска, Баранавіч, Лунінца, а неўзабаве занялі Мінск, дайшлі да Барысава, сталі на Бярэзіне.

Цяпер, вярнуўшыся ў родныя мясціны, Анатоль убачыў яшчэ адзін бок гэтай карціны. Пра гэта пісалі савецкія газеты, але скупа, схематычна — супраціўленне беларускага насельніцтва акупантам, дзейнасць падпольных камуністычных арганізацый па разгортванню ўсенароднай барацьбы супраць захопнікаў. Мясцовыя камуністы цікава расказвалі пра

партызанскую вайну. Анатоль знаёміўся з героямі гэтага руху. У гарадах і мястэчках Брэстчыны, як толькі вызваляла іх Чырвоная Армія, выходзілі з падполля арганізацыі Кампартыі Беларусі і Літвы, бралі ўладу ў свае рукі. Кіраўнікі падполля і партызаны станавіліся арганізатарамі органаў Савецкай улады. У Брэсце падполле ўзначальваў бальшавік Якаў Быкін, які прайшоў суды і ссылкі, быў у эміграцыі ў Швейцарыі, слухаў выступленні Леніна. Пасля вызвалення Брэста Быкін вызваў з лесу створаны ў свой час рэўкомам партызанскі атрад і даручыў яму ахову рэвалюцыйнага ладу і парадку ў горадзе, зрабіў часовай выканаўчай сілай Савецкай улады. Падобна было і ў Пружанах. Актывісты бальшавіцкага падполля адразу пасля прыходу Чырвонай Арміі ўвайшлі ў рэўком, створаны камандаваннем 8-й дывізіі, якая вызваляла горад. Кіраўніцтва рэўкома складала маленькі інтэрнацыянал: старшынёю яго стаў беларус, мясцовы камуніст, нядаўні камандзір атрада чырвоных партызан — Рыгор Засім, а членамі — былы работнік Любярэцкага завода з Масквы А. Грыневіч і два пружанскія маладыя камуністы А. Ханькоўскі і М. Кажабродскі. Анатоль з прыемнасцю адчуў, якімі падобнымі па поглядах і звычках былі гэтыя людзі да тых, з кім яму даводзілася працаваць у Арзамасе, потым вучыцца ў Маскве. Адразу чалавек апынаўся як сярод добрых знаёмых, яго разумелі з паўслова. А людзі ж былі зусім, здавалася б, розныя. Здаравіла Засім з квадратным загарэлым тварам — тыповы паляшук, знешне марудлівы ды востры, крытычны, насцярожаны, усё рабіў па-сялянску, спакваля, памалу ды надзейна. Ставячы задачу падначаленым, растлумачваў, паўтараўся, хадзіў вакол галоўнай думкі, як той конь у прывадзе — покуль не заўважаў па твару субяседніка, што той ужо зразумеў і пачынае нудзіцца ці нервавацца. Грыневіч, наадварот, меў быструю рэакцыю і гарадскую абыходлівасць у размовах і зносінах. А камсамольскі ўездны важак Абрам Ханькоўскі, непасрэдны Анатолеў начальнік, быў рухавы і гаваркі, як вятрак. Відаць, адчуваў у Анатолю саперніка, стараўся, падцягваўся. Анатоль улавіў сваю перавагу ў вопыце работы, але разумеў, што ўсе тут робяць агульную справу, ды ён жа, зрэшты, прыехаў у канцы верасня, калі апарат уезднага камітэта камсамола быў укамплектаваны. У дадатак Абрам Ханькоўскі ведаў мясцовыя ўмовы, меў добрыя знаёмствы сярод моладзі ў Пружанах і навакольных мястэчках.

Альшэўскаму дасталася вакансія інструктара. Камсамольскую работу ў легальных умовах ён кеміў тут лепш за ўсіх, асабліва арганізацыйны яе бок. Арзамаская школа прыдавалася. З моладдзю і ў мястэчках, і ў вёсках Анатоль хутка знаходзіў кантакты, падкупляў хлопцаў веданнем бягучай палітыкі, свабодным валоданнем арганізацыйнымі правіламі дзейнасці камсамола, а дзяўчат — упэўненасцю, гарадскімі манерамі ды ўмельствам ладзіць таварыскія сустрэчы, падзадорваць на выкананне цяжкіх заданняў, вербаваць цікавых маладых людзей у камсамол. Анатолю падабалася і напружанасць, і шпаркі рытм работы, і трывожная прыўзнятасць, і небяспека выездаў у глыбінку, дзе паношыліся затоеныя ворагі Савецкай улады, нават разгульвалі бандыты. Неяк не было боязна хадзіць і ездзіць начамі ў глухія куткі на заданні: упэўненасці надавала баявая мясцовая моладзь. Як змяніліся гэтыя людзі! Скрозь, нават у глухіх вёсках, павыраслі юныя энтузіясты новага жыцця. Яны жадалі свабоды, роўнасці, братэрства, чалавечай годнасці. На іх можна было спадзявацца, з імі было лёгка і надзейна.

Дома зніклі Анатолевы колішнія трывогі. Нават Зоі не прызнаўся пра свой былы страх перад смерцю, боязь стаць чалавекам без вестак прапаўшым. Калі ж ехаў на вучобу, дык не тое што страх, а нейкая неадольная, як у пачварным сне, гідлівасць падкочвалася і трымала яго за нутро. У цягніках і на рачных прыстанях, на вакзалах, у цяплушках, забітых бежанцамі і мяшочнікамі, бяздомнымі галоднымі абшарпанцамі, развозілася страшная эпідэмія. Хворы незнаёмец выклікаў у яго пачуццё літасці, змешанае са страхам, як у дзяцінстве калекі-жабракі, якіх маці па дабраце сардэчнай дарыла краюхамі хлеба і кавалачкамі сала ці драбкамі цукру, але і абавязкова карміла на кухні гарачаю стравай. Толя памятаў, як з цікаўнасцю і затоеным страхам падглядаў праз шчыліну з другога пакоя, як яны сквапна ядуць, а потым слухаў, як з удзячнасці богу і гаспадыні заводзілі на лерах жаласныя жабрацкія песні. Яму чулася ў гэтых цягучых мелодыях безвыходная пакора і страх перад светам, поўным небяспекі, жорсткасці і крыўды. Асабліва страшыла Толю доўгая тужлівая гісторыя беднага Лазара, якога крыўдзіў і мучыў родны брат. Падросшы, Анатоль перастаў страшыцца дзядоў, рады быў, што даганяў Яраслава, які ніколі

не баяўся вандроўных калек. У Арзамасе жабракі былі на пачэсным становішчы. У святочныя дні важна сядзелі перад цэрквамі на паперцях. Некаторыя былі зусім прыстойна апранутыя і выклікалі не літасць, а бянтэжылі самаўпэўненасцю: працягвалі руку як бы па належнае: бог кажа дзяліцца з бліжнім, ану дзяліся, раб божы, калі не хочаш у пекле смалу хлябтаць!..

Замест дзёрзкіх жабракоў у гады разрухі з'явіліся ахвяры вайны, беспрытульныя выгнаннікі і валацугі, што валэндалі з канца ў канец матухны Расіі, шукаючы блізкіх, родных ці проста ўцякалі ад ваенных законаў, дызерціравалі. Уцякалі ад смерці і самі ж разносілі тыфозную смерць.

Адразу пасля прыезду ў Маскву, яшчэ не асвойтаўшыся з універсітэтам, Анатоль захварэў на жывот. Нават не сумняваўся, што гэта тыф, у шпіталі выявілася — дызентэрыя, але лячыўся ўсё роўна ў заразным аддзяленні побач з тыфознымі. Чаго толькі не нагледзеўся тады! Чаго не наслухаўся!.. Яшчэ і не паспеў зжыцца з калегамі па Свярдлоўскім універсітэце, не займеў сярод іх сяброў. Тым большай была яго радасць і ўдзячнасць за клопат і апеку. Яго наведвалі ў шпіталі дзяўчаты і хлопцы такія ж зычлівыя, як сябры з Арзамаса. Калі пачаў крыху папраўляцца, перадавалі ежу, аднятую ад сваіх мізэрных харчовых пайкоў. Толя расчульваўся і, аслабелы ад хваробы, употай пускаў слязіну. Дзякаваў лёсу за тое, што далучыў яго да новых людзей, да камуністычнай сябрыны. Ідэйная роднасць збаўляла ад адзіноты і загубленасці ў бясконца вялікім, пагрозлівым, як крыгаход, свеце. Усё, што адбывалася ў Расіі на вачах і пра што Анатоль чуў і чытаў у газетах, дэкрэтах, асацыіравалася ў яго з крыгаходам. Аднойчы давялося ўбачыць такі грандыёзны крыгаход на Волзе, калі ездзіў у Ніжні на камсамольскую нараду. Відовішча было такое, што не хапала слоў, каб расказаць. Ніхто не паверыць, што стыхія прыроды можа так узрушваць, здзіўляць да знямення. Грознай і велічнай была тады Волга. Яна нагадвала нейкага вялізнага дапатопнага цмока, што сунуў рэчышчам уніз, скідаючы з сябе ўжо зацесную для яго скуру. Крыгі былі луской, што аблятала з шумам і трэскам, утвараючы цэлыя горы зеленавата-белай крохкай шугі, з якой нечакана вытыркаўся высока ўгору востры кант вялізнае крыгі. І стаяў абломак, як абеліск над

магільнікам незлічоных ільдзінак, якія змагліся ўжо і бяссільна сплывалі ў іншабыццё.

Праехаўшы ўздоўж палову Расіі, пажыўшы ў Маскве, Анатоль меў жывое панарамнае ўяўленне аб рэвалюцыі. Ужо асабісты вопыт рабіў яго цікавым для тутэйшай моладзі. Яго расказам верылі, яго слухалі з затоеным дыханнем, бо нават пра вядомыя падзеі ён расказваў, як пра свае ўражанні, старонкі жыцця. Анатоль хутка абрастаў сябрамі і знаёмымі, укараняўся ў масу, набіраўся ўпэўненасці, мог дзейнічаць. Ён з прыемнасцю аднаўляў знаёмыя з дзяцінства словы і трапныя выразы мясцовай паляшуцкай гаворкі, знарок ужываў іх у гутарцы з мясцовымі актывістамі і з прыемнасцю адчуваў, як гэтыя, здавалася б, дробязі раднілі.

У Пружанах Альшэўскага чакаў сюрпрыз. На пасадзе павятовага ваенкома ён застаў Паўла Горына-Каляду. Як заўсёды стрыманы, крыху сарамлівы ад гэтай пасады, выдзеленай яму рэвалюцыяй на падрост, ён інфармаваў Толю пра арзамаскія справы. Зімою 1920 года яго выбралі там старшынёю Арзамаскага павятовага камітэта партыі, але вайна прывяла на радзіму. Каляда расказаў пра чарговае раненне Аркадзя Голікава і пра вылучэнне мужнага шаснаццацігадовага падлетка на пасаду камандзіра палка.

Пружанскі ваенкамат спраўна праводзіў прызыў добраахвотнікаў у Чырвоную Армію, наладзіць гэтую адказную работу дапамагалі камсамольцы. Даводзілася займацца не толькі агітацыяй і арганізацыяй новых ячэек. Рэўком, ваенкамат і павятовы камітэт камсамола мелі агульнае баявое заданне — забяспечваць часці наступаючай арміі прадуктамі, цяплом, адзеннем. Усё гэта адбывалася метадамі, уласцівымі таму часу, які ўвайшоў у гісторыю як перыяд ваеннага камунізма. Суровая і небяспечная работа згуртавала і парадніла актывістаў Савецкай улады.

Толькі 54 дні на гэты раз утрымалася Савецкая ўлада на Пружаншчыне. Але яе актывісты ведалі, што светач свабоды, які запалілі яны, не можа згаснуць. Знічкамі-іскрынкамі спадзе на вёскі і мястэчкі агнявая легенда, Праметэеў агонь распаліць сэрцы, асвеціць шлях у будучыню.

Адбіваючыся ад белапалякаў, адыходзілі ў слотную восень змардаваныя баямі і паходамі чырвоныя палкі.

Пакутлівая трывога ахапіла край. З-за Буга сунулася жорсткая помслівая сіла, і яе нельга было ні спыніць, ні стрымаць…

Нават цяпер, хоць прайшло з таго часу амаль паўвека, лагодны твар Зоі Адамаўны Альшэўскай хмурыцца, кладуцца рыскі наміж брывамі. Яна прыгадвае:

— Першы з'явіўся Ярослаў. Галава перавязана. Ля Беластока, пры адыходзе, яго зноў параніла. Цяжкая рана... Яшчэ й кантузія. І трэба адыходзіць. Чым бы дапамагчы яму? Дома — пусткі, нядаўна ж самі вярнуліся і жылі больш з ласкі суседзяў ды знаёмых. Мама ну проста ў адчаі. Тады я кажу: «Слава, я вам яблыкаў нарву на дарогу. Нашы смачныя яблыкі». І нарвала яму сумку яблыкаў. З гэтым і паехаў. На развітанне параіў тату пахаваць усё, чым маглі б зацікавіцца польскія ўлады. А Толя збег ужо ну проста ў апошнія хвіліны. Перад самым прыходам польскіх салдат: На ўскраіне Бярозы страляніна была, а ён з катомкай цераз плячо падаўся на агароды… Мы ўсе страшна перажывалі: хоць бы не злавілі яго, хоць бы ўдалося яму выратавацца.

## ВЕСТКІ З ВЫРАЮ

Анатоль і яго сябры пільна сачылі за падзеямі на захадзе, куды пераможна пайшло наступленне Чырвонай Арміі. У Пружанскім рэўкоме радаваліся вызваленню Брэста, Беластока. Узрушана абмяркоўвалі ўтварэнне ў Беластоку часовага ўрада сацыялістычнай Польшчы, набліжэнне нерадавых часцей да Варшавы, нрадказвалі, як завершыцца грандыёзны паход.

Яны бачылі ўжо чырвоны сцяг над сталіцаю сацыялістычнай Польшчы, і поступ агню Праметэя па Заходняй Еўропе — да Ламанша і за Ламаншам — па ўсёй планеце…

І раптам — нечаканае. Не хацелася верыць, усе рэўкомаўцы нібы згаварыліся быць стрыманымі ў гутарках пра адступленне, пераконваць, што гэта толькі тактычныя хады і перагасоўкі, пасля якіх — ізноў наперад і да перамогі. Зрэшты, і звесткі былі глухія, супярэчлівыя. Анатоль забягаў колькі разоў да Паўла Каляды ў ваенкамат, але і там яснай інфармацыі не было, урыўкавыя звесткі мітусліва пярэчылі адна адной.

Анатоль не любіў нават думкай увязвацца ў здарэнні, на ход якіх няма сілы паўплываць, прывучаў сябе выкідваць усё немагчымае з галавы, і рабіў сваю справу. Цяпер ён стараўся пагрузіцца ў камсамольскую работу, выязджаў у глыбінку павета. Дваццаць пятага жніўня дайшлі чуткі, што здадзены Брэст. Анатоль памкнуўся ў Бярозу, на галоўны шлях Варшава — Масква, каб упэўніцца, пабачыць сваімі вачыма тое, у што так упарта не хацелася верыць. І вось убачыў. Сам ледзь не аказаўся палоненым.

У гарачцы і суматосе адступлення Анатоль спярша спрабаваў далучыцца да сваіх таварышаў з Пружан, аднак неўзабаве зразумеў, што гэта нязбыўная надзея: знайсці невялічкую групку людзей, перад якою было сто дарог — трэба верыць у цуды. А ў той час зарэгістраваны быў толькі адзін цуд — цудам над Віслай аклічуць польскія ксяндзы контрудар 16 жніўня 1920 г. пад Варшавай, пасля якога Чырвоная Армія пачала адыход. Спасылка на божую волю і апеку будзе выгадна не толькі духоўнікам, але і палітыкам, бо прыкрые тайнаю справы зямныя: вайсковую падмогу Антанты — дзейнасць англа-французскай групы вайсковых дарадчыкаў на чале з генералам Вейганам, французскія танкі і экіпунак. Усё было прывазное ў арганізатараў контрудару, акрамя класавай нянавісці да «бязбожных бальшавікоў». Але нават варожасць да рэвалюцыі маскіравалася патрыятычным плашчом, пашытым з рамантычных міфаў. Пра фокусы ідэалагічнай прапаганды праціўніка Анатоль быў наслуханы. Мясцовыя камсамольцы расказвалі, як да прыходу Чырвонай Арміі абшарнікі ды ксяндзы палохалі насельніцтва жахлівымі выдумкамі пра бальшавікоў. Выдумлялі, што з усходу ідуць слугі д'ябла, а сама рэвалюцыя — д'ябальская справа. Д'ябал падвучвае цёмных людзей руйнаваць парадак, заведзены богам.

Паматаўшыся па дарогах, недзе пад Мінскам Анатоль пераарыентаваўся, змяніў план — узяў курс на адшуканне Яраслава, які служыў у 17-й дывізіі. Пра дывізію лягчэй было даведацца на шляхах адступлення, чым пра павятовы рэўком. Анатолю дапамаглі адшукаць брата. Відаць, па рэкамендацыі Яраслава ён быў залічаны камсамольскім работнікам у палітаддзел. З горкай іроніяй прыгадваў ён Арзамас, калі рабіў пратэкцыю брату. Ці ж бы жыццё сапраўды ставіць усё на свае месцы? Не верылася. Быў час свабоднай гульні выпадковасцей.

У такі няпэўны час трымацца ўдвух не толькі бяспечней, надзейней, а проста радасней.

Праўда, радасць адчування побач роднага чалавека была нядоўгай. Яраслава адклікалі з палітаддзела і рыхтавалі да работы ў савецка-польскай раздзяляльнай камісіі на выпадак, калі б паспяхова пайшлі перагаворы з праціўнікам аб міры.

Адступленне восенню змянілася стабільнаю абаронай. Армія была вымучана баямі, хоць у цэлым становішча было весялейшым, як год назад, калі палякі дайшлі да Бярэзіны і Дзвіны, а Дзянікін заняў Курск. Галоўнакамандуючы Чырвонай Арміяй прасіў тады яшчэ дазволу Ваенна-рэвалюцыйнага савету зняць частку войск з польскага фронту і кінуць супраць Дзянікіна. Цяпер толькі на Украіне не згасаў контррэвалюцыйны мяцеж. Хоць праціўнік выйграў бітву за Нёман, але абарона наша была ўстойлівай. Ды і ў праціўніка сілы выдыхаліся, Пілсудскі чакаў новых падмацаванняў з Захаду. У пачатку верасня Галоўная стаўка польскіх войск афіцыйна выдала загад спыніць наступальныя дзеянні і перайсці ў абарону.

Яраслаў, рыхтуючыся да работы ў раздзяляльнай камісіі, азнаёміўся з цікавымі фактамі палітычнай барацьбы праціўніка. Між іншым, здзівіла яго, што Пілсудскі, ненавідзячы бальшавікоў смяротнай нянавісцю, баяўся не так іх, як белагвардзейцаў, бо Дзянікін і Урангель не думалі прызнаваць права палякаў на незалежнасць, Белагвардзейскія генералы снілі тыя ж сны, што і польскі маршал, толькі наадварот: сны пра адзіную і непадзельную царскую імперыю, для якой польская незалежнасць — прыватная справа. Анатолю, пры сустрэчах з братам, было цікава пазнаваць таямніцы вялікай палітыкі.

Савецкі ўрад увесь час адкрыта заяўляў пра сваю гатоўнасць да мірных перагавораў.

Пілсудскі ж год назад ставіў такія вымаганні, якіх прыняць было немагчыма нават пры тых умовах, што савецкі бок даваў сваю згоду весці перагаворы, нават уключаючы пытанні, якія датычыліся дзяржаўных граніц.

Нягледзячы на ўступчывасць, дагаварыцца з Пілсудскім аб міры не ўдавалася. Ён быў ва ўладзе палітыкі Захаду. Упаўнаважаны савецкага ўрада для перагавораў у 1919 годзе, вядомы публіцыст і дзеяч польскага рабочага руху Юльян

Мархлеўскі, ад'язджаў з перагавораў моцна засмучаны. Ён меў паўнамоцтвы весці шырокія перагаворы з кіраўніцтвам польскай дэлегацыі аб міры і вырашэнні ўсіх спрэчных пытанняў. Аднак палякі не ішлі на перагаворы аб міры і не давалі згоды на абмеркаванне іншых неадкладных пытанняў, нават аб магчымасці іх вырашэння шляхам плебісцыту. Усе намаганні Юльяна Мархлеўскага дабіцца ўсіх дагаворанасцей з польскім бокам наконт найважнейшага пытання — аб міры — закончыліся беспаспяхова. Дагаварыліся толькі пра абмен ваеннапалоннымі і пакаранне віноўных у расстрэле дэлегацыі Савецкага Чырвонага Крыжа ля пагранічнай станцыі Лапы.

Абмяркоўваць іншыя важныя пытанні, у тым ліку вырашэнне іх плебісцытам, палякі адмаўляліся. Плебісцыт страціў сваю папулярнасць у польскай свядомасці з таго моманту, як на Слёнску прадбачлівыя немцы падкінулі на час плебісцыту некалькі тысяч сваіх супляменнікаў, якія тут адно нарадзіліся, а не жылі. Такім чынам палякі прайгралі плебісцыт і адразу ўзяліся за зброю. Праблему граніц вырашыла слёнскае паўстанне.

Пілсудскаму было выгадна балансіраваць паміж мірам і вайной. Даючы інструкцыі кіраўніку польскай дэлегацыі, як працягваць перагаворы з упаўнаважаным савецкага ўрада Юльянам Мархлеўскім у Мікашэвічах, Пілсудскі пыхліва патрабаваў пагражаць ненавісным яму бальшавікам сілай.

Пілсудскі хацеў заняволіць літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў пад шырмай стварэння «федэрацыі», у межах шляхецкай Рэчы Паспалітай. Гэта былі захады палітыка, якога ў Заходняй Еўропе празвалі дыктатарам пераждыткаў. Зрэшты, не аднаму Пілсудскаму сніліся тады ў Польшчы імперскія сны. Былі ў яго сапернікі, якія нават папракалі дыктатара за памяркоўнасць у адносінах да ўскраін. Нацыяналістычныя элементы на чале з князем Яўстахіем Сапегай спрабавалі ўчыніць кабінетны пераварот, а лідэр нацыянал-дэмакратаў Раман Дмоўскі, прэтэндэнт на месца Пілсудскага, седзячы ў Парыжы, спакушаў тузоў Антанты пражэктамі ўтварэння такой Польшчы, якая паглыне беларускі і ўкраінскі этнічны элемент, стане магутнасцю, будзе лепш ахоўваць Захад ад рэвалюцыі, чым «федэрацыя» Пілсудскага. У цяжкія моманты для Савецкай улады рэакцыянеры цягнулі з Польшчы рукі на

Усход, ажно да Кіеўскай і Полацкай Сафіек, да муроў і вежаў Смаленска.

Праўда, прагрэсіўныя польскія дзеячы, выказваючы інтарэсы працоўных, глядзелі на праблему адраджэння дзяржавы інакш: прызнавалі за ўсімі народамі права ствараць уласныя незалежныя дзяржавы, падтрымлівалі ленінскую ідэю самавызначэння народаў. Паводле гэтай ідэі, справядлівая дзяржаўная граніца павінна супадаць з граніцай моўна-этнічнай, ахопліваць зону канцэнтраванага рассялення пэўнай нацыі, тую зямлю, на якой людзі гэтай нацыі складаюць большасць. Такая вось граніца паміж палякамі і беларусамі была тэарэтычна вызначана ў працах вучоных-этнографаў і моваведаў. Яна ішла па Бугу. Адзін англійскі палітык прапанаваў зрабіць этнічны рубеж асновай граніцы дзяржаўнай. Але пройдзе шмат часу, покуль «лінія Керзана» стане ўзаемна прызнанай справядлівай дзяржаўнай граніцай. Да гэтага Польшча павінна будзе прыйсці шляхам сацыялістычнага абнаўлення нацыянальнай свядомасці. На пачатку 20-х гадоў польская нацыя была буржуазнай і падатлівай на патрыятычныя міфы пра былую веліч.

Пілсудскі быў увасабленнем гэтых міфаў. Сам па паходжанню шляхціц з Віленшчыны, ён прагнуў любым спосабам далучыць свой родны куток да польскай дзяржавы, дзе ён афіцыйна называўся начальнікам.

Перагаворы паміж польскім і савецкім урадам хоць і вяліся практычна на працягу ўсёй вайны, але часта заходзілі ў тупік або зрываліся польскаю стараною. У канцы сакавіка 1920 года польскі ўрад толькі фармальна даў згоду на аднаўленне перагавораў, але іх месцам вызначыў горад Барысаў, які быў тады на лініі фронту. Цераз выбар месца сустрэчы ставілася папярэдняя ўмова: лінія фронту, якая ішла цераз Барысаў па Бярэзіне, Прыпяці і Убраці, павінна была стаць мяжою дзяржаў. Савецкі ўрад не мог прыняць такой папярэдняй умовы. Тады Пілсудскі заключыў дагавор з Пятлюрай і пайшоў у маі паходам на Кіеў. Атрымаўшы ў красавіку званне маршала і прыняўшы камандаванне фронтам, ён асабіста рашыў здзейсніць «усходнія сны» выгнаных рэвалюцыяй абшарнікаў. Часці Чырвонай Арміі неўзабаве прарвалі паўднёвы фронт і ачысцілі Украіну. У палове жніўня, калі Чырвоная Армія дасягнула Варшавы, аднавіліся перагаворы паміж ваюючымі

бакамі ў Мінску, але пасля контрудара з-пад Варшавы польскі бок зноў спыніў дыялог ажно да восені. Аднавіліся размовы толькі 21 верасня ў Рызе. 12 кастрычніка быў падпісаны дагавор аб спыненні агня, а цераз тыдзень — аб перамір'і. Да вясны 1921 года зацягваліся гэтыя перагаворы і толькі 18 сакавіка ў палацы рыцараў-чорнагалоўцаў быў падпісаны Рыжскі мір, паводле якога ўсё ж значная частка этнічнай Беларусі адыходзіла да Польшчы.

Тады і стала працаваць раздзяляльная камісія, у рабоце якой на Палессі прымаў удзел Яраслаў Адамавіч Альшэўскі.

Цяжка і горка ўступаць зямлю, дзе ты нарадзіўся і вырас, а ў Яраслава там засталіся бацькі і родныя. І трэба было трымацца дастойна ў нормах пратаколу. Яраславу Альшэўскаму, можа, і даверылі ўдзельнічаць у камісіі, бо ведалі яго як камандзіра вытрыманага, спакойна-ветлівага, поўнага разумнай самапавагі. Ніхто не даведаўся пра тое, што перажываў ён у душы, пра што думаў начамі, якія доўжыліся, як за Палярным кругам. Родная зямля! Колькі раз была яна арэнай нашэсцяў паміж суседзямі і далёкімі дзяржавамі. Яна ўсыпана татарскімі і шведскімі курганамі, магіламі напалеонаўскіх салдат і паўстанцаў шэсцьдзесят трэцяга года. Нядаўна прыбавіліся акуратныя могільнікі кайзераўскіх ваякаў і невядомыя яшчэ свежыя магілы чырвонаармейцаў, курганкі на палях бітваў і ўзбочынах дарог, бугаркі жоўтага пяску, над якімі не застаецца ўжо нават таблічак з прозвішчамі.

З болем прыгадваліся яму пахаванні баявых сяброў: у час наступлення хавалі наспех, але ўрачыста, а ў час адступлення — часта толькі закопвалі.

Вось яны, жарты зменлівага лёсу. Такі магутны паход, такі імпэт, гераізм, ахвярнасць! І вера, святая вера, што рэвалюцыя перамагае не толькі ў Польшчы, а ў Еўропе і ва ўсім свеце. Ды вось стары свет паказаў іклы. Не меў за сабою мас, але меў вопыт, тэхніку, вайсковых спецаў, знаў слабасці ахопленай энтузіязмам, але недастаткова вопытнай і дысцыплінаванай добраахвотніцкай арміі праціўніка. А не хапіла ж дробязі — надзейнага завяршальнага ўдару. У рэвалюцыйных часцей не аказалася тылавога забеспячэння, рэзерваў, амуніцыі — усяго таго, што робіць баявыя дзеянні надзейнымі. Пралетарскі авангард падтрымліваў нас. Нацыянал-патрыятычная прапаганда пілсудчыкаў паралізавала

класавую салідарнасць, зрабіла ўплыў на пэўныя слаі насельніцтва.

Думалася яму бяссонымі начамі пра бацькоў, што засталіся за мяжой, якую праводзіў ён, іхні сын. І шкадаваў, што згадзіўся начаваць у бацькавым доме тады, у часе наступлення. Уся Бяроза ведала, што адзін сын Альшэўскага камсамолец, а другі — чырвоны камандзір, ды яшчэ заслужаны. Ці не пашкодзіць усё гэта бацькам?.. Прыгадваўся Яраславу засмучаны твар Зоі, уставаў перад вачыма бацька: апушчаныя рукі, прыгорблены і такі бездапаможны пры апошнім расстанні. Клопатна думалася Яраславу і пра брата. Для прафесіі вайскоўца ён не падыходзіў, занадта быў гарачым, няўрымслівым. Вайсковая дысцыпліна, Яраслаў разумеў, не для такіх натур.

Праца ў камісіі на Палессі, дзе месцамі і не было лініі фронту, па якой належала праводзіць дзяржаўную мяжу, прыносіла шмат спрэчак, прыкрасцей. Ён быў рады заканчэнню гэтай місіі і з прыемнасцю выехаў у Разань на новае месца дыслакацыі.

Анатоль падаўся разам з братам. Удвух было лягчэй перажыць нялёгкі час разрухі. Тут адчуў Анатоль перавагу старэйшага брата. Дасведчаны палітработнік, Яраслаў зросся з Чырвонай Арміяй, быў яе часцінай, і гэта давала яму ўпэўненасць. Але заставаўся ён па-ранейшаму чулым, уважлівым і сціплым. Анатоль прыгадваў дні сваёй разгубленасці ў натоўпах, адступаўшых на Усход вайсковых і цывільных людзей. Як безнадзейна шукаў ён тады вачыма і думкамі, нават снамі, брата, шчупленькага, падцягнутага камандзіра, у скураной курткі. І ўяўляў яго, па расказах Зоі, чамусьці толькі вярхом на кані. Яраслаў выдаваўся яму тады маяком у бязмежным, узбураным людскім моры.

Пасяліўшыся з братам у Разані, Анатоль вёў работу з байцамі, якія сталі цяпер прыбываць па прызыву. Армія станавілася для многіх з іх школай, якой яны не здолелі пазнаць з-за вайны. У войску ліквідоўвалі непісьменнасць — звычайную і часта палітычную.

Яраслаў займаў пасаду намесніка начальніка палітупраўлення 17-й дывізіі. Ён замацаваў на службе і Анатоля. Палітычна адукаваныя работнікі былі патрэбны тады Чырвонай Арміі, і Анатоль прыйшоўся да месца. Яго

задавальняла служба армейскага палітработніка, была мажлівасць і самому вучыцца на курсах і семінарах. Былі ўмовы займацца і самаадукацыяй. Анатоль цягнуўся да кніг, захапляўся музыкай, паэзіяй, асабліва палюбіў Ясеніна, якога ў Разані моладзь узносіла да нябёс. Сур'ёзна думаў над сваім будучым. Яго не пакідалі пытанні: кім стаць? Да чаго ён здольны? Дзе яго месца ў жыцці?

З Разані прыходзяць у Бярозу першыя сярод уцалелых пісьмы Анатоля Альшэўскага. У іх высокія юнацкія парыванні і паміж радкоў ноткі журбы, імкненне быць карысным грамадству, стаць духоўна багатым чалавекам. І паміж радкоў — туга па родным кутку, па сям'і: «...Думаю музыку не кідаць: у мінуты горычы яна лепш за ўсё дапаможа... Не думайце, калі ласка, што я хачу стаць музыкантам. Не. Канчатковая мэта другая — інжынер. Дабіцца таго, каб сваімі рукамі прыносіць карысць іншым»[5]

Інжынер ва ўяўленні рамантычнага юнака хутчэй падобны да інжынера грамадскіх механізмаў, чым на тэхнічнага спецыяліста. Грамадская арыентацыя Альшэўскага дазваляе яму хутка расці, развіваць тую маштабнасць пачуццяў і думак, якія ўласцівы важакам і пісьменнікам-публіцыстам.

Яўна напускае аўтар на сябе аптымізму, піша так, нібыта нічога асаблівага і не здарылася, проста так трэба было, каб сям'я жыла ў Бярозе, а ён з Яраславам — у Разані. Паведамляе, што ўдала ўладкаваліся, кватаруюцца ў добрай, зычлівай гаспадыні. Можна падумаць — двое студэнтаў на прыватнай кватэры: пройдзе семестр — вернуцца сабе дахаты, як і трэба...

Але на душы ў яго было неспакойна. Там ішла напружаная работа, ішоў пошук самога сябе.

Анатоль мужае, перажываючы разам з краінай, з усім савецкім народам радасць гістарычных заваёў і смутак вялікіх страт. Пра адну з іх усхвалявана паведамляе пісьмо з Ніжняга, датаванае 1924 годам. Тут ужо выяўляецца адна з адметных рыс будучага партыйнага дзеяча і публіцыста — убіраць у сябе, па-свойму перажываць і востра ацэньваць падзеі грамадскія, гістарычныя:

---

[5] Пісьмы А. Альшэўскага да родных захоўваюцца ў яго дачкі Іны Карпюк, якая зычліва дазволіла выкарыстаць іх у гэтай працы

«І да Вас дайшла вестка пра смерць Леніна. І Вы даведаліся пра тое, што мы пахавалі нашага любімага Ільіча. Добра, што Вы напісалі мне пісьмо: у гэтыя цяжкія дні я часта думаў пра Вас, пра родных. Мне, не ведаю чаму, здавалася, што Вы таксама шчыра засмучаны гэтаю цяжкаю стратай, і мае здагадкі аказаліся слушнымі.

...Да нас, у Ніжні, гэта вестка прыйшла 22 студзеня. Я быў адзін: Яраслаў 17 студзеня паехаў на Усерасійскі з'езд Саветаў як дэлегат. Вярнуўся ён ажно 3 лютага, так што ўсе гэтыя гістарычныя дні прабыў у Маскве. Сустракаў труну, быў ля цела Леніна, калі яно знаходзілася ў Доме Саюзаў, і праводзіў яго ў апошні шлях... Многа перажыў за гэты час.

А я 22 студзеня сабраўся ісці ў тэатр. Усё было, як заўсёды. Але перад пачаткам спектакля падыходзіць да мяне адзін таварыш і кажа на вуха: «Памёр Ленін». Спачатку я не паверыў. Жудаснай здавалася гэта вестка. Аднак...

Рассунулася заслона, і замест звычайнага спектакля нам паведамілі, што 21 студзеня ў 6 гадзін 50 мінут вечара ў маёнтку Горкі пад Масквою памёр Уладзімір Ільіч Ленін. Як громам жахнула гэтая вестка па ўсёй зале. І паліліся гукі жалобнага марша. Я не мог стрымацца, я плакаў. Плакалі ўсе. Слёз у мяне даўно не было, а тут нельга было... На сцэне партрэт. Ён такі ўсмешлівы, бадзёры і... Ён — памёр!.. Нельга пераказаць усяго, што кожны перажыў у гэтыя хвіліны. Усе выйшлі на вуліцу. Сабралася некалькі тысяч народу.

Мы выстраіліся радамі, і паўз нас павольна-павольна пранеслі партрэт Ільіча, прыбраны ўжо чорным крэпам і зялёнымі галінкамі елкі. Медныя трубы рыдалі жалобным маршам. Увесь шматтысячны натоўп заціх. І быццам уся прырода засмуцілася ў гэты момант: стала ціха-ціха, толькі белыя сняжынкі павольна падалі на непакрытыя галовы...

Увесь свет пакрыўся жалобай...

Хто ж такі быў Ленін? Чаму так многа гавораць пра яго, і не толькі ў нас, а літаральна ва ўсіх кутках зямнога шара?

Ён стаіць на галаву вышэй за ўсіх славутасцей нашага часу. Ён не толькі пісаў пра рэвалюцыю, ён здзяйсняў рэвалюцыю, ён арганізаваў масы, ён стварыў партыю.

Ленін, як ніхто, умеў прыслухоўвацца да голасу народных мас, бачыў у будучыні тое, чаго не бачылі другія.

Дзеля таго ён заўжды паварочваў карабель там, дзе трэба было звярнуць, ён заўжды выводзіў нашу краіну з небяспекі.

Ленін, як ніхто, любіў рускі пародд, і для гэтага народа, не шкадуючы, аддаў сваё цудоўнае жыццё. Ленін як чалавек быў вельмі добры, сціплы, вясёлы. Ён любіў малых дзетак, з імі праводзіў вольныя хвіліны. Не любіў Ільіч усялякіх «почестей», паважаў людзей, умеў пагутарыць з мужычкамі. Вось чаму ён такі папулярны, вось чаму ўсе яго так горача любяць».

У асобе Леніна юнаку імпануе суседства героя і чалавека. Пра цудоўную сілу гэтага спалучэння гаварылі тады ўсе навокал. Але Альшэўскі прымаў цудоўны сакрэт ленінскай абаяльнасці як асабісты ўзор і прыклад для пераймання, прымаў і абдумваў у той час, калі жыццё рыхтавала яму новыя, суровыя выпрабаванні.

Вядомая рэч, прафесійныя вайскоўцы жывуць і ў мірны час на калёсах. Дывізія Яраслава перадыслацыравалася ў Ніжні Ноўгарад. У 1924 годзе браты пераехалі туды з ахвотай, успамінаючы юначыя гады, спадзеючыся аднавіць даўняе сяброўства. Хацелася вярнуцца ў бесклапотнае юнацтва. Але жыццё так ужо створана, што не любіць паўтораў. Калі і ўзнікаюць сітуацыі знешне падобныя, дык не часта, і, урэшце, яны не зусім такія, як раней. Пераезд у Ніжні Ноўгарад быццам і быў кімсьці задуманы, каб даць братам Альшэўскім адчуць, як пасталелі, як змяніліся яны і як змяніўся нядаўна такі звычны ім куток. Мала хто з сяброў-камсамольцаў Арзамаса застаўся ў родных мясцінах. Рассеяліся па ўсім неабдымным абшары краіны, несучы ў далёкія куткі жарынкі маладога задору. А некаторых ужо і нельга было далічыцца. Ахвяры рэвалюцыі. Юныя ахвяры... Трагедыйнасць юначых лёсаў суправаджае ўсе вялікія пераломы.

У Ніжнім кожны дзень прыносіў Анатолю то радасныя, то сумныя весткі пра сяброў. Скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі былы рэдактар арзамаскай газеты, хлопец з-пад Гродна, Саша Пляско, прыехаў прафесійным журналістам у Перм і працуе ў камсамольскай газеце. Расце сябар. Дачуўся Анатоль, што дарогі дружбы прывялі ў Перм на газетную работу і першага сакратара Арзамаскай камсамоліі Мікалая Кандрацьева, які паспеў павяваць у 1920 годзе на Урангелеўскім фронце. Анатоля самога нешта цягнула ў Перм,

куды, як даведаўся ён, паехаў і дэмабілізаваны пасля ранення Аркадзь Голікаў. Не ўдалося Гайдару пераканаць урачоў, што ён здольны застацца ў страі. Казалі, не можа адвыкнуць ад войска, хоць і ў цывільным адзенні ходзіць, а жыве арміяй, піша ўспаміны пра вайну, апавяданні для падлеткаў.

Павел Горын-Каляда ў Паволжа не вярнуўся, пружанскі ваенком падаўся ў навуку, штудзіруе гісторыю ў Маскве, у Камвузе. Стане чырвоным прафесарам. Цяпер патрэбна як след тлумачыць гісторыю масам, праўду пра рэвалюцыю і грамадзянскую вайну. А вучоныя старой даты не прывыклі самі лічыць рэвалюцыю лакаматывам гісторыі. Баяцца такога лакаматыва, як пужлівы конь сапраўднага.

Пра сяброў Анатолю многа цікавага расказала Іда Сегаль. Таварыская і памятлівая, яна станавілася жывым летапісам арзамаскай камсамоліі.

Кранալі Анатоля выпадковыя сустрэчы з былымі членамі дзіцячай арганізацыі «Дзетвара». Павырасталі хлапчукі і дзяўчаткі! Задаюць тон маладзёжнаму жыццю ва ўсім уездзе, нават шырэй. Здаралася, і не пазнаваў Анатоль сваіх нядаўніх сябрукоў і падначаленых. Раней вясёлыя твары пакрывала смуга заўчаснай сталасці, памятка нядаўна пражытага, страшнага ў Паволжы голаду. Анатоль назваў у думках голад фронтам без гераізму. Самым жахлівым з франтоў. Фронт павальнай смерці і выпадковага выжывання. У параўнанні з тым, што ён пачуў тут, яго жыццёвыя прыгоды і нягоды драбнелі. Заставалася толькі дзёрзкае адчуванне: што гісторыя тварылася ўсё ж такі там, на Заходнім фронце. І там яна прадоўжыцца.

Знаходжанню братоў Альшэўскіх у Ніжнім не суджана было зацягвацца. Новая няўрымслівая эпоха напінала іх, вольныя яшчэ ад сямейных абавязкаў, ветразі. Яраслава пераводзілі па службе ажно ў Сярэднюю Азію — ваенкомам. Ехаць з братам Анатоль не бачыў сэнсу: што мог бы рабіць ён там, у ваенкамаце? Перайсці на пасаду справавода, стаць папяроваю душой? Занятак незайздросны. Амбіцыя даўно ўжо нашэптвала яму: «Не прыліпай да старэйшага брата. Калісьці, яшчэ ў Арзамасе, ты яго, а не ён цябе ўладкоўваў на работу... Кожны сам павінен каваць свой лёс».

Анатоль канчаткова рашыў выплываць на шырэйшыя воды, покуль дрыгва ўладкаванага жыцця не засмокча. Дагнаць Яраслава, які ўжо колькі часу дыхае ветрам гісторыі! Даволі плысці на буксіры. Пара выходзіць на брую і... сваім ходам далей, насустрач лёсу, У інжынеры!

Не здагадваўся Анатоль Альшэўскі, што доля шукала яго ўжо тады таксама настырна, як ён яе. У адчуванні любасці да родных мясцін, да Пружаншчыны быў голас яго долі, якая вось-вось аб'явіцца сама, раптоўна і нечакана. Ён у пісьмах пачынае гаварыць з прыродай Палесся, як з жывою істотай, спавядаецца і ачышчае душу перад хараством недасяжна далёкага роднага краю:

«Эх, родныя, мілыя карціны! Як часта ляціш думкамі-марамі, усёй істотай да цябе, мая радзіма, да тваіх лясоў, да тваіх глухіх нязведаных гушчароў, да панылых абшараў балот, нараскіданых у бязладдзі саламяных вёсачак. Вось і зараз успамінаюцца малюнкі нашага Палесся, едзеш-едзеш, і хутка мільгаюць адна за адной, ляцяць удалячынь вёскі. Яшчэ некалькі шэрых хацінак — і перад табою адкрываюцца бясконцыя прасторы балотнага царства. Калі глядзіш за акно вагона, дык дзіўнае пачуццё ахоплівае цябе. Як вокам акінуць — неабдымная пустыня, якая зліваецца з небасхілам і загадкава пераліваецца сваёй знешне свежай зелянінай дрыгвы. Там, далей, відаць азёры, іх незлічонае мноства: вясной і дажджлівай восенню азёры зліваюцца ў вялізны, да самага небакраю, водны прасцяг.

Рушыш далей — пойдзе па баках лес, як бы прыкрываючы зялёнай сцяною абшары балот і вёскі на астраўках, густа расце нізкі, пахілы хмызняк. І зноў адкрываецца нуднае відовішча балотных прастораў. Толькі часам цішыню нарушае крык дзікіх качак ды сухі клёкат бусла. Не відаць тут і следу чалавека, няма тут праходу, няма дарогі...

Аднак жа якаясьці чароўнасць тоіцца ў гэтым далёкім бязлюдным пейзажы, асабліва ўвечары: лес, хмызняк, азёры, балотныя астраўкі хаваюцца за пялёнкай туману. Балота пакрылася густой вуаллю, каб цямней і таемней сталі яго нетры, каб яшчэ непрыступней быць для людзей, а прывідлівыя фігуры, што вырысоўваюцца з цёмна-шэрых згусткаў туману, быццам жывыя цені, варушацца, перасоўваюцца з месца на месца, як вартавыя, што ахоўваюць спакой зачараванага краю.

...Наша радзіма не мае яркіх мясцін, якія б'юць у вочы пышнаю красою... Але якія прыгожыя, якія захапляюча чароўныя гэтыя бедныя і шэрыя куткі нашай роднай Беларусі!

Эх, калі ўжо можна будзе сказаць словамі Ясеніна: «Я снова здесь, в семье родной, мой край задумчивый и нежный, кудрявый сумрак за горой рукою машет белоснежной, седины пасмурного дня плывут, всклокоченные, мимо, и радость яркая меня волнует непреодолимо». Калі-небудзь ды можна будзе зноў апынуцца на сваёй бацькаўшчыне, каб аддаць ёй свае сілы, каб разам з ёю ісці па цяжкіх дарогах жыцця. Сваю радзіму трэба любіць, ёю трэба ганарыцца — трэба лічыць вышэйшым абавязкам слуганне ёй. Што можа быць больш пачэснага, як жыць і працаваць для таго, каб разбудзіць свой родны край, паставіць яго на ногі, каб ён крануўся наперад. Калі ты імкнешся рухаць наперад свой край, то ўдзельнічаеш у руху наперад усяго чалавецтва».

Гэтае лірычнае пісьмо, нібыта знарок напісанае для сяброў па ідэі, было навеяна роздумам Анатоля Альшэўскага над тым, ці. не вярнуцца на радзіму ў ролі рэвалюцыянера-падпольшчыка — небяспечнай, але пачэснай ролі.

З 15 студзеня па 5 лютага 1925 года пад Масквой праходзіў III з'езд польскіх камуністаў. На ім прысутнічалі кіраўнікі Кампартыі і камсамола Заходняй Беларусі. Вызваленчы рух на акупіраваных буржуазнаю Польшчай беларускіх землях шпарка рос і шырыўся. Падполлю патрэбны былі вопытныя кіраўнікі, правераныя на камсамольска-маладзёжнай рабоце. У часе гэтых клопатаў пра кадры, мабыць, і ўсплыло імя Анатоля Альшэўскага. Яго магла прыгадаць сама Вера Харужая, якая ў 1924 годзе не раз бывала на Пружаншчыне, прысутнічала на камсамольскіх сходах, а ў вёсках Чахец і Смаляніца правяла нават мітынгі пратэсту супраць акупацыі беларускіх зямель. Мажліва, там ад камуністаў і камсамольцаў Пружаншчыны пачула тады Харужая імя Анатоля Альшэўскага. Ад землякоў магло зыходзіць пажаданне вярнуць на падпольную работу іх былога важака, што хораша зарэкамендаваў сябе ў 1920 годзе. І вось недзе ў пачатку 1925 года Анатоль Альпэўскі пераходзіць у шэрагі КПЗБ і атрымлівае накіраванне ў Заходнюю Беларусь. Прыязджае сюды цераз Берлін з пашпартам на імя Яна

Любовіча. Удзячная памяць пра перажытае падказала яму партыйную клічку — Юрка Пружанскі.

## ПОПЛЕЧ З ВЕРАЙ

Прыехаўшы ў Вільню, дзе тады размяшчаліся кіруючыя органы Кампартыі і камсамола Заходняй Беларусі, Альшэўскі даведаўся пра цяжкую сітуацыю, якая склалася ў падполлі пад канец 1924 года. Многія партыйныя ячэйкі на Віленшчыне яшчэ вясной былі знішчаны ў выніку масавых арыштаў актывістаў. Маладая Кампартыя Заходняй Беларусі вымушана была весці ў дадатак барацьбу супраць расколу, «сэцэсіі», які спрабавалі ўчыніць апантаныя нацыянальным эгаізмам Гурын-Маразоўскі і іншыя. На II канферэнцыі КПЗБ, у лістападзе, яны патрабавалі поўнага аддзялення арганізацыі заходнебеларускіх камуністаў ад кампартыі Польшчы, якая, паводле іх нагавору, нібыта не разумела нацыянальных інтарэсаў беларускага насельніцтва і не хацела падтрымліваць нацыянальна-вызваленчы рух — пашыраць паўстанчую барацьбу. Канферэнцыя асудзіла раскольнікаў. ЦК Кампартыі Польшчы і Заходняй Беларусі выключылі завадатараў з партыі. На III з'ездзе КПП была створана спецыяльная камісія з прадстаўнікоў братніх кампартый, якая вывучыла справу, прызнала «сэцэсію» дробнабуржуазным нацыяналістычным ухілам і адобрыла выключэнне верхаводаў з партыі. Але замятня на гэтым не скончылася. Як стала вядома на месцы, сэцэсіянеры, скарыстаўшы выезд кіруючага актыву КПЗБ у Маскву на III з'езд, кінуліся ў інтрыгі, залучылі ў свае цянёты членаў ЦК КПЗБ — вядомага літаратара Леапольда Родзевіча і яго сябра Андрэя Капуцкага, падпарадкавалі сабе партыйную прэсу, узялі ў свае рукі падпольную друкарню і апублікавалі ў газеце «Бальшавік» свой «Камунікат» — дэкларацыю, у якой заклікалі падтрымаць барацьбу супраць польскай Кампартыі як сілы нібыта «чужой», варожай вызваленчаму руху Заходняй Беларусі. Сэцэсіянерам удалося пахіснуць і збіць з тропу даверлівых людзей, якія не мелі рэвалюцыйнай загартоўкі.

Увесь люты і сакавік 1925 года прайшлі ў контрнаступленні партыйна-камсамольскага актыву супраць сэцэсіянераў.

Анатоль Альшэўскі прымаў у гэтай кампаніі гарачы ўдзел. Відавочна, тут ён непасрэдна сутыкнуўся з Леапольдам Родзевічам, літаратарам, адказным за публікацыю раскольніцкага «Камунікатa». Альшэўскі жыў тады надзеямі на вельмі хуткую рэвалюцыю сусветную і замала ведаў Родзевіча, каб зразумець драму пачуццяў заходнебеларускага пісьменніка, суб'ектыўную сумленнасць яго хістанняў.

Прадумаўшы пастанову Выканкома Камінтэрна, у якой «сэцэсія» асуджалася, Л. Родзевіч і амаль усе, хто памыляўся сумленна, зразумелі свае памылкі, раскаяліся і вярнуліся ў шэрагі партыі. Толькі завадатар гэтай авантуры Міхась (Гурын-Маразоўскі) кінуўся ў палітычныя інтрыгі. Ён спрабаваў заручыцца падтрымкай дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, памкнуўся весці перагаворы з Браніславам Тарашкевічам і Сымонам Рак-Міхайлоўскім — лідэрамі Беларускага пасольскага клуба. Яны распазналі ў Гурыне авантурыста, які прыкрываецца патрыятызмам. З такім суб'ектам гэтыя дзеячы наогул не захацелі мець справы. Затое паліцыя ўчула ў раскольніку, звіхнутым на пункце ганарлівасці і нацыянальнай выключнасці, спакуслівую здабычу. Гурына арыштавалі, пасадзілі ў следчую турму, дапытвалі і «апрацоўвалі» да тае пары, пакуль той не скруціўся канчаткова. Звышпатрыёт вырыхтаваўся на ардынарнага правакатара. Зухаватая самаўпэўненасць колішняга афіцэрыка вырадзілася ў злосную пагарду да мас і да партыі, якая выказвала волю працоўных, несла адказнасць перад гісторыяй і не магла патураць сепаратысцкім ідэйкам. На жаль, Гурын займеў раней таварыскія сувязі з кіраўнікамі Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі — Язэпам Лагіновічам (П. Корчык), Леапольдам Родзевічам і Арсенам Канчэўскім. Да сястры апошняга зухаваты Міхась заляцаўся і нават хадзіў у жаніхах. Гурын многа ведаў пра людзей і справы падполля. Калі Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя далучылася да КПЗБ, а яе важакі занялі адказныя пасады ў новай партыі, колішнія знаёмствы Гурына падскочылі ў цане, абяцалі прынесці ўладальніку высокія працэнты. Паліцыя займела казырнога туза правакацыі і збіралася згуляць на гэтую карту. Над камуністычным падполлем навісла пагроза. Партыя вымушана была абараняцца. Партыйны суд ухваліў кару здрадніку па суровых законах падполля. Правакатар чакаў гэтага і заўчасна

шмыгануў пад ахову дэфензівы. З палітычнай арэны Вільні зніклі тады сэцэсіянеры.

Абставіны прымушалі пільней глядзець на былых сэцэсіянераў, а ўсім тым, што вярнуліся ў партыю, дапамагаць умацоўвацца на ленінскіх прынцыпах.

Юрку не лёгка было выпрацаваць аб'ектыўны погляд на справу. Атмасфера была напружанай да таго, што ў парывах абурэння на ўпартых сэцэсіянераў ён гатовы быў ледзь не прызнаць рацыю ультралевых, паводле якіх нацыянальныя пачуцці — проста нерэальнасць. Але ж КПЗБ павінна была развіваць нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі, які заклікаў да партызанскай барацьбы...

Нялёгкія праблемы займалі камуністычнае падполле ў Польшчы на пачатку 20-х гадоў. Ішла прыцірка нядаўняй, сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКШЛ) з членамі левага адгалінавання Польскай партыі сацыялістычнай (ППС-лявіца). Дзве гэтыя сілы аб'ядналіся ды разам утварылі ў 1918 годзе Камуністычную партыю Польшчы (КПП). Пушчаныя ў адно рэчышча, хоць і роднасныя, але розныя плыні польскага рэвалюцыйнага руху, захоўвалі свае звычкі і традыцыі, трымаліся сваіх важакоў. З шэрагаў СДКПіЛ паходзіў Адольф Варскі (Ежы Варшаўскі), а з ППС-лявіцы Вера 6 Кастшэва (Марыя Кашуцкая). Яны, на шчасце, дасягнулі згоды і супольна стварылі новую палітычную лінію, змагаючыся супраць ультралевых, якія недаацэньвалі легальных форм работы — дзейнасці ў прафсаюзах, сувязі з сялянска-дэмакратычным і нацыянальна-вызваленчым рухам. Абнаўленне палітычнай лініі праходзіла напружана, выбухалі спрэчкі і персанальныя канфлікты, спакваля ўтварыліся ў кіраўніцтве КПП дзве групоўкі. Варскі і Кастшэва — дасведчаныя тэарэтыкі, бліскучыя публіцысты ўсё ж правялі новую лінію на II з'ездзе партыі восенню 1923 года большасцю галасоў. Па прапанове прыхільнікаў Варскага і Кастшэвы была створана ў канцы 1923 года КПЗБ — аўтаномная тэрытарыяльная арганізацыя КПП, закліканая наблізіцца да нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў. Але парадокс: кіраўнікі КПЗБ прымкнулі да апазіцыйнай Варскаму і Кастшэве групы, якою кіраваў Л. Домскі (Генрых Стэйн), вядомы крайне левымі поглядамі дзеяч

---

6 *Псеўданім **Vera** паходзіць ад лацінскага **veritas —** ісціна.*

рабочага руху Варшавы, колішні член СДКПіЛ. У Заходняй Беларусі шырыўся тады партызанскі рух, бунтарныя сілы вёскі рваліся да зброі, таму, відаць, і прыйшлася даспадобы кіраўнікам маладой КПЗБ жорсткая бескампраміснасць левых. Рознагалоссі ў кіраўніцтве КПП перадаліся ў нізы, падзялілі нават родзічаў: брат Домскага Уладзіслаў Стэйн не падтрымаў Генрыха, пайшоў за Варскім і Кастшэвай. На V Кангрэсе Камінтэрна летам 1924 года група Домскага, крытыкуючы хібы ЦК, прыйшла да кіраўніцтва партыяй. Удзельнікі Кангрэса, якія заняліся аналізам новай тактыкі, палічылі патрэбным захаваць прынцыпы, але вывесці Варскага і Кастшэву з ЦК і вядучае месца заняла група на чале з Домскім. І Цяжка было Юрку разабрацца ў спрэчках і канфліктах: праціўнікі часта перасольвалі і прыпісвалі адзін аднаму справы і помыслы, якіх фактычна не было. Міжвольна ён уцягваўся ў дыскусіі, запамінаў прозвішчы дзеячаў, дзівіўся, што нават камсамольцы кідаліся ў лабірынт рознагалоссяў, выдатна арыентаваліся ў пастулатах і ўзаемных абвінавачаннях старэйшых таварышаў.

Непрывычнай і спачатку нямілай была Юрку ўнутрыпартыйная калацея. Ён прывык у асяроддзі вайсковых палітработнікаў да дысцыпліны думак і еднасці дзеяння. А тут даводзілася губляцца ў падаплёках. Прыхільнікі Варскага і Кастшэвы ўзнімалі правільную ідэю саюза рабочых і сялян, яны без агаворак падтрымлівалі курс на адзіны фронт, абвешчаны Камуністычным Інтэрнацыяналам... Праўда, і апазіцыянеры былі за той жа курс, толькі многае разумелі інакш: ідэю адзінага фронту звужалі, работу ў прафсаюзах недаацэньвалі, наогул асцерагаліся легальных форм дзейнасці.

Перыпетыі барацьбы ў кіраўніцтве здаваліся Альшэўскаму такімі пакручастымі, як вулкі ў старых кварталах Вільні. Толькі лабірынт вулак меў сваю рамантычную прывабнасць, маўклівую таямнічасць. Юрка любіў блукаць па вузенькіх вулках, чытаць мемарыяльныя дошкі, якія расказвалі пра гісторыю горада і края, любавацца ўцалелымі рэліквіямі. Вылучалася ў гэтым пантэоне легенда рамантыкаў, сяброў А. Міцкевіча, філаматаў, польскіх патрыётаў, што ўваскрасілі беларускі дух, далі пачатак паэзіі прыспанага народа. Святынь было тут больш, як у Арзамасе, але яны не належалі аднаму богу. Існаванне розных вер — праваслаўнай, каталіцкай, іудзейскай і магаметанскай — нагадвала пра верацярпімасць.

Аднак ёй даўно прыйшоў канец: духавенства ўцягвалася ў палітычную барацьбу, стварала рэакцыйныя партыі, грамадскія арганізацыі, пісала свецкія кнігі, нават вершы на беларускай мове. Знешне, аднак, горад выглядаў салідным і пачцівым. Старая Вільня супакойвала. Нават фракцыйныя спрэчкі здаваліся не страшнымі, калі іх дасціпна каменціраваў чырванашчокі сангвінік Абрам Цукерман, з якім Юрка пачынаў сябраваць і любіў праходджвацца па старых кварталах. Сам вільнянін, ён ведаў тут усё.

Навучыўся Юрка спажыткоўваць выгады становішча навічка, не звязанага яшчэ сяброўскай ці фракцыйнай кругавой парукай. У спрэчках яму выпадала часам доля трацейскага суддзі, даверанай асобы. Але даходзілі да вушэй і закраналі самалюбства крытычныя рэплікі ў адрас прыезджых функцыянераў. Зайздроснікі бачылі ў прафесійных рэвалюцыянерак гэткіх сабе пестуноў лёсу, арыстакратаў падполля, што не мелі нават магчымасці памыляцца — усё ў іх гладка, робяць кар'еры не прайшоўшы цераз дэфензіву, не адляжаўшы бакоў на турэмных нарах...

Затое ўжо гладка гаварыць умеюць, перагібы і недагібы выпроствацць... З'едлівасць і зларадасць — спадарожніцы фракцыйнага саперніцтва. Альшэўскі стараўся праходзіць міма, адмахваўся: ат, маўляў, усюды і заўсёды ветэраны зайздросна правяраюць навічкоў. Давер і аўтарытэт не хутка здабываюцца.

Юрка Пружанскі схіляўся да групы Варскага, хоць у кіраўніцтве КПЗБ пераважалі прыхільнікі Домскага. Ды не паступаў ён абы наперакор: «У рэшце рэшт,— гаварыў ён сабе,— Варскі і Кастшэва шчыра стаяць за адзіны фронт, за новую лінію Камінтэрна!» Няхай сабе і ў іх аказалася не ўсё добра... Камінтэрн падтрымаў левага Мертэнса, прызнаў слушнай яго крытыку ЦК за адрыў тэорыі ад практыкі, кіруючых дзеячаў ад нізоў. Няхай Варскі і Кастшэва часова адышлі ад ЦК, але ж Домскі ўтрымаўся ўсяго некалькі месяцаў. За левыя перагібы — спробу сабраць і вывесці Першага мая на вуліцы гарадоў асобныя камуністычныя калоны — Домскага знялі з кіраўніцтва. Мертэнс, гаварылі, настойваў, каб усіх членаў ЦК пакаралі аднолькава за памылку, але яго ў складзе ЦК пакінулі. Даверылі прадстаўляць ЦК КПП у КПЗБ.

Юрку Пружанскага цікавіў гэты чалавек яшчэ з Масквы, з III з'езда КПП, калі ён, тады яшчэ Анатоль Альшэўскі, рабіў цяжкі жыццёвы выбар: замест інжынернага інстытута, пра які так даўно і горача марыў, даў згоду на небяспечную работу ў заходнебеларускім падполлі. Анатоля рыхтавалі да гэтай работы, і тады ў яго жыццё неспадзявана ўвайшоў чалавек з партыйнаю клічкай «Стэфан». Вера Харужая на Анатолевы роспыты адказала неяк стрымана, што «Стэфан» курыруе заходнебеларускае падполле ад імя ЦК КПП. Юрка, кандыдат у падпольшчыкі, натуральна, пазнаёміўся з куратарам. Нават меў гонар выслухаць яго выступленне пра бальшавізацыю партыі. Запомніў кароткі афарызм: «Бальшавізацыя — гэта саюз тэорыі і практыкі!»

Каранасты, чарнявы, нетаропкі, ён здаваўся на выгляд дабрадушным валюхаватым мядзведзем. Але гэтаю сваёй флегматычнасцю і спакоем якраз пераконваў слухачоў, абяззбройваў праціўнікаў. Сурова крытыкаваў ён ранейшых кіраўнікоў, асабліва з замежнай секцыі, за слабую сувязь з нізамі, за адрыў тэорыі ад практыкі, але рабіў гэта не павышаючы голасу. Прапанаваў увесці такі стыль работы, каб нізавыя арганізацыі самі праяўлялі ініцыятыву і адчувалі адказнасць. Раіў не скоўваць іх дырэктывамі зверху, не абстаўляць функцыянерамі, гэтакімі платнымі лекарамі на ўсе выпадкі, «Стэфан» спасылаўся на вопыт партарганізацый гарнякоў Дамбровы. Спакойна даводзіў прамоўца, што трэба прыняць пастанову аб паляпшэні структуры партыі, прапанаваў утварыць партячэйкі па вытворчаму прыпцыпу —- на прадпрыемствах, у цэхах і ў стратэгічных вузлах буржуазнай дзяржаўнай машыны — на чыгунцы, у войску, на пошце, на вайсковых заводах.

Дзесьці ў канцы з'езда Анатоль быў запрошаны на субяседаванне. Вялі сустрэчу Стэфан Мертэнс і Павел Корчык. Падбор і расстаноўку кадраў прадстаўнік ЦК КПП лічыў справай першай ступені і стараўся ўдзельнічаць у рашэнні кадравых пытанняў асабіста. Гутарка пачалася цяпер з роспытаў пра жыццёвы шлях, вопыт камсамольскай работы. Калі Анатоль паведаміў, што ў Бярозе ў яго маці, бацька і сястра, спакойны, як бы сонны твар Мертэнса ажывіўся, вузкі разрэз левай вачніцы стуліўся, як у мангола:

– Хочацца пабачыць маму? — спытаў ён не то спагадліва, не та з ухмылкай.

– Так, хачу, але не дзеля гэтага толькі збіраюся туды,— адпарыраваў Анатоль.

– Натуральна,— пагадзіўся таварыш Стэфан,— з мамай пабачыцца прыемна і пахвальна. Мне вось, хоць сам я ўжо, як гаворыцца, дзядыга, а так хочацца маму пабачыць.

Анатоль заўважыў, што Мертэнс гаворыць па-руску з моцным польскім акцэнтам, і фразы будуе на польскі лад. Расцягнутая мова яго гучала месцамі пацешна. Аказалася, размоўца ведаў усю анкету Анатоля і дапытваўся, ці не забыў ён хоць беларускай мовы?..

– З палешуком разгаваруся,— паспрабаваў дасціпкаваць Анатоль.

– Разгаварыцца з палешуком можна хіба на пяці мовах адразу. А мяне цікавіць беларуская, літаратурная. Рэвалюцыйнаму падполлю патрэбны мясцовыя кадры. Рыхтуйцеся ў гэтым кірунку. Каб сталі такім беларусам, як таварыш Павел Корчык. Мертэнс паказаў на хударлявага інтэлігента, што сядзеў наўзбоч ад яго. У Вільніі Юрка змог пазнаць Мертэнса і Корчыка бліжэй.

Стэфан Мертэнс (Станіслаў Скульскі) паходзіў з Лодзі, гадаваўся ў сям'і слесара, пачынаў працоўнае жыццё слесарам. Школай палітычнага выхавання стала для яго работа ў радах СДКПіЛ. Праследавала яго царская паліцыя. Пабыў ён да першай сусветнай вайны ў эміграцыі ў Заходняй Еўропе, потым ваяваў на фронце. Трапіў ва Усходняй Прусіі ў акружэнне, стаў палонным. Цасля Брэсцкага міру Скульскі прыехаў у рэвалюцыйную Расію ў эшалоне хворых ваеннапалонных. Падлячыўшыся, пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію, ваяваў супраць Юдзеніча, камандаваў штурмавым батальёнам петраградскага рабочага палка, быў цяжка паранены. Далечваўся ў 1920 годзе ў Смаленску, адтуль па спецыяльнаму заданню Фелікса Дзяржынскага прыбыў у жніўні ў Беласток і кіраваў адміністрацыйным аддзелам рэўкома. Адступіўшы з Чырвонай Арміяй восенню 1920 года, апынуўся ў Навагрудку, займаў пасаду старшыні павятовага рэўкома і 16 верасня падпісаў дэкрэт аб ахове роднага дома Адама Міцкевіча, аб стварэнні музея і бібліятэкі імя славутага

паэта. Пасля перамір'я Station Скульскі працаваў старшынёй руска-ўкраінскаіі камісіі на рэпатрыяцыі і абмену заложнікаў.

Юрка, даведваючыся пра шляхі-дарогі Мертэнса-Скульскага, думаў, што мог бы недзе ён сам, а Яраслаў то і не раз, сустрэць гэтага чалавека на дарогах грамадзянскай вайны.

Віленскіх падпольшчыкаў захапляла ў таварышы Стэфане асабістая мужнасць. Маючы вельмі панадную для паліцыі «прыкмету» — прыжмур і касіну левага вока, ён наперакор усяму трымаўся свайго прынцыпу: кіруючы работнік павінен жыць там, дзе яго падначаленыя. Месяцамі Мертэнс жыў у краі, рабіў рэвалюцыю розумам і рукамі. З Кангрэса Камінтэрна ён вяртаўся познім летам цераз «зялёную граніцу». Ля Стоўбцаў Мертэнса і Язэпа Лагіновіча (Корчыка) захапіла паліцыя. На выручку прыйшоў партызанскі атрад Станіслава Ваўпшасава. У начным баі партызаны авалодалі турмой і вызвалілі арыштаваных.

Пасля гэтага выпадку гаварылі, што Мертэнс пранікся павагай да партызанскага руху. Ён і раней падтрымліваў стаўку кіраўніцтва КПЗБ на ўзброенае паўстанне. А цяпер распрацаваў тэзісы падрыхтоўкі і правядзення паўстання. У адрозненне ад нацыяналістычных лідэраў, якія ўяўлялі паўстанне меладрамай з крывавым актам помсты ў цэнтры сюжэта, Мертэнс разумеў паўстанне як заканамерную праяву класавай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Усведамляючы адказнасць і цяжар паўстанцкай барацьбы, ён не дапускаў думкі аб лакальным, толькі заходнебеларускім узброеным выступленні, а ўяўляў яго як падзею агульнапольскую. Заходнебеларускім паўстанцам адводзіў Мертэнс ролю дэтанатара, а выбух павінен быў наступіць па ўсёй Польшчы. Умовай такога выбуху было паглыбленне крызіса. Разумеючы ўзаемазалежнасць паўстання ад сітуацыі ў краі, Мертэнс здолеў і зняць яго з парадку дня, як толькі наступіла стабілізацыя ў Польшчы.

Яшчэ і ў перыяд арыентацыі на паўстанне Мертэнс не закідваў мірных форм барацьбы, вёў захады аб утварэнні агульнага фронту камуністаў і рэвалюцыйнай дэмакратыі, асабіста сустракаўся з беларускімі радыкальнымі дзеячамі, дамаўляўся аб утварэнні масавых легальных арганізацый радыкальнага характару.

Мертэнс быў адважны і сумленны практык рэвалюцыі, добры арганізатар, які ведае цану партыйнай дысцыпліне і ўмее сумленна выконваць пастановы вышэйшых органаў партыі, нягледзячы на тое, якая групоўка іх унесла. Працуючы пад кіраўніцтвам Мертэнса, Юрка праходзіў школу мужнасці, набываў вопыт арганізацыі рэвалюцыйнай барацьбы. Нажываў і новых сяброў.

Сярод маладзейшых таварышаў з віленскага падполля Юрка ўпадабаў сціплага і далікатнага па натуры, але цягавітага падпольшчыка «Пятра». Было ў ім нешта свойскае, блізкае. У грамадзянскую вайну ён жыў таксама ў глыбі Расіі, уступіў у Чырвоную Армію, ваяваў на Беларусі супраць польскіх інтэрвентаў. Ледзь не разам з Анатолем прыйшоў «Пётр» у заходнебеларускае падполле з Мінска і ўзначаліў Віленскі акруговы камітэт КПЗБ. Юрку падабалася рыцарская сумленнасць «Пятра», чымсьці ён нагадваў брата Яраслава, хоць быў амаль што Юркавым равеснікам. «Пётр» разам з Корчыкам і Артурам Аронштамам выступаў прадстаўніком ЦК КПЗБ на нарадзе з дзеячамі нацыянальна-вызваленчага руху, дзе рашалася пытанне аб стварэнні масавай арганізацыі гэтага руху — Грамады. Мертэнс на гэтых сустрэчах прадстаўляў ЦК КПП.

Па рабоце Юрка найчасцей кантактаваўся з Верай Харужай, сакратаром ЦК камсамола Заходняй Беларусі. Яе называлі ў камсамольскім асяроддзі пяшчотна і проста — Веркай. Кожнага, хто з ёю знаёміўся, кранала таварыскасць і вабіў камсамольскі аганёк.

Што інтрыгавала Юрку з таго часу, як ён пачаў працаваць побач з Верай, дык гэта сакрэт яе папулярнасці. Знешнасць у дзяўчыны някідкая, каб не быў чалавек знаёмы, дык на вуліцы мо прайшоў бы і не заўважыў. Дзяўчына як дзяўчына: гараджанка, інтэлігентка на нізкай зарплаце, а мо кваліфікаваная работніца — краўчыха ці мадыстка...

Юрку засела ў памяці ўражанне ад іх першай сустрэчы ў Маскве. Вера падалася яму тады нейкай скаванай, хоць ты суцяшай яе. Уразіла перамена, якая наступіла з Верай тут, у Вільні. Змянілася, не пазнаць у трывожных абставінах падполля. «Напятая галасістая струна»,— падумаў неяк пра яе Юрка. Нечакана прывабнай, проста прыгожай станавілася Вера, калі гаварыла. Столькі было ў яе шчырай захопленасці,

гарэння за справу, сардэчнага клопату пра сяброў. Над усімі ўражаннямі, што паўставалі ў часы, калі Юрка апынуўся побач з Верай, было пачуццё надзейнасці. Знікала трывожная напружанасць, чалавек адчуваў сябе гаспадаром свайго лёсу, а не аб'ектам паляўнічага азарту «тайнякаў».

Барацьба за еднасць партыі, работа над аднаўленнем партыйных і камсамольскіх арганізацый на Віленшчыне, адраджэнне і разгортванне падпольнага партыйна-камсамольскага друку і падрыхтоўка II канферэнцыі камсамола Заходняй Беларусі — усё гэта навучыла Анатоля Альшэўскага разумець марксізм не толькі як навуковую тэорыю, а і праграму рэвалюцыі, яе стратэгію і тактыку.

Блізкаю душой, на якую можна было абаперціся ў цяжкую хвіліну, заставалася Вера Харужая. Яму падабалася яе неўтаймаванасць, цвярозая пільнасць і строгасць ацэнак людзей. Пагаварыць з ёю — азначала нібы прайсці маральную праверку і ачышчэнне.

Аднойчы, гэта было ў Вільні, у час падрыхтоўкі камсамольскай канферэнцыі, яны апынуліся на канспіратыўнай кватэры ўдваіх. Вера нечакана спытала ў яго не то жартам, не то ўсур'ёз:

— Калі ты апошні раз плакаў, Юрка?

— Што за пытанне...— адказаў ён няпэўным голасам, думаючы-гадаючы: «Куды яна хіліць?»

— Проста так, для праверкі характару. Псіхалагічны тэст.

— Як памёр Ленін. А ты? — Юрка рашыў застрахавацца.

— А я... Я тады гатова была рыдаць. Але стрымала слёзы. Я выступала на мітынгу, па вялікім мітынгу, і, помню, казала, што мы, бальшавікі, не будзем плакаць, мы ўшануем памяць правадыра барацьбой. Я верыла, што ён нам не даруе слёз...

Анатоля захапляла ў Веры няспыннае гарэнне — усё адразу і ўсё жвава, весела, горача — так шчодра і шчыра, як бы яна, гэтае трапяткое дзяўчо, ніколі не думала, што ёсць жа недзе межы сіл чалавечых і гэтай яе цудоўнай здольнасці выпраменьваць жывую зіхоткую энергію дзеяння. Ён, Юрка, сам быў бойкім, умеў ладзіць камсамольскія афіцыйныя і

таварыскія сустрэчы, лёгка сыходзіўся з людзьмі, але часам былі моманты, калі яму хацелася пабыць аднаму, не для таго, каб адпачыць ад людзей, не, людзі яго не стамлялі, яны распальвалі новую цікавасць да самога сябе, калі хочацца разважыць і абдумаць некаторыя факты або нечаканыя і непамысныя ўчынкі свае, параўнаць яву жыцця з тым ідэалам, якому служыў, разабрацца, ухваліць зробленае або прыняць на душу, як грэх, памылку. У Веры, яму так здавалася, усе ўчынкі былі настолькі ясныя і зразумелыя, што не было патрэбы задумвацца над іх маральнай вартасцю. Брала зайздрасць, і ён недзе адчуваў сваё паніжэнне. Нават нечаканыя дзіцячыя выбухі любасці, калі яна, радуючыся за нейкі яго ці іх агульны поспех, абнімала і цалавала ў шчаку, як брата, былі такімі бездакорнымі.

Анатоль лавіў сябе на тым, што часам у яго пачынала кружыцца галава, але інтуіцыя казала цвёрда, што Вера створана не для асабістага жыцця. Яе місія — несці шчасце ўсім, адсюль і бясконцае жаданне зліваццa з калектывам, гэтая яе прага публічных выступленняў на сходах, мітынгах. Унутраны голас шаптаў Анатолю ў час, калі, засынаючы, ён падводзіў рахункі перажытага, што такія дзяўчаты, як Вера, у лепшым выпадку могуць употай пакахаць старэйшага за сябе таварыша, героя, які заімпануе вопытам, воляй, аўтарытэтам і будзе сыходзіць у дзявочыя сны з аблокаў недасяжнасці або, па прыкладу Юпітэра, сам стане воблакам, каб прытуліць каханую нечалавечым, мяккім і ўладарным прытуленнем, дазволіць дзяўчаці, надзеленаму сутнасцю чалавечай, судакранацца з сутнасцю боскай, сусветна-касмічнай. Зрэшты, Верыным богам быў народ. І быў ён не велічным Зеўсам, а трагічным, закутым Праметэем.

У снежні 1925 года Альшэўскі выязджаў праз вольны горад Гданьск у Маскву на IV канферэнцыю КПП і на III канферэнцыю КПЗБ. За плячамі быў амаль год работы ў падполлі. Цяжкі год. Перабіраючы ў памяці падзеі гэтага незвычайнага года, ён успамінаў небяспечныя сітуацыі, з якіх яму пашанцавала выйсці цудам, аднойчы нават пашпарт давялося пакінуць у гаспадара гасцініцы «Варшаўская». Але сам уцалеў. Ганарыўся ў душы, што ёсць і яго ўклад у арганізацыю камсамольскай справы.

Колькі патрэбна было папрацаваць усяму актыву, каб наладзіць у Вільні яўкі, забяспечыць канспіратыўныя кватэры для дэлегатаў канферэнцыі, памяшканне для пасяджэнняў. А яму з Верай і сакратаром ЦК камсамола Польшчы Аляксандрам Завадскім даводзілася яшчэ рыхтаваць праекты пастаноў, зваротаў, дэкларацый.

Паліцыя віжавала ўсюды, штосьці яна ведала. Як бы ўгадваючы, што гістарычны крок мае зрабіць заходнебеларускі камсамол, ворагі зноў павялі навобмацак масавыя арышты ў нізавых ячэйках. Перад самым пачаткам канферэнцыі да кіраўнікоў дайшлі сігналы, што паліцыя рыхтуе налёт. Спешна рашылі разыходзіцца з памяшкання. Усе дэлегаты, па двое, па трое, прабіраліся кіламетраў дваццаць за горад, у лясок Веркі. Там і пачалі працу пад чуйнаю аховай сваіх патрулёў і ганцоў.

Дэлегаты з гордасцю дакладвалі, што за паўтара года камсамол Заходняй Беларусі здолеў увабраць у сябе цвет рабочай моладзі. У падпольныя ячэйкі запісваюцца найбольш актыўныя вясковыя юнакі і дзяўчаты. Слонім, Косаў, Баранавічы мелі ўжо сельскія райкомы. Перад вачамі Альшэўскага ўставалі гарэзныя і смелыя постаці маладых віленскіх камсамольцаў. Параўноўваючы іх з сябрамі свайго юнацтва, ён мог быць задаволены: з таго ж цеста!..

Прыгадвалася Юрку, як ён пасля арышту Веры ў верасні напісаў ад імя камсамола Заходняй Беларусі пісьмо ў ЦК ЛКСМБ. Гэта быў адказ на пісьмо, якое яны атрымалі з Мінска. Адказваў ён за Веру, не ведаючы, што сталася з тэкстам атрыманага паслання. Ён насіў той хвалюючы тэкст у памяці. Пра ўсё гэта, як пра тыповы для суровых абставін падполля факт, і напісаў Юрка. Ён не стаў скардзіцца на няўдачы, наадварот, зваў камсамольцаў Савецкай Беларусі яшчэ рупней працаваць на фронце сацыялістычнага будаўніцтва: «Самая вялікая і самая галоўная дапамога, якую вы аказваеце нам, гэта ваш рух наперад, гэта агромны творчы рост вашай рэспублікі. І чым хутчэйшы будзе гэты рост… тым хутчэй будзе набліжацца радасны час з'яднання дзвюх расколатых частак аднаго народа пад сцягам Савецкай улады». Пішучы гэта, Юрка чуў унутраным голасам, як Вера чытае іхні адказ на нейкім камсамольскім сходзе.

Яму здавалася, што ловіць шматгалосы пошум сходу, грамада паўтарае за Верай словы пісьма. Урачыстая інтанацыя

разлягалася рокатам хваляў за бортам карабля. Над хорам уздымаўся высокі натхнёны Верын голас. Нібы для яе голасу спецыяльна Юркава рука напісала тады нязломна-геранчную канцоўку: «Усякая барацьба патрабуе ахвяр, але мы ведаем, што і перамагае толькі той, хто змагаецца. Мы пераможам! Нас не пераб'еш, нас не знішчыш![7]»

Перабіраючы ў думках перажыванні, навеяныя лёсам Веры, Анатоль разумеў, што ён яшчэ доўга будзе асэнсоўваць урокі камсамольскага жыцця і работы, якія ён атрымаў у падполлі. «Дзе цяпер наша Вера? — неадступна праследуе Анатоля пытанне. У верасні яе арыштавалі ў Беластоку — рыхтавала акруговую канферэнцыю. Не паспела... Спачатку ён не хацеў верыць чуткам. Але факты — упартая рэч. У кастрычніку быў узяты паліцыяй таварыш Мертэнс, прадстаўнік ЦК КПП пры Кампартыі Заходняй Беларусі. Прайшла пагалоска, відаць, нагавор, нібы яго здымак паліцыя знайшла ў арыштаванай Веры. Анатоль не дапускаў такой думкі.

Па даручэнню ЦК Кампартыі яму з верасня даводзілася замяшчаць яе на пасадзе сакратара ЦК камсамола. І што б ён ні рабіў, чаго б ні пачынаў, заўсёды думаў: «А як бы зрабіла Вера? А што б сказала Вера?»

Успомніў ён апошнюю сустрэчу ў Варшаве. Выклікалі іх на нараду ў Краёвы камітэт ЦК, але явачная кватэра аказалася пад пагрозай, таму ўдзельнікі нымушаны былі разысціся, каб праз нейкі час сабрацца ў іншыя месцы. Яны з Верай пайшлі па вуліцы, іграючы ролю закаханай пары, у славуты варшаўскі парк. Адны ў чужым горадзе. Ды яшчэ — небяспека... І адчулі тады міжвольную роднасць, не маглі адагнаць прыліву чуласці: шапталіся на ўтульнай лаўцы. Прахожыя сапраўды маглі падумаць, што гэтая гарэзлівая бландзінка і прыстойны брунет, прычасаны на прабор,— ладная пара.

А Вера расказвала, як ёй давялося ўступаць у партыю. Была тады настаўніцай у Мазыры. Гэту працу нядаўняй гімназістцы, якая месяцы тры пры белапаляках батрачыла ў мельніка ў вёсцы Рагалі, далі Саветы, адбіўшы ў палякаў Мазыр. На сходах настаўнікаў яна выступала за бальшавікоў,

---

[7] Тэкст знаходзіцца ў партыйным архіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, ф. 242, вопіс 1, справа 61, арк. 408-409.

ёй хацелася самой належаць да іх згуртаванай сям'і. Якое шчасце, калі голас твой выяўляе волю многіх. І вось яна ў сакратара ўкома партыі. Выслухаў. Сказаў: «Ранавата вам, інтэлігентцы...»

А потым праняўся яе засмучанасцю, перайшоў на «ты» і параіў:

— Знайдзі рэкамендацыю і спярша паступі ў камсамол. Паварышся ў камсамольскім катле — бачна будзе...

Рэкамендацыю даў загадчык павятовага аддзела народнай асветы. Прыйшла ўзрадаваная ў павятовы камітэт камсамола, а там — эвакуацыя. Цяпер не да прыёму, адмахваюцца ад яе. «Адаб'ём горад у белых, тады будзем бачыць. А ты застанешся ці з намі эвакуіруешся?» — «Куды ўсе, туды і я». Пагрузіліся ў цягнік і выехалі ў Гомель. Там сфарміравалі камсамольскі баявы атрад для барацьбы з бандамі Булак-Балаховіча. Прынялі ў атрад і Веру, назначылі разведчыцай, хоць яна і не была аформлена камсамолкай. З гэтым атрадам Харужая вызваляла Мазыр. І толькі пасля пробы агнём далі ёй камсамольскі білет і назначылі бібліятэкарам, потым загадчыцай палітпрасветаддзела. Яна ведала цану звання камсамолкі.

«Так,— вяртаўся Альшэўскі да рэальнасці,— тысяча дзвесце чалавек як быццам і не шмат, але год назад было ўсяго 120, у дзесяць разоў менш. Ды справа хіба толькі ў ліку? Якія хлопцы? Прапаў бы сон у паноў, каб ведалі, што за адчайныя душы ідуць супраць іх».

## ДРУГІ ЗАХОД

IV канферэнцыя КПП і трэцяя партыйная канферэнцыя КПЗБ праходзілі ў адным месцы і часе: у снежні 1925 — студзені 1926 года ў Маскве. Анатоль Альшэўскі быў на пасяджэннях. Пачуццё бяспекі, відаць, настройвала польскіх камуністаў на свабодны абмен думкамі. У зале разгараліся спрэчкі: прыхільнікі Варскага і група Домскага імкнуліся адстаяць у спрэчках слушнасць кожная сваёй тактыкі, свайго разумення задач авангарда і мас у рэвалюцыі. І хоць пераможаны важак левых Домскі лічыў сябе не зусім пераконаным, але абяцаў, што падпарадкуецца волі большасці,

абавязаўся прытрымліваццa тактыкі адзінага фронту, умацоўваць неабходныя сувязі партыі з масамі нацыянальна-вызваленчым рухам ускраін.

Каб згуртаваць партыю, канферэнцыя польскіх камуністаў пастанавіла тады не дапускаць наперад фракцыйнай барацьбы, а цэнтральныя органы ўкамплектавала такімі людзьмі, якія былі здольны разраджаць унутраныя напружанасці, тактоўна праводзіць у жыццё пастановы.

Камуністы Заходняй Беларусі на сваёй канферэнцыі ішлі насустрач рашэнням КПП. Агульныя тактычныя прынцыпы ім дапамог выпрацаваць Камінтэрн, але кіраўніцтву КПЗБ належалаператварыць гэтыя ідэі ў канкрэтныя праграмныя планы і мерапрыемствы.

Цэнтральны Камітэт КПЗБ папоўніўся новымі людзьмі, яны прыйшлі ў асноўным на месца тых, хто, як Вера Харужая, трапіў у рукі паліцыі і часова выбыў з барыкад.

Членам ЦК КПЗБ і сакратаром камсамола Заходняй Беларусі быў абраны Анатоль Альшэўскі.

На канферэнцыі Юрка Пружанскі з задавальненнем сустрэў факт, што з ЦК КПЗБ не вывелі ніводнага члена: засталіся знаёмыя людзі — працаваць звычней. Хоць і належалі яны да левай арыентацыі, але былі разважнымі, не засляпляліся дактрынамі. Трымаючы курс на ўзброеную барацьбу, у той жа час яны разумелі патрэбу адзінага фронту рэвалюцыйнай барацьбы, закладвалі яго фундамент. Яшчэ ў 1924 годзе Станіслаў Мертэнс і Лазар Аронштам сустракаліся ў Вільні на Звярынцы з лідэрам радыкальнага крыла Беларускага пасольскага клуба Браніславам Тарашкевічам. Улетку 1925 года Павел Корчык і Мікалай Арэхва — «Пётр», прадоўжылі перагаворы на спатканні ў сценах Віленскай беларускай гімназіі і павялі размову аб супрацоўніцтве з наваствораной фракцыяй Беларускага пасольскага клуба — Грамадой. Восенню таго ж года, яшчэ да арышту Мертэнса, у Сопаце каля Гданьска адбылася больш прадстаўнічая сустрэча, на якой ад лагера нацыянальна-вызваленчага руху прысутнічалі, акрамя Тарашкевіча, дзеячы Таварыства беларускай школы і беларускага банка.

Там быў прыняты план ператварэння пасольскага клуба Грамады ў масавую рэвалюцыйна-дэмакратычную арганізацыю — Беларускую сялянска-рабочую грамаду. Такім

чынам, кіраўнікі КПЗБ маглі прадставіць канферэнцыі доказы прымянення на справе той тактыкі, якая тут атрымлівала адабрэнне.

Канферэнцыя вырашыла, што ранейшая ўстаноўка на ўзброенае паўстанне страціла шанцы на поспех. Гэта абавязвала камуністаў працаваць ва ўсіх легальных арганізацыях рабочых і сялян, каб заваяваць масы і падвесці іх зноў да рэвалюцыйнай сітуацыі. Камуністам належала ўзначаліць выступленні працоўных за дэмакратычныя правы, за нацыянальную школу, культуру, за права на ўз'яднанне з БССР. Гэтая ж задача ставілася і перад камсамолам.

Для Анатоля Альшэўскага адкрылася новае поле дзейнасці. Ён меў мажлівасць параўнаць дзве тактыкі, убачыць выдаткі фракцыйнай барацьбы і слушна ацаніць новыя перспектывы. Давер кіраваць камсамолам радаваў Анатоля, як радуе вучня пахвала любімага настаўніка. Год ранейшай працы ў падполлі здаваўся яму добра пройдзенай практыкай. Цяпер яго чакала адказнае самастойнае заданне.

У часе работы канферэнцыі Анатоль спрабаваў пабачыцца з братам Яраславам, але даведаўся, што той атрымаў назначэнне на пасаду намесніка ваеннага камісара Казахскай рэспублікі. Прыехаць у Маскву Яраслаў не змог. Затое пашанцавала на сустрэчу з Аркадзем Голікавым — Гайдарам, які хоць і быў якраз у Ленінградзе — там выдавалася яго другая кніжка «Жизнь ни во что»,— але адклаў бягучыя справы і спешна прыехаў у сталіцу, каб пабачыцца з сябрам юнацтва. Альшэўскі адвёў душу, расказваючы маладому пісьменніку свае прыгоды падпольшчыка.

Вярнуўся Альшэўскі з канферэнцыі, як тады гаварылася, «у край» з вострым адчуваннем значнасці той справы, якая чакала заходнебеларускае падполле і яго асабіста. Сітуацыя ў Вільні аказалася лепшай, чым можна было чакаць. Часовы выезд значнай часткі кіраўнікоў партыі і камсамола збянтэжыў тайную паліцыю. Яна пачала непакоіцца, губляючы сляды тых, за кім сачыла. Частка канспіратыўных кватэр і асобныя лініі сувязі аказаліся закансерваванымі, часова прыкрытымі. Абставіны працавалі на падполле.

І вось надышоў час новага ўздыму. Камсамольскія ячэйкі раслі ў вёсках, як грыбы пасля дажджу, іх сетка практычна ахоплівала ўжо ўсю Заходнюю Беларусь.

Увайшоўшы ў курс арганізацыйных таямніц, Альшэўскі — цяпер, у падполлі, зноў Юрка Пружанскі — радаваўся, але дзесьці адчуваў і нейкую скруху. Яго ахопліваў элегічны настрой, даймала незразумелае адчуванне віны перад Верай Харужай, што вось яна, уклаўшы столькі сэрца ў справу, раптам аказалася асуджанай на самае страшнае для дзеяча — бяздзейнасць. Так, ён ведаў ад сяброў, што Вера і ў турме дзейнічала, рыхтавалася да абароны на будучым судзе. Аднак поле дзейнасці за мурамі было вузкае, як той патайны палетак палешука сярод лесу і багны, хоць і не абкладваўся падаткамі, але і плёну даваў не шмат.

Увогуле, раптоўныя змены кіруючых работнікаў у падполлі былі справай звычайнай. І ўсё ж мірыцца з гэтым было цяжка. За мінулы год паліцыя двойчы «прачасала» камсамольскую арганізацыю ў Вільні, 130 камсамольскіх актывістаў трапілі ў турму, пяць разоў мяняўся склад Цэнтральнага Камітэта, і толькі траім членам — Юрка Пружанскі быў у іх ліку — пашчасціла застацца на волі.

А былі моманты крытычныя. Неяк адразу пасля канферэнцыі, у сярэдзіне ліпеня, яны ўтрох — Вера Харужая, Аляксандр Завадскі і ён —- з'ехаліся ў Вільню, каб сустрэцца, як сустракаліся штомесяц, для абгаворвання бягучых спраў. Юрка прыехаў з Беластока, Завадскі — з Варшавы, а Вера якраз жыла ў Вільні, кватаравалася на вуліцы Міцкевіча разам з дзвюма студэнткамі-медычкамі. Юрка з Олекам спыніліся ў гасцініцы «Варшаўская». Выходзілі яны раніцай паасобку. Юрка аказаўся ззаду, ішоў назіркам і ўбачыў, як у холе агент тайнай паліцыі высунуўся са схованкі і аклікнуў Олека: «А куды пан так сняшаецца?» Той спыніўся і пачаў нешта тлумачыць. Юрка прашмыгнуў літаральна за спіною ў паліцэйскага агента, праляцеў, як нападмеці — яму здалося, што ногі не кранаюць падлогі. Больш у гасцініцу не вярнуўся, бо яго пашпарт, як стала вядома, забралі ў гаспадара гасцініцы «на праверку».

Уласная ўдачлівасць часам радавала Юрку, але неўпрыцям находзіў на тую радасць нейкі цень скрухі. Віна салідарнасці... Харошае пачуццё, прывілея калектывістаў. Яму хацелася зрабіць нешта ўцешнае для Веры. Шкадаваў, што нельга ўзяць на сябе хоць частку яе пакут. Ён напісаў у турму

пісьмо, расказаў намёкамі пра поспехі камсамола і прызнаўся, як яе не стае тут, на волі.

Юрка думаў пра Веру, распытваў у таварышаў пра акалічнасці яе арышту, пра ход следства. Пэўных звестак не было: хадзілі чуткі, што выдаў правакатар, а хто той нягоднік — покуль што заставалася таямніцай. Ён не ведаў у падполлі нікога, хто б з такою, як Вера, нястрымнай нянавісцю ненавідзеў правакатараў.

Толькі цяпер Юрка ўразумеў, што тая нянавісць — роўная па сіле любві і даверу да сяброў, таварышаў па змаганню. І як жа моцна павінен пакутаваць чалавек, які так давярае людзям і раптам напаткае подлы падман і здраду!

У пачатку красавіка па лініі падпольнай сувязі прыйшоў адказ — шматок белай прасціны, запісаны хімічным алоўкам друкаванымі літарамі. Юрка даўно не быў такі шчаслівы, як у той дзень. І ўстрывожаны таксама. Вера пісала пра тое, як яна рада, што «работа жыве і расце», горача дзякавала за весткі, але тут жа папярэджвала: «Так, мілы, харошы мей хлопчык, якое шчасце, што ты яшчэ жывеш! Мароз па скуры дзярэ, калі прыгадаю, як ты «засыпаны». Яны ж ведаюць нават, як ты выглядаеш, але пра Віленскую гісторыю не ведаюць. А чорная дзяўчына, што жыла ў Фл., стала правакатарам і ўсіх нас, хто туды прыходзіў, засыпала. Будзь асцярожны, родны мой, беражыся, працуй за нас дваіх...»

Вера імітавала стыль і манеру любоўных пісьмаў, хоць у гэтым не было патрэбы. На выпадак, калі тэкст трапіць у рукі турэмшчыкаў, такая хітрасць нічога не дасць. Але было шчымліва-прыемна ад гэтай яе імітацыі:

«Цалую цябе,— пісала яна,— моцна, моцна. Трымайся, трымайся і яшчэ раз трымайся. Калі пратрымаешся менш за мяне, не дарую табе гэтага — пракляну».

На вялікае шчасце, явачную кватэру, пра якую пісала Вера, падпольная «тэхніка» прыкрыла. Пасля вяртання дэлегатаў з III канферэнцыі «ў край» яны атрымалі новыя каналы сувязі. Альшэўскі тут жа перадаў Верыну перасцярогу ў Цэнтральную «тэхніку». А сам перш-наперш узяў брытву і збрыў свае зухаўскія вусікі. Здзіўленай гаспадыні сказаў, што гэта з выпадку вясны, і папрасіў купіць яму модны ў тым сезоне светлы з чорнаю муараваю аточкай капялюш, акуляры і так

загрымiраваны з'явiўся да сувязнога Краёвага бюро ЦК перадаць пра сваю «засыпанасць» у Вiльнi. Неўзабаве яму загадалi намецiць задачы сваiм паплечнiкам на даўжэйшы час i самому выехаць у Пiнскую акругу ў якасцi прадстаўнiка ЦК КПЗБ. У Вiльнi Юрку было забаронена паказвацца да лепшых часоў

## НОВАЕ ЗАДАННЕ

Юрка, хоць i быў хлопец гарадскi — шустры, вёрткi i ўвiшны, але на гэты раз i яго ашаламiў круты каскад падзей, якiя абрынулiся на яго пасля Верынага пiсьма.

Новае заданне — значыць, новыя паролi, яўкi, людзi i канкрэтныя клопаты, справы. Усё гэта трэба запомнiць i разлажыць у памяцi, як у картатэцы. На памяць Юрка не скардзiўся, але i тут патрэбны час. Часу ж у такiх надзвычайных выпадках нiколi не бывае ўдосталь. Так i давялося выехаць з Вiльiii з прыкраю затурбаванасцю на душы. Усё баяўся, што нечага недабраў i нешта патрэбнае пакiнуў. Ахалонеў толькi ў цягнiку. Мерны грукат i калыханне вагона супакойвалi. За акном наплылi сасновыя пагоркi Вiленшчыны. На паўдзённых схiлах жыта адлiвала ўжо сакаўной зелянiнаю, а на паўночных яшчэ ляжаў у барознах сцукраваны снег. Наваколле дыхала сцюдзёнаю чысцiнёю ранняй вясны.

Цягнiк iшоў на Лiду — Баранавiчы — Пiнск.

Звычайна, калi чалавек едзе ў дарогу спакойна, дык на пачатку шляху жыве ўсё справамi той мясцiны, якую пакiнуў, i недзе пад канец шляху пераключаецца на будучы клопат, якi чакае на канцы падарожжа. У Юркi Пружанскага на гэты раз усё перамяшалася. Выезд быў раптоўны, трывожны, як уцёкi, таму час i прастора збiвалiся, згушчалiся, думкi лiхаманкава iмкнулi ў мiнулае, памяць перабiрала драбнiцы фактаў, прыдзiрлiва абшарвала iх, уваскрашала сустрэчы, размовы, позiркi вачэй знаёмых i свежых людзей, жэсты, поцiскi рук i падазрона шукала, дзе ж быў той каварны подступ, драпежная хiтрасць, дзе была подласць? Усе людзi, з якiмi ён сустракаўся ў падполлi, здавалiся яму сумленнымi i вартымi даверу. А тым не менш вось ён уцякае. Нi з кiм у падполлi не меў Юрка асабiстых канфлiктаў i непрыязнасцi. Ён давяраў i меў столькi доказаў даверу i любвi сяброў, а тут раптам... Чорная дзяўчына...

Нейкая горыч і неўсвядомленая крыўда агортвалі яго. Няўжо подласць і каварства неадольныя спадарожнікі чалавецтва? Хіба паверыць буржуазным маралістам, нібы чалавек — істота прынцыпова недасканалая, свалачная і драпежная? Хіба прызнаць, што ідэал чалавечнасці недасяжны для ўсіх людзей, запар? Няўжо патрэбны нягоднікі, каб мелі чым ганарыцца праведнікі? Ад панурых думак Юрка стараўся адбіцца, прыгадваючы Веру. Яна нябось не разгубілася. І з турмы дапамагае... Але вобраз Веры, сілай выцягнуты з таго боку свядомасці, толькі на момант аб'яўляўся і тут жа расплываўся, знікаў.

Раніцай цягнік выпаўз на чыстае палескае разводдзе. Як вокам сягнуць удалеч — усё было заліта вадой. Вадзяны цар нібыта рашыў нагадаць палешукам, якімі багатымі былі яго ўладанні ў старыя часы, калі ў лаханцы Палесся сабралася вада ад расталых скандынаўскіх леднікоў. Мора тое азначалі на картах яшчэ старажытныя грэкі. Сапраўды, перад вачамі раскінуўся бязмежны прасцяг ціхага ружовага заліва, над якім лагодна ўзыходзіла маладое сонца. І дзіўным здавалася, што не на караблі чалавек едзе па моры, а на грукатлівым цягніку, які, нібы казачны змей, мчаўся па вадзе, не пакідаючы следу. Стралой ляцеў змей-цягнік, чмыхаў параю, пускаў клубы дыму, лязгаў буферамі вагонаў, грукацеў па стальных рэйках дыскамі цяжкіх калёс.

Поезд-змей нібы скандзіраваў Верына заклінанне. З таго ліста, адрасаванага яму — пераемніку: «Калі пратрымаешся менш за мяне — пракляну!» «Пракляну, пракляну, пракляну...» — грукаталі калёсы. Узбуджаная фантазія зноў вяртала яго ў Вільню. Дзяўчына з канспіратыўнай кватэры... Якая залётная, ласая на прыветны позірк, на зычлівую ўсмешку. «А ўсё ж маю шчасце,— суцяшаў сябе Юрка,— другі раз маю шчасце! У мінулым годзе вымкнуўся з гасцініцы, а Олек Завадскі — не...» Юрка пакінуў толькі свой пашпарт. Меў непрыемнасці за страту дакумента. Пэўны час хаваўся ў Беластоку. Змяніў выгляд, завёў вусікі. Цяпер збрыў і завёў акуляры. «Усё гэта такая дэтэктыўная тандэта — вусы, акуляры, капелюшы, кепкі, трысцінкі, кульбы... Вось бы апрануцца ва ўсё саматканае, не толькі апрануцца, а стаць сапраўдным палешуком і пасяліцца вось у гэтай ціхай глухамані, на бязлюддзі. Але каб умець яшчэ

передаваць свае думкі на адлегласць... Дзіцячыя недарэчнасці. Другі раз маю шчасце, але да трох разоў штука. Яшчэ толькі адзін раз. Адзіны раз. Апошні шанц лёсу».

На бяскрайнім прасторы разліву зеленавата-ліловымі купінамі падніманіся ўтульныя астраўкі. Яны вабілі цішынёй і соннай маўклівасцю. Хацелася сысці і загубіцца ў гэтым бязлюддзі, перажыць сваю рабінзанаду.

Вясна 1926 года несла пацеху вачам ды сеяла трывогу ў думках. Палітычная біржа краіны кіпела. На сеймавай арэне прарасталі ўсё новыя супярэчлівасці, множыліся падзелы. Не было ўжо ні такой партыі, ні такога дзеяча, каму б удалося сабраць парламенцкую большасць і ўтварыць стабільны ўрад. Утвараліся недаўгавечныя ўрадавыя экіпы, якія называліся лацінскім словам правізарычныя — часовыя. І вось лідэр партыі заможных сялян Вінцэнт Вітас пайшоў на саюз з самымі кансерватыўнымі нацыяналістычнымі сіламі, пераламаў крызіс улады, утварыў урад, які ў сейме збіраў большасць галасоў, але затое так узбуджаў і гуртаваў сілы левай апазіцыі, што напружанне ўзрасло да грані выбуху. Трывожныя і хмяльныя прадчуванні агортвалі падполле. Юрка Пружанскі бачыў, што вясновыя хмары пахнуць маланкамі і грамамі. Нават у прэсу прарываліся інфармацыі пра дзве канфліктуючыя групоўкі ў афіцэрскім корпусе.

Пілсудскі, незадаволены нарастаннем дэмакратызму, яшчэ ў 1923 годзе пайшоў у адстаўку. Мацёры палітычны ігрок трапна выбраў момант для сыходу са сцэны: да ўлады тады ўпершыню прыйшлі правыя на чале з тым жа Вітасам. На долю таго ўрада выпала падаўляць паўстанне кракаўскіх рабочых. Пілсудскі выглядаў у той сітуацыі пратэстантам супраць кааліцыі правых. Праўда, сам пяцідзесяціпяцігадовы адстаўнік не маргнуў і вокам — дэманстраваў пустэльніцкую непрыступнасць. Пасяліўшыся ў Сулеюўку пад Варшавай, ва ўтульным доме з агародчыкам, што купіла яму грамадскасць у нейкага праваднікá класных вагонаў, маршал нават сваю пенсію — тысяча злотых у месяц — перадаў Віленскаму універсітэту. Заняўся мемуарамі. Ды іграць у пустэльніцтва аказалася лягчэй, чым захаваць манашаскія цноты. Ужо вясною 1925 года заўчасны адстаўнік паказаў кіпцюры, накінуўся на міністра вайсковых спраў Сікорскага, быццам той не рупіцца аб незалежнасці вайсковага ведамства ад сейму.

Сікорскі пастунаў адпаведна з традыцыямі буржуазна-дэмакратычных рэжымаў, дзе арміі «падпарадкоўваліся» парламентам. Маршал не зносіў сейму і таму збэсціў міністра апошнімі словамі. Для вайсковага камандавання Пілсудскі патрабаваў поўнай свабоды дзеяння. Не дзіва, што да яго цягнуліся амбітныя афіцэры, аддаючы маршалу караляўскую пашану. У гадавіну звальнення Пілсудскага з Магдэбургскай крэпасці да Сулеюўка з'ехалася армейская эліта, а ваенны камендант Варшавы генерал Густаў Орліч-Дрэшар урачыста заявіў, што ўсе прысутныя гатовы аддаць Пілсудскаму свае сэрцы і свае наточаныя ў баях шаблі. У дзень святога Юзэфа (19 сакавіка) пілсудчыкі зноў з'ехаліся, каб павіншаваць імянінніка, а той абдарыў іх заданнямі на падрыхтоўцы мяцяжу. Асабліва адказнае даручэнне выпала новаму, пасля Сікорскага, міністру вайсковых спраў, генералу Жэлігоўскаму, колішняму пастаноўшчыку фарса па далучэнню да Польшчы Вільні і «Сярэдняй Літвы». Цяпер Жэлігоўскі сцягваў на службу ў варшаўскую вайсковую акругу афіцэраў, адданых Пілсудскаму, а верных ураду — перамяшчаў на перыферыю.

Незадоўга да перавароту сфармаваўся новы ўрад Вінцэнта Вітаса. Жэлігоўскага паслалі на перыферыю, а міністрам паставілі аднаго малавядомага сапёрнага генерала. Перад здачай паўнамоцтваў Жэлігоўскі падпісаў загад аб правядзенні 8 мая вялікіх манеўраў на палігоне Рэмбертова, поблізу сталіцы. І хоць новы міністр манеўры адмяніў, на месцы збору сталі з'язджацца вайскоўцы, падцягваючы адданыя сабе часці.

Прэзідэнт Вайцяхоўскі і прэм'ер Вітас паводзілі сябе залішне бяспечна. Не верылі, што пілсудчыкі пасмеюць ужыць сілу ў дзяржаве, дзе легальным спосабам не цяжка было здабыць уладу. У дзень перавароту прэзідэнт паехаў у загарадную рэзідэнцыю. Пілсудскі памкнуўся было за ім следам, але не застаў, павярнуў у Рэмбертова і, сабраўшы афіцэраў, трагічна прадставіў сітуацыю ў дзяржаве. Для ратавання айчыны трэба захапіць уладу. Яго праграма называлася лацінскім слоўкам «санацыя», што мела азначаць, як быццам, аздараўленне дзяржавы, хворай на эпідэмію дэмакратызму. Падахвочаныя гэтым міласэрным поклічам, пілсудчыкі рынуліся ў цэнтр сталіцы. Верныя ўраду войскі заблакіравалі масты цераз Віслу. Сам прэзідэнт, вярнуўшыся ў

горад, паспрабаваў угаманіць Пілсудскага і выклікаў яго на перагаворы. Сустрэча адбылася на мосце Панятоўскага. Панятоўскіх у польскай гісторыі было два: адзін — Юзэф служыў у Напалеона і загінуў, пераплываючы Эльстару, другі быў апошнім каралём, што падпісаў першую ў гісторыі Польшчы канстытуцыю.

Нядаўнія добрыя прыяцелі, маршал і прэзідэнт, цяпер канфліктуючыя палітыкі, сышліся на сярэдзіне моста. Пілсудскі бачыў сваю перамогу і чакаў, відаць, капітуляцыі, думаў, што давядзецца толькі абгаварыць ганаровую форму адрачэння прэзідэнта ад улады. Але той загаварыў з маршалам пра сілу закона, пра вайсковы гонар.

— Стаю на стражы гонару польскага войска,— пачаў прэзідэнт.

— Ну, ну, толькі не гэтак...— Схапіўшы субяседніка за крысо плашч-накідкі, пагразіў Пілсудскі.

— Я тут прадстаўляю Польшчу,—працягваў, адступіўшыся на крок, прэзідэнт,— Патрабую, каб пан зволіў дамагацца сваіх прэтэнзій законнымі сродкамі...

— Скончыўся ўжо гэты шлях,— махнуў рукою Пілсудскі і падаўся да шарэнгі курсантаў пяхотнага афіцэрскага вучылішча, якое перакрывала мост.

Прэзідэнт таксама павярнуў туды і, размахваючы плашч-накідкай, прайшоў уздоўж строя курсантаў. На адыходзе тэатральна ўзняў руку і ўсклікнуў:

— Салдаты! Я споўніў свой доўг, цяпер споўніце вы свой!

Камандзір узвода курсантаў, малады падпаручнік, зняў з галавы каску і выкрыкнуў у адказ:

— Пане прэзідэнце! — Да апошняй кроплі крыві! Калі Пілсудскі падышоў угаворваць курсантаў, каб яны прапусцілі яго войска ў Варшаву, падпаручнік скамандаваў: «Узвод, зараджай!»

— Што гэта, дзіця маё? У мяне будзеш страляць? — прыкінуўся здзіўленым маршал.

— Неадменна так, пане маршалку! Маю загад пана прэзідэнта. Яшчэ адзін крок і скамандую — агонь!

Тады Пілсудскі жэстам патрыярха звярнуўся да ўсіх курсантаў:

— Дзеткі, ці ж вы не прапусціце мяне?

— Не, пане маршалку!

Пілсудскі памкнуўся да моставага апірышча, абапёрся, пастаяў.

І ад'ехаў аўтамабілем на Прагу, у казармы 36-га палка. Там упаў на канапу ў стане глыбокай псіхічнай дэпрэсіі. Такое здаралася з маршалам неаднойчы. Прыбліжаныя ведалі гэтую слабіну, таму генерал Орліч-Дрэшар узяўся на сваю руку дзейнічаць за Пілсудскага — ад яго імя.

Першым пунктам у тактычных планах мяцежнікаў быў захоп Бельведэра, палаца прэзідэнта рэспублікі — сімвалічнага цэнтра заканадаўчай улады, той млявай парламенцкай дэмакратыі, на якую, па думцы Пілсудскага, смяротна захварэла Рэч Паспалітая.

Вайскоўцы ноччу ўзялі мост Панятоўскага, на якім быў пакінуты толькі адзін узвод таго падпаручніка, штурмам быў узят Бельведэр. Прэзідэнт уцёк і ўжо недзе за межамі сталіцы адрокся ад улады, жадаючы спыніць братазабойчую вайну. У баях на вуліцах сталіцы 12 і 13 мая загінула некалькі соцень чалавек, у тым ліку шмат цывільных.

Лёс узброенага канфлікту ўрэшце вырашыўся. Рабочыя-чыгуначнікі адмовіліся перавозіць войскі для абароны кансерватыўнага ўрада. Нават апазіцыйныя Пілсудскаму генералы не дужа рваліся выконваць распараджэнні ўрада. Самы значны антаганіст маршала генерал Сікорскі, якога панізілі з міністра да камандуючага Львоўскай акругі, не рупіўся паслаць падпарадкаваныя яму войскі ў сталіцу, спасылаючыся на забастоўкі чыгуначнікаў ды і на «неспакой» на савецка-польскай граніцы.

Падзеі вялікай палітыкі даходзілі на Палессе прыпозненымі і абрслымі ў здагадкі і дасужыя каментарыі. Скласці больш-менш матываваны сюжэт майскага перавароту Юрку Пружанскаму ўдалося толькі на падставе інфармацый, якія ён атрымаў у часе выклікаў на нарады і пасяджэнні сакратарыята ЦК у Варшаве. Там многае давялося чуць наўпрост з вуснаў прамых сведкаў. Асабліва добра інфармаваным у вайсковых таямніцах перавароту і персанальных ролях афіцэраў аказаўся Шайкоўскі, рухавы паднолынчык, які нядаўна адслужыў належныя яму два гады ў

войску і цяпер займаў пасаду загадчыка аддзела ЦК КПЗБ па рабоце ў арміі.

Шайкоўскі з дакладнасцю кадравіка ведаў заслугі і пралікі кожнага ўдзельніка путча. Дыктатар мог бы яму даручыць складанне ўзнагародных лістоў на сваіх падручных, бо гэта ж, па сутнасці, негатывы лістоў абвінавачання, якія складаў падпольшчык.

Найбольш прыкрасці прынесла Юрку Пружанскаму тое, што ў часе крытыкі майскіх памылак ізноў нарушылася цяжка заваяванае адзінства ў партыі. На надзвычайным пленуме 31 мая кіраўніцтва партыі ўзначаліў відны дзеяч падполля Юльян Ляшчынскі (Ленскі). Юрка, як работнік апарата ЦК, слухаў Ленскага на IV Канферэнцыі КПП, чытаў яго артыкулы, напісаныя за мяжой. Гэтага было мала, таму трывога ўзмацнялася ў яго адчуваннем персанальнай няяснасці. Жыў Ленскі пераважна ў замежных цэнтрах кіравання рэвалюцыйным рухам, якія стварала КПП, каб захаваць кіруючыя кадры ад рэпрэсій.

Суцяшалі весткі з раёнаў. Сярод камуністаў Піншчыны не здарылася неабачлівых захапленняў Пілсудскім і пілсудчыкамі. Нават у тэксце памылковай адозвы ЦК КПП, што выйшла ў час пік, тутэйшыя нізавыя работнікі падполля вылучылі заключную фразу: «Ведайце, рабочыя, што нашы мэты ідуць далей, чым мэты пілсудчыкаў»[8]

Не разумелі радавыя падпольшчыкі і пускалі міма вушэй тую мясціну, дзе выступленні пілсудчыкаў разглядаліся як барацьба салдацкіх мас супраць рэакцыйнага ўрада. Вопыт падказваў простым працаўнікам, што салдаты, уведзеныя ў зман прапагандай пілсудчыкаў, не маглі на той час актыўна ўдзельнічаць у рэвалюцыйным руху.

Юрка пачынаў дапытваць сябе, як бы паставіўся да выбуху антыўрадавых хваляванняў, каб сам быў на тую пару ў Варшаве. Памылкі ж дапусцілі ў асноўным члены ЦК КПП, і Юрка адчуваў міжвольную віну. Адганяў яе, вышукваючы складанасці моманту, заблытанасці падзей, да ацэнкі якіх яму цяжка было прыстасаваць марксісцкія крытэрыі.

---

[8] Цыт. па кн.: Olgierd Terlecki. «Krytyczny maj>.— Życie literackie, №. 1418

У пастанове пленум ЦК ацэньваў пілсудчыну як форму дыктатуры польскай буржуазіі і абшарнікаў. Такая ацэнка давала ясныя арыенціры для работы ў масах. І што было дарага — арыенціры супалі з класавым адчуваннем працоўных мас.

Скарыстаўшы стан палітычнай замятні ў эшалоне буржуазнай улады, заходнебеларускія камуністы ўмацавалі сувязі з масамі цераз адзіныя дзеянні з рэвалюцыйнымі дэмакратамі. Грамадскасць была парушана нечаканасцю: за некалькі месяцаў 1926 года радыкальны пасольскі клуб Грамады на чале з Браніславам Тарашкевічам здолеў арганізаваць Беларускую сялянска-рабочую грамаду — масавую, пераважна сялянскую рэвалюцыйна-дэмакратычную арганізацыю, якая колькасна абагнала ўсе лева-дэмакратычныя сялянскія партыі ў Заходняй Еўропе. Гэта быў плён мэтанакіраванай дзейнасці камуністаў у рэвалюцыйным падполлі ў Заходняй Беларусі. Патрэбна было ўмацоўваць партыйнае кіраўніцтва масавай барацьбой працоўных. У гэтым напрамку і дзейнічалі камуністы на месцах, нягледзячы на фракцыйную рознагалосіцу сярод кіраўніцтва камуністычнага падполля і парахунка паміж асобнымі работнікамі.

У Пінску Юрка Пружанскі скантактаваўся з новым сакратаром акружкома КПЗБ — Розай. Гэтую падпольшчыцу ён запамятаў яшчэ з Масквы, дзе яна, выпускніца партыйнай школы ЦК КПЗБ, прысутнічала на ІІІ Канферэнцыі КПЗБ. Гэтая высокая, каратка пастрыжаная шатэнка, паставай і размашыстай манерай рухаў нагадвала спартсменку. Юрка спрабаваў нават загаварыць з ёю, але Роза аказалася негаваркой, замкнулася, можа, падумала, што адказныя таварышы выпрабоўваюць яе ўменне канспіраваць сябе.

Цяпер, у Пінску, на кватэры Роза гаварыла з ім як з прадстаўніком ЦК — даверліва. Жыла яна пад прозвішчам Берты Сапірштэйн. Падрабязна, наколькі дазваляла традыцыя падполля, далажыла Юрку пра справы Пінскага акружкома, узначаліць які пасłалі Розу неўзабаве пасля ІІІ Пленума.

Пінская акруга была вялікай, складалася з трынаццаці раёнаў, у якіх налічвалася па некалькі дзесяткаў камуністаў і камсамольцаў. Сувязь паміж глыбіннымі партячэйкамі была не дужа спраўнай з-за благіх дарог. Асабліва вясною і восенню многія населеныя пунктьх былі амаль недаступныя. Для канспірацыі гэта было добра, а для аператыўнай работы,

каардынацыі дзеянняў — блага. Многа часу ў сакратара аднімалі паездкі ў глыбінку, застаць Розу на месцы, у Пінску, было няпроста. У свой першы прыезд Юрка прасядзеў некалькі дзён на явачнай кватэры, чакаючы сустрэчы. Нават вырашыў ужо махнуць у Бярозу ды пабачыць бацькоў. Але Роза нарэшце з'явілася, уся здарожаная так, што Юрка не стаў яе ўшчуваць за сваё чаканне.

Вузлавым раёнам Пінскай акругі быў Дубровіцкі. Тут захаваліся традыцыі вядомага ў гэтым краі Дубровіцкага паўстання 1918 года, калі мясцовыя рэвалюцыйныя сілы парываліся ўстанавіць у раёне Савецкую ўладу. Былыя паўстанцы складалі цяпер ядро партыйнай арганізацыі. Яна была самая вялікая ў акрузе, мела больш як 70 членаў, партыйныя ячэйкі размешчаны планава, як сказаў бы Стэфан Мертэнс, у стратэгічных пунктах апоры праціўніка — на лесазаводзе ў Дубровіцы, на каменяломнях у Клёсаве, на шклозаводзе ў Ракітне, моцная і актыўная партыйная група сялян дзейнічала ў Вісоцку. Камуністы здабылі аўтарытэт у масах і шырока праводзілі масавыя акцыі: урачыстыя святкаванні рэвалюцыйных дат — масоўкі, вечарыны, вывешванне транспарантаў і чырвоных сцягоў. Ад насельніцтва раёна паступала багата ахвяраванняў на МОПР. Камуністы і «сімпатыкі» збіралі грошы, прадукты, адзенне ды адпраўлялі проста ў турэмныя камуны. Праходзілі мнагалюдныя мітынгі за вызваленне палітзняволеных.

Сакратар акружкома добра ведала становішча ў акрузе; не толькі Дубровіцкі, а і многія іншыя раёны абхадзіла асабіста, пазнаёмілася з кіраўніцтвам, ведала моцныя і слабыя бакі падначаленых. Альшэўскаму спадабалася яе кампетэнтнасць, бо зыходзіла яна не са службовага педантызму і не з простай жаночай цікаўнасці, а з любові да справы і жадання вызваляць край балот ад зморы пасіўнасці, ад забітасці і панылага мадзення.

— Нават мне, прывыкшай бачыць гарадскую нэндзу,— гаварыла Роза,— калі пачала знаёміцца з палескай глухаманню, проста не верылася, што можа існаваць яшчэ такая адсталасць дапатопная. Зайшла я неяк да аднаго нашага сакратара ячэйкі — не важна ў якім раёне. А ён захацеў пачаставаць мяне вячэраю святочнаю — госць жа ў хаце. І чым жа ён частаваў? Гаспадыня запаліла печ, потым памыла і выскрабла нажом

стол. І давай пячы блінцы. Без тлушчу. Толькі патэльню намажа нейкай скваркай і ліе рошчыну. Спячэ скавароду аладачак і выкідвае — проста на стол. А дзеці ўжо сядзяць наўкруг і вачэй не зводзяць з аладак, цягнуцца ручкамі. Для іх гэта самы вялікі ласунак. Цукеркі, як пераканалася, ніколі ў вочы не бачылі, цукру не каштавалі. Галодныя, худыя, абарваныя — страх! У Беластоку самая ўжо адпетая галота і то... А тут маці забараніла браць аладкі: пакідае для госці, гэта для мяне. Гаспадар жа недзе выйшаў і прапаў. Я ўжо стала непакоіцца. Нарэшце з'явіўся хазяін з нейкай чаропкай у руцэ — была гэта ніжняя частка адбітага збана. У ёй пазычаная смятана. Гаспадар рады, заве вячэраць. Усе паселі вакол стала, блінцы бяруць проста рукамі ды макаюць у тую чаропку, потым, цмокаючы, ядуць.

Вось якая святочная вячэра была!.. Аказалася, што ў хаце, акрамя гаршка, глінянай місы і драўляных лыжак, не было ніякага посуду...

А колькі я наглядзелася па вёсках людзей хворых на туберкулёз, трахому, колькі караслівых, каўтунаватых. Здаралася ў такіх мясцінах бываць, куды можна дабрацца староннямy чалавеку толькі раз на тыдзень, у нядзельку. Кругом балоты непралазныя. Адна ўсяго сцежка па кладках. На цэлы тыдзень памост з кладак здымаюць, а ў нядзелю жыхары насцілаюць дошкі і так выбіраюцца ў свет. Нават да суседа буднім днём не надта дабярэшся. Жывуць у сваіх хатах, як у «ізалятках». Гаруюць на балотах, пасевы вымакаюць, бульба — таксама. І не асушыць ім гэтых балот. Ніколі не асушыць пры гэтым ладзе. А панам што — экзотыка. Дзікае Палессе! Як дзікія прэрыі... Паляваць на зіму прыязджаюць.

Але пачынаюць, як бачыце, таварыш Пружанскі, разумець тое-сёе і палешукі. Смялейшыя да нас ідуць, у партыю. І людзі з іх надзейныя, сумленныя. За гэта паважаю. Тут бяспечней, чым у горадзе, працуецца. Будзьце спакойны. Тут не Вільна, ніхто покуль што за вамі сачыць не будзе. Затойцеся, разглядзіцеся і пачняце тут, у Пінску, дзейнічаць.

Роза расказала пра фантастычную рэч — утварэнне Чапаеўскага райкома непадалёку ад Пінска, у Купяцічах.

Вёска Купяцічы — вядомая з часоў сялянска-казацкіх войнаў. Быў тут моцны бастыён нацыянальна-вызваленчага руху праваслаўных беларусаў. Манастыр меў «цудоўны абраз» богамаці Купяціцкай, сюды сцягваліся багамольцы з паўсвету.

Гэта для рэстаўрацыі храма і манастыра адправіўся з Купяціч у падарожжа да цара маскоўскага Міхаіла фанатычны манах Афанасій Філіповіч, змагар за свабоду веры, аўтар славутага «Дыярыуша». З гэтых мясцін паходзіў вядомы рэвалюцыянер-дэмакрат і беларускі паэт Франц Савіч. Тут, у маладыя гады, працаваў настаўнікам народны пісьменнік Якуб Колас. Шанцавала на знакамітасці.

У першую сусветную вайну вёска апынулася ў зоне баявых дзеянняў і была спалена датла. Жыхары падаліся ў бежанцы ў глыб Расіі. Трымаліся і там гуртам. Нават купяціцкія франтавікі ўмелі гуртавацца. Вялікаю групай добраахвотна ўступілі яны ў дывізію Чапаева і прайшлі слаўны шлях па франтах грамадзянскай вайны. Вярнуўшыся на радзіму, былыя чапаеўцы ўтварылі партыйную арганізацыю, якая стала базавай для райкома, а райком назвалі Чапаеўскім. Людзі ў Купяцічах яшчэ не адбудавалі сваіх спаленых паселішч, гаравалі ў зямлянках. Але камуністы дзейнічалі. Кіраваў імі былы чапаевец Аляксандр Малец.

Расказала Роза Анатолю і пра цяжкасці. Усё, не таячыся. Цяжкасці бывалі такімі ж сур'ёзнымі, як і поспехі. Даймада Розу як асабістая ганьба тое, што на запалкавай фабрыцы — самым буйным прадпрыемстве Пінска — да апошняга часу не было партыйнай ячэйкі. Рабочыя трапілі пад уплыў Бунда і ППС. Толькі нядаўна ўдалося накіраваць туды вопытнага падпольнчыка. Уладкагаўся рабочым. І пачынае ўжо варушыць справу, ператтвараць «чырвоную фракцыю» — групу, што сімпатызуе камунізму — у партыйную арганізацыю.

Хітра наступала на налешукоў польская рэакцыя, выкарыстоўваючы нястачу палітычнай свядомасці ў пэўнай часткі насельніцтва. Нават рабочых стараліся залыгаць у ППС ці «Вызваленне» і асіміляваць палешукоў, апалячыць. ППС выдавала ў Лунінцы газетку з назваю, аналагічнаю назве цэнтральнага органа КПЗБ — «Czerwony sztandar» («Чырвоны сцяг»), а плакаты друкавала на чырвонай паперы, падыгрывала на сімвалах. Трох дэпутатаў сваіх правялі пэпэсаўцы ў сейм. А камуністы і нацыянальна-вызваленчыя беларускія арганізацыі не паспелі яшчэ правесці ніводнага. Палессе толькі-толькі раскалыхваецца. Трэба будзіць край, не аддаць праціўніку.

Супраць Пілсудскага пайшлі левыя сілы нацыянальна-вызваленчага руху, дзе была ў памяці яго езуіцкая выкрутнасць

у адносінах да «беларускай справы». Браніслаў Тарашкевіч у сеймавай прамове сказаў: «Мы маем папросту незамаскаваную вайсковую дыктатуру». І растлумачыў: «Хоць не ўсё яшчэ ў гэтай дыктатуры Пілсудскага выкрышталізавалася, але ўсё выразней выступае яе фашысцкая сутнасць» 9. Рэвалюцыйны патрыятызм Тарашкевіча аказаўся ў гэтым выпадку добрым компасам для арыентацыі ў заблытанай палітычнай сітуацыі. Дзеячы Грамады якраз скарысталі ўрадавы крызіс і барацьбу за ўладу ў вярхах для таго, каб разгарнуць масавы вызваленчы рух: дабіліся ад улад зацвярджэння статута Грамады і раскруцілі кола арганізацыйнай работы да нябачаных хуткасцей. У канцы года Грамада разраслася да ста тысяч чалавек і перакрыла колькасна ўсе сялянскія радыкальныя партыі ў краінах Еўропы.

Майскія падзеі 1926 года і «майскія памылкі» сталі ўрокам для кіруючага актыву Кампартыі Польшчы і Заходняй Беларусі. Альшэўскі, апынуўшыся перад тварам гэтых падзей, мог зразумець, што значыць у палітыцы вопыт, прафесіяналізм. А яшчэ і інтуітыўнае ўяўленне, класавы інстынкт... Ездзячы па глыбінных раёнах, сутыкаючыся з радавымі камуністамі, ён з радасцю адзначаў класавую зоркасць сялян і рабочых. Камуністы падтрымлівалі Грамаду, якая на здзіўленне лёгка адваёўвала масы сялян ад польскай правасялянскай партыі «Вызваленне». Цяжэй было змагацца за тых працоўных, што трапілі пад уплыў польскіх сацыялістаў з ППС і асабліва яўрэйскага Бунда. Рабочыя-пэпээсаўцы верылі Пілсудскаму, і ад «дзядка», які сам у маладосці быў лідэрам нацыяналістычнага крыла гэтай партыі, спадзяваліся радыкальных перамен. Вера перадавалася ад палякаў некаторым беларусам. У бундаўцаў быў свой ахоўны панцыр — векавыя звычкі кагальнай замкнёнасці. Кіраўнікі Бунда ігралі на пачуццях адвечнага недаверу яўрэяў да «гояў». Забабоны гэтыя жылі ў асяроддзі рамеснікаў і дробных гандляроў — той драбноты, якая недзе нябачнымі гранямі сутыкалася з масай рабочых, аблеплівала рабочыя гуртаванні, як аблепліваюць ракавінкі днішча карабля, робячы яго непаваротлівым, груваспкім.

---

[9] ***Цыт. па кн.:* A. Bergman. *„Bronisław Taraszkiewicz”, Warszawa,* 1977, s. 118.**

Тут, у раёнах Дубровіцы, Сарнаў, Лунінца і на каменяломнях у Клёсаве, дзейнічалі арганізацыі ППС. Рабочых-пэпээсаўцаў, сярод якіх было шмат беларусаў, утрымлівала ў гурце пагроза, што ішла ад нацыяналістычных украінскіх тэрарыстаў. Адарваць рабочых ад ППС магла толькі рэвалюцыйная арганізацыя, якая дала б ім адчуванне сілы, згуртаванасці. Такою арганізацыяй пад кіраўніцтвам камуністаў стала Грамада.

Майскі пераварот падказаў працоўным Заходняй Беларусі думку пра хісткасць інстытута ўлады ў Польшчы.

У час прыліву нацыянальна-вызваленчай хвалі Роза так уцягнулася ў масавы рух, што, ездзячы ў глыбінку, часам парушала статус кіруючага работніка яе рангу ды сама выступала на сходах сялян, растлумачвала, што дасць ім, прыгнечаным, свая партыя, заклікала ўтвараць гурткі Грамады. Яна ўвахоцзіла ў азарт, радавалася, што пасля яе выступленняў сяляне запісваліся ў партыю. Роза адчувала роднасць з гэтымі абуджанымі і далучанымі да грамадскага жыцця палешукамі, яе кранала іхняя шчырасць, дзіцячая эмацыянальная адкрытасць. Уночы, бывала, калі падпольшчыцу адвозілі на лодцы, хлопцы-перавозчыкі спявалі свае мясцовыя песні. І было ў гэтых спевах нешта такое кранаючае, як подых ветрыку ці плёскат хваль. Роза не прызнавалася Юрку Пружанскаму, што дазваляла сабе парушаць жалезныя правілы падполля, паводле якіх кіруючым работнікам акруговага і цэнтральнага звяна забаранялася выступаць публічна на адкрытых сходах і мітынгах. Але вось ён сам даведаўся пра гэта і катэгарычна патрабаваў пакончыць з такою практыкай. Юрка і сам марыў трапіць на вялікі сход, пачуць голас нізоў, а не толькі дыскусіі на нарадах актыву. Хацелася пабачыць, як яна выглядае, адкрытая барацьба за душу рабочага, за шматмільённага творцу гісторыі.

І тут Роза з Юркам мяняліся ролямі. Па звычцы кіраўніка яна адчувала асабістую адказнасць за бяспеку кіруючага работніка. Так і цяпер, прыйшоўшы на яго падпольную кватэру, Роза спрабавала адгаварыць Юрку не выязджаць у Дубровіцкую зону. Знарок згушчала фарбы, ускладняла абстаноўку. Юрка насцярожыўся, падумаў, але застаўся пры сваім намеры. Роза стала прасіць не рабіць ёй

прыкрасці, бо калі даведаюцца ў ЦК, што яна патурае парушэнню рэжыму канспірацыі, то пакараюць яе. Гэты аргумент падзейнічаў. Юрка абяцаў не выступаць, а толькі прысутнічаць на рабочым сходзе.

— Уся адказнасць спадзе на члена ЦК,— цвёрда адказаў паўжартам ён і дадаў бадзёра: — Смеласць гарады бярэ! А нам трэба ўзяць і разбурыць нябачную для вока крэпасць — гэта веру рабочых у ППС, сялян — у «Вызваленне», адным словам, разбіць ілюзіі наконт дабрадзейства згодніцкіх сіл. Каб гэтага дасягнуць, нам, кіраўнікам, трэба ўсё бачыць сваімі вачыма. Рушым наперад! Адказваю я!

На падпольныя сустрэчы хадзілі яны заўжды строга па правілах канспірацыі: Роза — наперадзе, а ён метраў на сто—дзвесце за ёю, не спускаючы з яе вока. Часам Юрка пацяшаўся з Розінай педантычнай павагі да правілаў. Калі, бывала, яны аныналіся на прастаполіцы, дзе не было ні жывой душы, ён наганяў Розу і знянацку падхопліваў пад ручку. Яна ўхілялася, злавала, карала яго маўчаннем, а калі і гэта не дзейнічала — проста вырывалася. Ён пачынаў цвеліцца, папракаў Розу за скнарыстасць: вось і фурманкі наняць паскупілася, прадстаўнік ЦК вымушаны пешаком топаць, гразюку палескую мясіць... Тут Роза не вытрымлівала і яго ж спосабам пачынала бараніцца: «Нагам цяжка, затое галава бяспечная, душа на месцы, у пяткі не лезе... А партыйныя грошы — дарагія. Эканоміць іх не сорам. Давайце, таварыш Пружанскі, на свае месца. Не дурэй, таварыш...»

Розіны разважанні пра эканомію проста расчульвалі яго: за постаццю строгай падпольшчыцы, кіруючага работніка, ён раптам прыкмячаў дбайную і рупную гаспадыню. Параўноўваў Розу з Верай: «Яны розныя, розныя... Кожная на свой лад. Да Веры зборлівасць, эканомнасць не падыходзіць».

Гэтым разам яны паехалі цягніком, спыніліся на явачнай кватэры ў дагледжаным доміку нейкага пенсіянера, разведалі абстаноўку і на змярканні пайшлі ў клуб пад ручку, як маладая пара. Роза аглядалася, правярала, ці не вядуць за сабою «хваста», гэта значыць, тайнага агента паліцыі.

Сход ужо быў у разгары. Прыслухаўшыся да спрэчак, Юрка міжвольна памкнуўся ўзяць слова. Але Роза рашуча схапіла яго за руку. Ён паслухаўся.

Юрка не ведаў дакладна, у чым сакрэт яго ўменне ўздзейнічаць на размоўцаў. Аднойчы ў жартлівай размоўцы Роза сказала, што сакрэт у яго манеры трымацца, у элегантнасці. Юрка прыняў гэта за дакор, хоць адчуваў, што была ў яе думках скрытая сімпатыя. Апранацца з густам Юрка сапраўды любіў і ўмеў, а трымацца раскавана прывык з Арзамаса. Белая кашуля, модны яскравы гальштук, завязаны крыху нядбала і запраўлены ў разрэз дабротнага, грубай вязкі джэмпера — усё гэта поруч з акуратнаю прычоскай на прабор, замацаванаю брыльянцінам, рабіла ўражанне забяспечанага, удачлівага дзелавога чалавека або прэстыжнага інтэлігента свабоднай прафесіі са сталаю кліентурай — такому мусіш давяраць і верыць. Але падпольшчыкаў ён пераконваў не знешнасцю і не манерамі, а прафесійным веданнем логікі палітычнага жыцця, закулісных спраў санацыйнай эліты ўлады, якая здолела напусціць туман надкласавай місіі, лёсавага прызвання маршала і яго верных палкоўнікаў. Юрка любіў агітаваць.

Прысутнасць соцень людзей у адным месцы, з адной нейкаю мэтай стварае ўзбуджаны настрой: «Мы сышліся!» Ужо тое, што кожны кінуў свае штодзённыя справы і абавязкі, каб сустрэцца, настройвае, узрушае. І варта ў такіх выпадках узысці на трыбуну і сказаць патрэбнае слова, як зала адзавецца магутным рэхам, сход стане рэзанатарам, які, нібы цудоўнае рэха, перадасць і верне прамоўцы яшчэ больш трапнае слова. Вера далучыла Анатоля да таямніц псіхалогіі сходаў: там часта высокі шчымлівы настрой могуць выклікаць нават няўмелыя прамовы, выклікаць голаю шчырасцю. Важна, каб сход прызнаў недалужнага прамоўцу сваім. Вера цаніла прамоўніцкае ўмельства, а сакрэт поспехаў бачыла ў тым, каб чуць унутраным слыхам думкі грамады і выказваць іх гучна, пераканальна, упэўнена. Тады сход ператворыцца ў цудоўнае відовішча, хвалюючы акт яднання душ.

У самы разгар спрэчак на памяшканне наляцела паліцыя. І калі Юрку здавалася: вось ён і падпадзе пад Верын праклён, у зале пагасла святло, упоцемках паднялася тузаніна, рабочыя не давалі паліцэйскім прабіцца да трыбуны. Покуль ахоўнікі замянілі перапаленыя засцерагальнікі, Роза вывела яго патайным ходам на волю. Ізноў выйшла ўдача, не хацелася толькі ставіць яе ў той магічны ланцужок, дзе «да трох разоў

штука». І ён прыгадваў чыюсьці філасофскую сентэнцыю: «Што ж такое ўдача, калі не мноства няўдач, якія не здзейсніліся?» Пры чым тут «траістая» магія?.. Няўлоўнасць ажно да самай перамогі!

Яны мчаліся на канспіратыўную кватэру подбегам, без аглядкі. Юрка абхапіў Розу за талію, і было і прыемна адчуваць пад рукой пругкасць яе моцнага цела спартсменкі. Праўда, Роза на ляту ўхапіла яго за руку і, вызваліўшыся з абдымкаў, вырвалася наперад, ведучы яго за сабой па завулках соннага гарадка. Рука ў яе была сухая і цёплая. Моцная рука. Задыханыя, яны прымчаліся да гаспадароў. Усю ноч прагаварылі, не могучы ахалонець ад уражанняў вечара.

Роза працавала з той жа ахвярнасцю і руплівасцю, на якую здольны валявыя жанчыны.

Была яна высокай стройнай шатэнкай з вялікімі вачамі, задуменнасць якіх не пасавала да размашыстай манеры рухаў. Роза была адной з тых яўрэйскіх гарадскіх дзяўчат, што прынялі марксізм і рэвалюцыю фанатычна. У рэвалюцыйных сябрынах яўрэйская моладзь сустракала поўнае адмаўленне той удушлівай кагальнасці, рабамі і ахвярамі якой былі іх продкі. Тут панавала свабода і роўнасць, тут жыла павага да людзей свайго класа, тут было адмаўленне расавай дыскрымінацыі. І вось такія, як яна, пачалі прабіваць кланавыя бар'еры, выгадныя сіяністам і бундаўцам. Сутычкі з сіяністамі, што прыязджалі з Варшавы ў Пінск чытаць лекцыі, ператвараліся ў публічныя скандалы. Аднаго неабачлівага прамоўцу слухачы літаральна аплявалі і выгналі з залы. У справу ўмяшалася паліцыя. Юрка не хадзіў на сустрэчы з рабочымі-яўрэямі. Роза мела для работы з імі адмыслова падрыхтаваных людзей.

Пасля гэтай прыгоды на рабочым сходзе, наладжаным пэпээсаўцамі, Юрка з Розай рашылі паслаць і на каменяломні ў Клёсава свайго чалавека са спецыяльным заданнем. Гэтае заданне атрымала і выдатна выканала Праскоўя Дзмітрук.

Небяспека радніла Юрку з Розай. Шчымлівыя адчуванні наведвалі яго: аказвалася, хоць жылі яны на розных канцах свету, было ў іх юначых дарогах многа падобнага. Роза нагадвала яму часам то родную сястру Зою, то энергічную Іду Сегаль, якой ён употай сімпатызаваў у Арзамасе. Усё, пра што б ні расказвала Роза, а гаварыла яна пра сябе стрымана, нібы

саромелася даць волю словам, усё недасказанае ён дамысліваў, падстаўляючы пачутае ў рэчышча свайго вопыту. Калі ў Беластоку на кароткі час перамагла Савецкая ўлада, Роза пачала наведваць марксісцкі гурток, які вёў стары рэвалюцыянер Брумер. Яе сябры ішлі тады добраахвотнікамі ў Чырвоную Армію, а старэйшы брат Макс стаў вядомым у горадзе бальшавіком. Яго рэпутацыя пераходзіла і на Розу. У 1920 годзе яна стала завадатарам выхаду на першамайскую дэманстрацыю групы вучаніц. Далучыла Роза сваіх сябровак да калоны рабочых. Назаўтра дырэктар аб'явіў аб выключэнні яе са школы, але за дзяўчыну заступіліся настаўнікі.

Пасля школы Роза працавала ў кравецкай майстэрні. І калі яна расказвала Юрку пра той перыяд жыцця, ён бачыў у думках кравецкія арцелі Арзамаса. Розніца была хіба тая, што ў Беластоку тады не дзейнічаў закон Савецкай улады аб ахове працы падлеткаў.

Імпанавала Юрку, што Роза была сведкам гістарычных падзей. Ёй можна было пазайздросціць, калі яна прыгадвала пра памятны дзень 30 ліпеня 1920 года. На майдане палаца Браніцкіх сабралася маса народу, выступалі тады члены часовага рэвалюцыйнага ўрада Польшчы — Юльян Мархлеўскі, Фелікс Дзяржынскі і Фелікс Кон — пад няспынныя воплескі, воклічы «ўра!». Роза праціснулася з сяброўкамі да самага балкона, з якога прамаўлялі дзеячы. Яна запамятала іх выгляд, жэсты, словы.

Юрка з нейкім жалем перабіраў у думках свой 1920 год: вучоба ў камвузе, хвароба, пераезд на Пружаншчыну, адступленне. Усё гэта было незвычайна цяжкім, але не такім значным, як тое, што пабачыла Роза ў Беластоку. Сама яна вырастала ў яго вачах, здавалася таямнічай, хоць па натуры была яна проста вельмі спраўнай, акуратнай, як добрая краўчыха, работніцай падполля.

З прыходам белапалякаў камсамольская ячэйка, якою кіравала Роза, перайшла ў падполле. Агітпроп наладзіў тайную камсамольскую вучобу. Сходкі адбываліся ў доме Цыгельніцкіх. Маці Розы брала на сябе ролю дазорнага. Яна пераходзіла на другі бок вуліцы пад могільнік, там перахоплівала якую-небудзь знаёмую кабеціну, бавіла яе размовай, а сама прыглядалася,

сачыла, каб не паказаўся часам паліцыянт або яшчэ горш — «тайняк».

Грамадскія веды, пачэрпнутыя ў гуртку, Роза перадавала сяброўкам, членам маладзёжнай секцыі прафсаюза «Ігла». Старшынёю гэтага прафсаюза быў яе брат Макс. У юнацкай секцыі «Іглы» былі гурткі мастацкай самадзейнасці: тэатральны, харавы, чытальнікаў. Гурткоўцы ладзілі ў рабочым клубе на Ліпавай вуліцы вечары, ставілі п'есы. Швейнікі выступалі і ў клубе прафсаюза будаўнікоў, дзе былі амаль адны мужчыны. Роза любіла дэкламаваць вершы рэвалюцыйных паэтаў. Захоплена ўспамінала яна пра маёўкі за горадам, у лесе. Небяспека трапіць у рукі паліцыі рабіла гэтыя сустрэчы панаднымі, юныя ўдзельнікі выпрабоўвалі сваю смеласць.

Усё гэта Анатоль вельмі жыва ўяўляў, расквечваў у думках скупы расказ Розы і бачыў нейкі вельмі блізкі варыянт уласнай біяграфіі, хоць Роза запэўнівала, што яго маладосць была багацейшая на ўражанні, падзеі і справы.

– А ведаеш,— гаварыла Роза аднойчы,— быў у мяне такі выпадак, калі я вельмі табе зайздросціла, што ты жыў у Саветах. Зайздросціла, не знаўшы цябе. Бывае такое? Недзе ў пачатку 20-х гадоў мы вялі ў Беластоку барацьбу за яўрэйскую рабочую моладзь, ваявалі з бундаўцамі, паалейцыяністамі і іншымі згодніцкімі рэакцыйнымі групоўкамі. Бунд поўнасцю гаспадарыў у школе рабочай моладзі. Мы паслалі туды сваіх камсамольцаў, яны пазапісваліся вучнямі і пачалі агітаваць. Дырэкцыя школы напалохалася і выключыла нашых са спісу вучняў. Мы паслалі новых. І так ішла барацьба, змяняліся нашы каманды... Мы стараліся вызываць рабочых на дыскусіі. І я туды хадзіла не раз па заданню — спрачалася. Дык вось, памятаю, разгарэлася спрэчка пра жыццё савецкай моладзі. Я ім расказвала, якія даброты дала Савецкая ўлада рабочай моладзі, а мне пытанне:

– Ты там была? Ты бачыла, што яны бясплатна вучацца?

Засыпалі мяне пытаннямі, проста да муру прыціснулі. Не скажу ж я, што была. Калі б была, то магла б і сарвацца, сказаць. Хоць лепш не быць, чым такое сказаць! О, хіба можна? Але так мяне прыціснулі, так насядалі, што я збянтэжылася.

— А трэба было,— умяшаўся Юрка,— сказаць: «Была ў сне!» Так як Дантэ ў пекле.

— Ну, што ты, жартуеш?.. Мы, каб здабыць у рабочай моладзі давер, ішлі на курсы крою і шытва, арганізаваныя паалейцыяністамі. Я таксама шэсць месяцаў правучылася. Усё выкрывалі згодніцкую тактыку іх кіраўніцтва. І дабіліся свайго. Моладзь наогул не зносіць згодніцтва. Толькі трэба выкрыць. Бо згодніцтва ж заўсёды замаскіравана…

— То добра, што ты да таго часу не была ў Саветах, а то б, глядзі, сама сябе і выдала.

— Ну! — сумелася Роза,— я б гэтага не зрабіла. Я толькі так, на словах. Загаварылася я з табой, таварыш Юрка. Пара мне ісці.

Школай рэвалюцыйнага прафесіяналізму стала для Розы работа ў падпольнай «тэхніцы». Яшчэ ў 1922 годзе сакратар Беластоцкага гаркома, стары рабочы-гарбар, таварыш Мілер даручыў такой зусім маладой весці гарадскую партыйную «тэхніку». Гэта была вельмі адказная ў падполлі служба, яна забяспечвала рух людзей і матэрыяльных каштоўнасцей. «Тэхніка» звязвала кіруючыя органы з нізавымі арганізацыямі, рассылала цераз ганцоў літаратуру, забяспечвала надзейнымі кватэрамі прафесійных рэвалюцыянераў, памяшканнямі для сходаў і нарад, нарэшце, «пераводзіла» па рашэнню падполля работнікаў «засыпаных» і персанальна праследуемых паліцыяй — за мяжу.

На Млынавую вуліцу, у дом нумар 22 стыхійна сходзіліся камсамольцы і камуністы, тут спраўлялі розныя справункі — ад кантактаў з патрэбнымі людзьмі да начлегаў і днёвак у бяспечных кватэрах. Роза стала весці «тэхніку» ў маштабах горада. Работа яе ўцягвала. Асабліва прыемна было размяркоўваць па ячэйках нелегальную літаратуру: масу газет, лістовак, брашур на беларускай, польскай, яўрэйскай мовах. І самой было цікава пачытаць гэтыя адозвы, грозныя, як дынаміт. Сама Роза не мела дару красамоўства, таму вельмі шанавала людзей, адораных сілай слова. І Анатоль Альшэўскі ў яе вачах быў такім выключным чалавекам.

За работнікамі «тэхнікі» паліцыя ганялася з асаблівай зацятасцю, бачыла ў іх самых небяспечных злачынцаў і звычайна старалася выдаць суду за «платных агентаў Масквы». Неўзабаве Розе давялося пакінуць і дом на Млынавай, выехаць

у мястэчка Ясіноўку — цэнтр гарбарскай прамысловасці Беласточчыны. Там яна рыхтавала першую ў сваім жыцці стачку гарбароў на заводзе пана Мінскага. Фабрыкант праведаў пра дзейнасць прыезджай дзяўчыны і напусціў на яе паліцыю. Беластоцкі акругком спешна перакінуў Розу ў Гродна. У канцы 1923 года яна стала працаваць у цэнтральнай тэхніцы КПЗБ.

За час адсутнасці ў Беластоку паліцэйскі нагляд за домам яе бацькоў аслабеў, і там зноў можна было арганізаваць запасны явачны пункт. Пад выглядам заказчыкаў да краўца Абрама Цыгельніцкага заяўляліся падпольшчыкі і атрымлівалі кантакты з патрэбнымі ім людзьмі. Гаспадыня часам, каб выручыць дачку, сама разносіла літаратуру, узятую з аптэчнага склада «камерсанта» Восіпа Эпштэйна, які паадкрываў фіктыўныя аптэчныя склады па многіх гарадах Заходняй Беларусі і хаваў побач з медыкаментамі запасы літаратуры.

Роза выпрацавала такую вострапрафесійную памяць, што трымала ў галаве адрасы ўсіх явачных кватэр Беластока, памятала, дзе, на якой кватэры працуюць у гэты момант адказныя работнікі ЦК (сакратарыят размяшчаўся тады ў Беластоку), наладжвала сувязі іх з патрэбнымі людзьмі, асабіста дастаўляла строга сакрэтныя пакеты з ЦК КПЗБ у ЦК КПП, які знаходзіўся ў Варшаве.

Для арганізацыі «тэхнікі» патрэбна была самадысцыпліна, акуратнасць, знаходлівасць. Дапамагаў, як і ў кожнай справе, вопыт. Сёе-тое паўтаралася. У кожным горадзе былі свае стыхійна ўзнікшыя месцы таварыскіх сустрэч. Там можна было непрыкметна перадаваць інфармацыю, не выклікаючы падазрэнняў. У Беластоку такім месцам быў пятачок каля парку. Уваход у парк быў платны, бо на пляцоўцы іграў аркестр, а ў рабочых хлопцаў і дзяўчат не хапала грошай на білеты. Безбілетныя скопліваліся за агарожай, рассаджваліся дзе папала і слухалі музыку, гаварылі, жартавалі. Сюды прыходзілі і падпольшчыкі ды паміж жартамі і перадавалі канспіратыўныя звесткі. У Гродне такім месцам збору быў раён старажытнай Каложы, каля царквы Барыса і Глеба.

На Піншчыне "месцам сходак падпольшчыкаў стала прыгарадная вёска Іванікі. Ляжала яна каля тракту Пінск—Лагішын—Целяханы паміж сасновых пералескаў. Летам сасоннікі на пясчаных узгорках вабілі дачнікаў, знаўцаў лясных

араматаў і лячэбнага азону. Многія гараджане наймалі ў Іваніках кватэры на лета. Прыязджалі дачнікі не толькі з Пінска, а і з Варшавы. У лесе, за вёскай, быў зроблены дашчаны навес, куды «шпацыравічы» маглі схавацца ад дажджу ці ад спёкі. Называлі гэты дашчанік «балаганам». Ноччу ён звычайна пуставаў, і вось камуністы выкарыстоўвалі яго для правядзення падпольных сходак і сустрэч. Даволі шмат моладзі з Іванікаў працавала на Пінскай запалкавай фабрыцы, кожны дзень рабочыя ездзілі на работу і вярталіся нанач дамоў. Пад выглядам знаёмых ці родзічаў яны часта забіралі з горада патрэбных работнікаў падполля, прывозілі на сходы ў «балаган», а пасля разбіралі па хатах на начлег, кармілі, ахоўвалі. Паліцыя не магла пракантраляваць гэтага бясконцага руху людзей, бо ледзь не ў кожнай хаце ў Іваніках кватаравалі непрапісаныя прыезджыя дачнікі. Роза праводзіла тут нарады актыву. Сустрэчы адбываліся ўпоцемках у «балагане». Прысутнічаў на іх і Юрка. «Ніхто,— думала сакратар акругкома,— не ўбачыць у твар члена ЦК. Правілы канспірацыі будуць захаваны, і ён пачуе голас партыйных нізоў». У часе адной нарады Юрка, аднак, не стрымаўся, узяў слова і выступіў. Прамаўляў так, што трэба было быць наіўнаму, каб не ўцяміць, што прыезджы не просты інструктар. Роза напалохалася і хутка закрыла сход.

З таго часу Роза запрашала яго толькі на сустрэчы вузкага кола кіраўнікоў. Яны праводзіліся ў аколіцы Іванікаў.

Гэтая аколіца выдавалася Розе зручнай і бяспечнай. Так многа было там камуністаў і спачуваючых, што ў падполлі сталі выхваляцца, быццам паліцыя баіцца паказваць сюды нос. У Іваніках гадамі дзейнічаў без правалаў склад літаратуры. За яго адказваў шавец Абрам Горбат. Нікому і ў галаву не прыходзіла, што зборлівы маўчун і рабацяга, які любіў выцацкоўваць у руках кожны пантофель і кожны бот, што якраз ён, Абраша Горбат, мнагадзетны бацька, які ледзь пракормліваў сям'ю, адважыцца займацца палітыкай, скажа: «Не! На санацыю не згодзен!»

Дзіўныя таямніцы хавалі палескія хаціны, што маркотна стаялі ў вёсках, насунуўшы на пабеленыя сцены шырокія капяжы чаротавых стрэх. Яшчэ больш таямніц хавалася ў доміках местачкоўцаў, дзе жылі майстры-рамеснікі ці крамнікі. У адным з такіх абжытых домікаў у Іваніках, які

належаў «сімпатыку» партыі Лазару Німцовічу, знаходзілася запасная яўка акруговай «тэхнікі».

У лесе паміж Іванікамі і чыгункай Роза назначыла сход акруговага актыву КПЗБ. Прыкры ўспамін пасля таго Юркавага выступлення падказаў ёй адмовіцца ад «балагану». На парадку дня быў цяпер даклад Юркі Пружанскага аб пастановах майска-чэрвеньскага пленума — палітычная ацэнка дыктатуры Пілсудскага і задачы партыйнай арганізацыі. Другім на парадку дня стаяла пытанне аб удзеле партыйнай арганізацыі ў падрыхтоўцы вялікага мітынгу ў Пінску. Там меліся выступіць кіраўнікі Грамады, паслы сейма Браніслаў Тарашкевіч і Сымон Рак-Міхайлоўскі.

Актыў сабраўся на лясной палянцы, камуністы сядзелі цесным кругам проста на зямлі. Прамоўца гаварыў упаўголасу, часам пераходзіў на шэпт. І гэта надавала яго мове нейкую шчымлівую таямнічасць. Юрку выслухалі, як кажуць, не дыхаючы, потым засыпалі пытаннямі. Камуністаў асабліва даймала, як гэта кіраўніцтва партыі давярала Пілсудскаму, дазволіла вадзіць сябе за нос, хай сабе і нядоўга.

Па другому пытанню выступіла Роза, як заўсёды, гаварыла яна коратка, ясна і прадумана. Абавязкі паміж райкомамі і нават асобнымі ячэйкамі былі размеркаваны. Людзі, ужо на адыходзе, удакладнялі асобныя дэталі, як з Іванікаў прымчаўся задыханы ганец: «Паліцыя!»

Адразу падумалася, што гэта правакацыя, праводзіцца аблава на кіраўнікоў партыйнай акругі. Некаторыя нават пачалі панікаваць, але Роза з Юркам стрымалі людзей: разыходзіцца трэба арганізавана, бо праціўнік якраз і разлічвае на стыхійную неабачлівасць. Даседзелі ў лесе да світання. І гэта затоенасць выратавала людзей. Аказалася, паліцыя проста зрабіла начны налёт на Іванікі. Можа, каб развеяць пагалоску, што паліцыя «баіцца». Правяралі дакументы, у некалькіх дамах зрабілі вобыскі. Але, як далажыў Розе давераны інфарматар, вобыскі станоўчых вынікаў не далі. Абрам Горбат захоўваў падпольную літаратуру надзейна, а Лазар Німцовіч пускаў да сябе незнаёмых людзей толькі строга па паролю.

У назначаны дзень у Пінск, на рынычную плошчу, пацягнулася маса сялян, асабліва вясковай моладзі. Весткі пра мітынг і выступленні паслоў дайшлі ў навакольныя вёскі. Улады

не чакалі такой актыўнасці, не верылі, што зусім маладыя гурткі Грамады змогуць так аператыўна дзейнічаць у масах. Між начальства пачалася патасоўка. Адны былі за тое, каб мітынг дазволіць і рабіць выгляд, што ўлада моцная і ніякіх мітынгаў не баіцца, ігнаруе такія зборышчы, другія былі за тое, каб забараніць. Перамаглі апошнія. Калі на плошчу дайшла вестка, што ўлады забаранілі мітынг і паслы выступіць не змогуць, натоўп абурана зашумеў. У адным баку плошчы раптам узвіўся чырвоны сцяг. Пагода была ціхая, дык сцяганосец размахваў дрэўкам, і чырвонае палотнішча білася ў небе, палымнела. Паліцыя кінулася туды, каб вырваць сцяг, а ў гэты час у другім канцы плошчы на воз ускочыў прамоўца, спецыяльна падрыхтаваны на гэты выпадак камуніст. Ён заклеймаваў улады, якія пазбаўляюць грамадзян асноўных свабод, гарантаваных канстытуцыяй.

Неўзабаве пасля мітынгу Розу выклікалі ў Варшаву на пасяджэнне сакратарыята. Ехала яна з радасным адчуваннем вучаніцы, якая правільна рашыла задачы па арыфметыцы. Палессе станавілася такім жа гарачым вогнішчам вызваленчага руху, як і Слонімшчына ці Наваградчына. Гурткі Грамады ўзнікалі нават у глухіх раёнах, моладзь утварала самадзейныя хоры, тэатральныя труны, адкрываліся чытальні, камплектаваліся бібліятэкі беларускіх кніг. Дрымотная маса адчула сябе згуртаванаю грамадой, якая можа адстаяць чалавечую годнасць, узняць забітага селяніна да звання чалавека. Перабіраючы ў памяці ўсе добрыя справы, якія былі зроблены грамадаўцамі з авангардным удзелам камуністаў, Роза складвала ў думках сваю справаздачу на сакратарыяце, і клопат яе быў аб тым, каб не збіцца на пахвальбу. Якія ж недахопы? Ці ва ўсіх раёнах аднолькава актывізавалася насельніцтва? Не. Значыць, задача — ісці далей у глыбінныя раёны. Гэта раз. Падцягнуць усе раёны да ўзроўню Дубровіцкага і Пінскага падгароднага. А што ж яшчэ? Памятаць, што класавую аснову руху складае рабочы клас, прамысловыя цэнтры, скапленні гарадскіх і сельскагаспадарчых рабочых, адыходнікаў, лесарубаў — там робіцца палітычная пагода. Клімат для ўсёй акругі...

На пасяджэнні сакратарыята Розу неспадзявана для яе пачалі крытыкаваць, ды за тое, што яна лічыла здабыткам. Захапленне легальшчынай ва ўмовах, калі партыя знаходзіцца

ў падполлі,— небяспечнае захапленне!.. Партыйны актыў, перакідваючыся на легальную грамадскую работу, міжвольна дэканспіруецца, легалізуецца, робіцца вядомым праціўніку, і той у любы час зможа рэпрэсіраваць яго. Партыя акажацца без актыву. А хто пад удар ставіць? Мы самі. Захапленне легальнымі формамі дзейнасці можа прывесці да растварэння Кампартыі ў моры легальна-дэмакратычнага руху.

Роза, па сваёй шчырасці, спасылалася на ўстаноўкі папярэдніх пленумаў і цыркуляраў, але яе крытыкавалі яшчэ вастрэй і давялі ледзь не да плачу. Юрка Пружанскі, звычайна актыўны на ўсіх нарадах, цяпер маўчаў. Толькі ў самы разгар крытыкі кінуў рэпліку: «Без персанальнага ўдзелу камуністаў у легальных арганізацыях масы не здабудзеш». Яму запярэчылі ўжо гатовымі фразамі: падтрымка дэмакратаў не мэта, а сродак, тактычны прыём. Калі ж падтрымка аслабляе падполле — гэта не ў нашых інтарэсах. Невядома яшчэ, якіх конікаў навыкідваюць гэтыя дэмакраты, калі пачнецца ажыццяўленне сацыялістычнай рэвалюцыі. Паглядзіце, што яны запяюць пра дыктатуру пралетарыяту...

Юрка Пружанскі ўсміхаўся, але ж не пярэчыў. Роза зразумела, што крытыка яе работы з'яўляецца адначасна каменьчыкам у Юркаў агарод. Вось і пачалі іх звязваць супольныя грахі.

Роза выйшла з пасяджэння сакратарыята прыгнечанай. Захацелася паехаць дадому, да маці, і выплакацца ёй, моўчкі выплакацца і хоць адну ноч спакойна паспаць, выспацца, як у дзяцінстве.

Не даходзіла да Розы, што крытыкавалі яе так востра дзеля таго, што ў кіраўніцтве партыі існавала напружанасць пад уплывам фракцыйнай барацьбы. Прадстаўнікі фракцыі большасці, абараняючыся ад папрокаў за майскія памылкі і культ легалізму, пачалі строга сачыць за суадносінамі падпольных і легальных форм барацьбы, абвастрылі самакантроль, прыдзірліва аналізавалі класавыя асновы таго адзінага фронту, які пачаў складвацца і які належала накіроўваць у сацыялістычнае рэчышча.

Білет Роза ўзяла ўсё ж на Пінск і адправілася ў парк Лазенкі, дзе яны некалькі разоў сядзелі з Юркам, калі даводзілася ад'язджаць на Пінск пасля нарад. Села на аблюбаваную імі лаўку з адкрытым відам на ставок, па якім

плавалі стайкі белых лебедзяў. Чакала. Юрка не прыходзіў. Ёй стала балюча, пад горла падкочваўся камяк крыўды.

Перад вачыма ўсплываў той вечар, калі яны ішлі на нараду па лагішынскім тракце пад Іванікі. Выйшлі з горада пад вечар, каб на сутонні быць на ўмоўленым месцы. Як заўсёды, Роза крочыла першай, а ён следам — на адлегласці — за ёю. Прайшлі ўжо больш як паўдарогі, яму карцела дагнаць яе і спытаць, ці не зарана яны выбраліся, але на дарозе перашкаджалі стрэчныя людзі. Аглядаючыся, Юрка заўважыў, як з захаду неба завалаклося хмарамі. Падняўся вецер, стала трывожна і зябка. Маланкі палахлівымі вобліскамі асвятлялі трывожную далеч. Юрка прыбавіў кроку, але Роза пусцілася подбегам і перад вёскай павярнула на могільнік, пад расахатыя сосны. Юрка нагнаў яе ўжо ля самае каплічкі, задыханую, прамоклую. Аказалася, што гэтая гараджанка баіцца грому. Абняўшы Розу за плечы, ён правёў яе пад замшэлы дашчаны капеж, выбраў месца, куды не засякаў дождж, пасадзіў сяброўку і сам прымасціўся побач. Юрка пачаў прыгадваць пацешныя здарэнні з камсамольскага жыцця ў Савецкім Саюзе. Калі ён расказваў пра ўрачыстасць камсамольскага вяселля, уявіўшы сябе на месцы жаніха, прытуліў яе. Прыемна было...

Насуперак правілам канспірацыі Анатоль адкрыў ёй праўду пра сябе, сказаў, што ён не Юрка Пружанскі... У парыве ўзаемнасці і ўдзячнасці за давер сяброўка таксама прызналася, што яе сапраўднае імя Фейга Цыгельніцкая, што паходзіць яна з Беластока, з рабочай сям'і. У чатырнаццаць гадоў сама стала ткачыхай, у шаснаццаць уступіла ў Кампартыю і «перакваліфікавалася» спачатку на сувязную, а затым, пасля партшколы ў Лошыцы пад Мінскам,— на адказную работніцу партыйнай «тэхнікі». Цяпер вось узначаліла акругу. Вызнаўшы гэта, яна сумелася. Сапраўды, ва ўмовах падполля такое значыла больш, чым любоўнае прызнанне. Розе стала няёмка за тую даверлівасць. Няўжо для яго гэта нічога не значыць?.. Паглядаючы на гадзіннік, яна лічыла, колькі яшчэ можа бавіць тут часу, і ўжо наважылася ўстаць ды ісці ў кірунку вакзала, як убачыла на паркавай дарожцы члена ЦК Бабровіча, які скіраваўся проста да яе, нібы ведаў, што яна будзе якраз тут, на гэтай лаўцы. Падсеўшы да Розы, ён стаў яе супакойваць і разважаць. Прасіў не строіць трагедый, а прымаць крытыку

па-дзелавому. Абвостраная патрабавальнасць да кіраўнікоў — звычайная рэч у жыцці падпольнай партыі.

— Юрка,— сказаў нібы між іншым Бабровіч,— прыедзе заўтра, прывязе дадатковыя інструкцыі. Прасіў кланяцца.

Гэтага ёй было даволі, каб адчуць радасную палёгку.

## ХМУРАЯ НАВАГРАДЧЫНА

У жніўні Розу перакінулі на Баранавіцкую акругу, туды, дзе яе не ведалі яшчэ ні падпольшчыкі, ні следчая служба. Юрка пачаў таксама часцей наведвацца ў гэтую зону. Спраў тут было не менш, чым на Палессі, асабліва інтрыгавала і вабіла прадстаўніка ЦК гарыстая Навагрудчына, край густа заселены беларусамі. Нават буйныя землеўладальнікі не так ужо квапіліся лічыць сябе тут палякамі. Працоўная ж вёска цвёрда трымалася беларускасці, змагалася за школу на роднай мове, за грамадзянскія правы. На грамадскіх асновах беларусы ўтрымлівалі ў Навагрудку, Клецку і Радашковічах прыватныя беларускія гімназіі. У гэтых установах запаліліся вогнішчы камсамольскага руху. Юрка ведаў, што навагрудская камсамолія пасля віленскай была самым баявым атрадам у Заходняй Беларусі. Але веды браў пераважна са справаздач. Цяпер жа перад ім раскрывалася праўда фактаў жывых, гарачых. І радаваўся ён глыбокай народнасці вызваленчай барацьбы. Нідзе дасюль не давялося яму бачыць такіх масавых акцый па збору сродкаў на палітвязняў, не страчалася такой чулай апекі над іх сем'ямі, як тут, у дружных вёсках урадлівай Навагрудчыны.

Край гэты дыхнуў на Альшэўскага легендамі, паданнямі і сучаснымі быліцамі. То ж была зямля Міцкевіча — вялікага рамантыка, чыё імя ён чуў з дзяцінства, а цяпер, сярод польскіх рэвалюцыянераў, ведаў многіх паклоннікаў яго самабытнага таленту. Міцкевічам захапляўся нават флегматычны па натуры Станіслаў Мертэнс. У бытнасць сваю старшынёю Навагрудскага рэўкома, ён выдаў загад аб увекавечанні памяці вялікага песняра не толькі па службоваму абавязку, а і па падказцы сэрца. Польскія ўлады стараліся цяпер выкарыстаць культ Міцкевіча ў сваіх палітычных інтарэсах — для сцверджання «польскасці» края. Але іх захады

выглядалі мёртваю казённаю тэатральшчынай у параўнанні з натуральным народным рухам беларусаў, якому свабодалюбівая традыцыя рамантыкаў была роднаснай. На Наваградчыне кіраўніцтва камуністамі з рэвалюцыйна-дэмакратычным у аснове народна-вызваленчым рухам было вельмі моцным і змястоўным.

У адзін з першых прыездаў сюды Юрка наведаў горад, агледзеў дом Міцкевіча і замчышча. Гарадок быў невялікі, але вельмі адметны: самы цэнтр яго знаходзіўся на высокай гары, узвышаўся над аколіцай купаламі дзвюх цэркваў і званіцамі двух касцёлаў. Вузкія гарадскія вулкі прамянямі спадалі ў нізіны, часамі ў ярах пятлялі лукаткамі і зусім губляліся ў зеляніне дрэў. Рыначная плошча, што пасярод горада была раздзелена папалам доўгаю прыземістай будынінай з галерэямі, падпёртымі белымі калонамі — гандлёвым павільёнам. Паміж калонамі былі секцыі з асобнымі ўваходамі, дзе размяшчаліся крамы. Выглядалі яны маленькімі, але купіць тут можна было ўсё, што душа захоча — ад цукеркі да селядца, ад моднай брошкі да вілаў. Гандаль меў свае паняцці аб прыстойнасці.

З рынку на ўсход ішла кароткая вулка да замкавай гары. На рагу размяшчалася павятовая ўправа Грамады і беларуская кнігарня — месца пазапланавых сустрэч наваградскіх камсамольцаў. Юрка абмінуў кнігарню, хоць карцела зайсці туды і паслухаць гамонку пакупнікоў. Такія размовы даюць часта больш матэрыялу для роздуму, чым афіцыйныя сустрэчы. Але становішча члена ЦК не дазваляла рызыкаваць. Асабліва з першых крокаў на новым месцы. А мясціна была каварнай. Польскія ўлады, адраджаючы старашляхецкую традыцыю, зрабілі гэты невялічкі гарадок ваяводскім цэнтрам. Штаты дэфензівы былі такія ж, як і ў вялікіх ваяводскіх гарадах. Гэта трэба было ўлічваць, і Юрка падаўся проста на замкавую гару.

Па замкавым дзядзінцы снаўдаліся парамі і групкамі людзі, апранутыя па-дарожнаму, відаць, турысты. Юрка пайшоў следам за адной з такіх груп, прыкідваючыся рассеяным летуценнікам: то падыходзіў, то адставаў ад кампаніі... Зрэшты, яму не трэба было спецыяльна іграць ролі захопленага чалавека. На самай справе, цяжка было адарваць вочы ад велічнай панарамы, што раскрывалася з гэтай гары. Дубовыя гаі і дываны палёў, на якіх яшчэ стаялі бабкі

нязвезенага аўса, вёсачкі і хутары, сасняки і яловыя кудзеркі на горках, аброслыя алешнікам ручаі ў далінах і прамыя палотнішчы дарог цераз узвышшы і даліны — адна на ўсход, на Мір, Нясвіж, ажно да польска-савецкай граніцы, другая, заходняя, паўз Барысаглебскай царквы — на Ліду і Вільню, а паралельна ёй, недзе заслоненая Дамініканскім касцёлам дарога на Свіцязь і Баранавічы. Па гэтай дарозе ён дабіраўся аўтобусам з Баранавіч. Панарама была як жывая карта экзатычнага краю, з якім хіба толькі Віленшчына ды Браслаўшчына маглі спаборнічаць хараством, багаццем фарбаў і мнагастайнасцю форм. Беразнякі і грабнікі ўжо адлівалі першай пазалотай, а дубнякі сама згушчалі сваю тугую зеляніну, завораныя ржышчы адлівалі цаглянай чырванню суглінкаў.

На замкавай гары нядаўна прайшлі работы па кансервацыі валоў і рэштак мураваных вежаў, што захаваліся пасля шведскага разбурэння. На старым замчышчы будаваўся памятны курган у гонар Адама Міцкевіча. Турысты адзін перад адным хапалі тачкі і вазілі грунт на курган, атрымлівалі за гэта памятны жэтон удзельніка шанавання памяці славутага земляка.

Наваградчына была краем здавён абжытым: уздоўж дарог цягнуліся ланцужкі густа збітых вясковых сяліб, сярод пералескаў паасобку і групкамі туліліся хутары. Відаць, і Міцкевічу, аматару рамантычных дзікіх пейзажаў, ужо даводзілася ствараць свае малюнкі больш па фантазіі, чым па назіраннях. Пясняр Наваградчыны спяваў развітальную песню даўняму рэліктаваму хараству пушчанскіх нерушаў і патрыярхальнай прастаце побыту, што даходзіла ажно да шляхецкіх дворыкаў. А на вачах ішоў поступ цывілізацыі. Граф Храбтовіч, з сынам якога паэт вучыўся ў Вільні, па сваёй волі адмовіўся ад прыгоннай сістэмы гаспадаркі, палічыў яе нерэнтабельнай і перавёў сваіх падданых на аброк. Ян Чачот, які служыў тады ў Шчорсах, у графскай рэзідэнцыі бібліятэкарам, склаў нават хвалебны верш пра гэтую сенсацыю, імянуючы Храбтовіча на польскі лад Хрэбтавічам:

Пана Хрэбтавіча мужыкі харошы,
Вясёлы, адзеты ды і не без грошы.
У нас Аляшкевіч, Монічы, Гіляры,

Маюць і чырвонцы, рублі і таляры.
Мы панам шчаслівы! Да бога заклічам:
Дай век доўгі жыці з панам Хрэбтавічам.

Ідылія рамантычнай пары развеялася, як сон, грашоўныя мужыкі на Наваградчыне перавяліся. Ужо ў 1905 годзе яна праславілася хваляваннямі сялян, масавымі ўпартымі забастоўкамі парабкаў у маёнтках, падпаламі панскіх гумнаў, скірдаў і нават мэндляў збожжа на полі. Як сенсацыю той пары расказвалі людзі, што даіць панскіх кароў, каб не пазапускаліся, прысылалі царскіх салдат. У часе імперыялістычнай вайны Наваградчына стала месцам баёў. Фронт два гады трымаў яе ў сваіх абцугах. Немцы абрабавалі і вывезлі каштоўную графскую бібліятэку са Шчорсаў, а старадаўні Лаўрушаўскі манастыр, асяродак культуры з часоў Вялікага княства Літоўскага — зраўнялі з зямлёй. У 20-я гады нават землеўладальнікі, паскубаныя вайной, марудна апераваліся. Толькі вайсковыя каланісты, прывезеныя з цэнтральнай Польшчы, мелі казённыя пазыкі і ссуды на зайздрасць мясцовым гарапашнікам. Вайна, бежанства паглыбілі галечу сяла і абвастрылі патрэбу нармальнага чалавечага жыцця. Наваградчына гула мітынгамі пратэстаў, бурліла дэманстрацыямі, звінела рэвалюцыйнымі неснямі, У змаганні ствараліся новыя легенды.

Рэвалюцыянерка Клаўдзія Гоцка расказала Юрку адну трагічную быліцу 1920 года.

Гэта было на вялікдзень. Ноччу ў мястэчку Ярэмічы пад звон царкоўных званоў нехта застрэліў каменданта польскай жандармерыі. Труп знайшлі раніцай на паповым падворку. Пачаўся розыск. Па нагавору мясцовых панкоў жандары арыштавалі больш за сорак вяскоўцаў, тых актывістаў, што квапіліся падзяліць панскія землі, гуртавалі беднату. Усе трапілі пад палявы суд. Допыты вяліся ў Турцы, у афіцынах Сапегаў. Следчыя адкрыта прымянялі сілу на допытах, уладальнікі навакольных маёнткаў — пан Кашыц з Вобрыны, пан Селяжыцкі з Адамова і вясковы кулак-выскачка Аляксандр Дрык ездзілі спецыяльна паглядзець, як корчацца ў муках іх класавыя ворагі. Мікалая Бразоўскага лічылі важаком змоўшчыкаў, таму катавалі з асаблівай жорсткасцю на вачах у

маці і роднага брата, 16-гадовага хлапчука. Палявы суд вынес смяротны прыгавор чатырнаццаці чалавекам. Клаўдзія ведала ўсіх па імёнах. У доме Мікалая Бразоўскага яна жыла на кватэры, калі вучылася ў школе. Досвіткам, у дзень пакарання, пабегла яна ў Наваградак, каб хоць апошні раз глянуць, падтрымаць чалавека, якога лічыла сваім духоўным аўтарытэтам. Спадзявалася ўбачыць пакаранне дастойнае, з ушанаваннем чалавечай годнасці. Але асуджаных пастралялі ўпотай, ноччу і закапалі ў невядомым месцы, недзе за горадам. Потым стала вядома, што каменданта жандармерыі застрэліў велікоднай ноччу зайздрослівы намеснік — хацеў заняць камендантава крэсла.

Вяртаючыся дамоў, ахопленая болем спачування, дзяўчына паклялася аддаць сябе дарэшты той справе, у якую верылі замардаваныя. Балючая прага помсты прывяла Клаўдзію ў шэрагі рэвалюцыі. Пачуццё гэтае разраслося ў яе душы, стала высокім і гнеўным.

Прыезд Розы падпольшчыкі адзначылі, як гаварылася, «музыкай». На спаса, 7 жніўня, яны правялі ў самым Наваградку, на рынку, мітынг: патрабавалі зямлі, школы на роднай мове, свабоды для палітзняволеных. Паліцыя ад нечаканасці прыціхла. І толькі калі на плошчы сфарміравалася калона дэманстрантаў ды пайшла па Слонімскай вуліцы ў кірунку турмы, ахоўнікі парадку ачомаліся ад здранцвення, перагарадзілі дарогу дэманстрантам. На перагаворы выйшаў сам павятовы стараста. Кіраўнікі дэманстрацыі заўважылі, што праціўнік разлічвае на адцяжку: паліцыя рыхтавала контрудар, падцягвала ўсё новыя сілы, расстаўляла кулямёты. А ў дэманстрантаў не аказалася гатовага плана дзеянняў. Паход на турму атрымаўся стыхійна. Важакі сарыентаваліся і далі адбой, каб не дапусціць праліцця крыві. Потым шкадавалі аб недапрацаванасці плана мерапрыемства. І рашылі паправіць справу мітынгам і дэманстрацыяй у Карэлічах 7 лістапада — у гонар Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Роза трывожылася на новай пасадзе за адно: хаця б гурткі легальнай Грамады не размылі камуністычнага падполля. Яе розум, прывучаны да строгага выконвання дырэктыў, насцярожваўся, узнікала нават падазронасць у адносінах да

легальнага грамадаўскага разводдзя. Яна рабілася зайздросна-насцярожанай да «легальнікаў», і гэта, ён бачыў, не ішло на карысць справе. Таму Юрка скрозь стараўся падкрэсліваць поўны давер як да камуністаў, што працавалі ў гуртках Грамады, так і да культурна-асветных работнікаў, да актывістаў і радавых членаў братняй масавай арганізацыі. Роза была дастаткова інтэлігентнай, каб разумець сэнс яго паводзін.

Неяк позняй восенню яны сабралі ў Палужжы, недалёка ад Карэліч, акруговую нараду актыву. З'ехаліся дэлегаты з некалькіх раёнаў. Праца была разлічана на ўсю ноч. Мясцовыя камуністы і камсамольцы выставілі варту, дамовіліся аб сігналах на выпадак налёту паліцыі. Сходку праводзілі ў склепе пад хатай сакратара партячэйкі. Паклалі на бульбяны бурт века ад дзяжы, на яго паставілі лямпу, запалілі яе і пачалі нараду. Слова ўзяў Юрка. І ў самы разгар выступлення раздаўся сігнал трывогі. Усе замоўклі. У цішыні несамавіта апантаным здаваўся брэх сабак. «Выдалі»,— вырвалася ў кагосьці слова, пасля якога толькі і заставалася кінуцца наўцёкі. Сабачы брэх набліжаўся. Здавалася, што нейкай нябачнай рукою струна вытрымкі нацягваецца, напінаецца і зараз гучна дзінькне — парвецца. І тады злавесны момант нарэшце зрушыцца, стане рэальным, пацячэ ў плыні часу, будзе сваім, зразумелым, хоць і наблізіцца да берага зла.

І тут раптам крохкаю цішай авалодаў цвёрды голас Юркі:

— Спакойна, таварышы! Я ўпэўнены, што між нас правакатара няма. Спакойна. Мы ўсе свае. Не будзем дрэйфіць. Нам брыдка панікаваць. Паверце мне, усё будзе добра. Толькі прашу — ціха...

Юрка патушыў лямпу. Яго ўпэўненасць, давер да прысутных раптоўна перадаліся сходу. Людзі з палёгкай уздыхнулі. А Юрка ў цемры пачаў шэптам жартаваць. І ўжо нястрашпым выдаўся брэх сабак ля самых варот гаспадаровай хаты і грукат калёс па грудзе. Нават тупат паліцэйскіх ботаў і размова патрульных з гаспадаром над самымі галовамі падпольшчыкаў не паднімала ўжо страху. Гаспадар, знарок зычна, бадзёра гаварыў з няпрошанымі гасцямі. Відаць, хацеў, каб падпольшчыкі чулі і ўпэўніліся, што візіт выпадковы. Паліцэйскія, чуваць было, прыставалі да солтыса, які быў з імі, набіваліся на пачастунак. І ён — свой чалавек — запрасіў,

паставіў выпіўку. Пацягнуўшы з холаду, расказваў потым солтыс, служакі даверліва скардзіліся, што вось марнуюцца начамі няведама чаго, без толку. «Камуна, як д'ябал,— напэўна ёсць, усе ведаюць, што ёсць, але ніхто не бачыў. Ну, скажы, пане солтыс, праўду: ёсць камуна ў тваёй вёсцы?»

— Д'ябал, напэўна, ёсць, а камуны няма.

І не хацелі верыць солтысу, які аднекваўся, бо ў іх з'явілася раптам столькі азарту пагрэць рукі аб каркі гэтых праклятых камуністаў. Ледзь выбавіў патрульных з вёскі знаходлівы солтыс. Давялося выдумаць хваробу старой маці. Паліцэйскі патруль падаўся ў іншую вёску.

Гаспадар даў адбой трывогі. Падпольшчыкі прадоўжылі нараду.

Юрку і Розу пасля сканчэння нарады адвялі таварышы дняваць на ціхі хутарок, што прытуліўся ў глыбокім, парослым шыпшынай яры. Покуль развітваліся з праваднікамі ды перакінуліся слоўкам з гаспадаром, дык і пачало світаць. Гаспадар адвёў ім пакойчык у чыстай палавіне хаты. Ведаючы, што госці здарожаныя, змораныя, услужна закрыў аканіцы, якія летам былі толькі для хараства, а зімой — для цяпла. Самі гаспадары ўставалі і кладліся разам з сонцам.

Але гасцям не хацелася спаць. Узбуджанасць не праходзіла. Прысеўшы на ўслончыку, ля накрытага абрусам стала, яны шэптам перабіралі падзеі трывожнае ночы. Радаваліся ўдачы.

— Слухай, Роза, а чаго табе найбольш хацелася тады ў склепе, калі прасігналіў гаспадар? Было страшна? Не лічы мяне назолай, адкажы…

— Што за шляхецкія цырымоніі!.. Хоць, можа, і соромна прызнавацца… Ад страху мяне заўсёды цягне дамоў. У Беласток, на Млынавую. Так і там, у тым душным склепе захацелася схавацца ў мамінай спальні. А потым?.. А потым спахапілася, сама сябе лаяла за такую дзецінаду. Узяла сябе ў рукі. Ты памог. Дзякуй…— Роза прытулілася да сябра і прадаўжала: — Цяпер, як падумаю пра беднага бацьку і маці ды пра нашу вялізную сям'ю, ды як уяўлю, што мяне могуць там застукаць… На бацькоў тады спадзе, ой, якая бяда… Не, я ўжо, мабыць, ніколі не вярнуся дамоў. Ніколі…

Роза прыціхла і незнарок уздыхнула. Ды тут жа, засаромеўшыся сваёй крыўдлівасці, перабіла настрой

папраўкай, такой бадзёрай, цалкам у камсамольскім духу: — Толькі пасля перамогі! Тады запрашу цябе, Юрка. І зробім табе самы лепшы ў Беластоку гарнітур! Добра?

— О, зразумела! Буду трымаць на слове. Альшэўскаму спадабаўся гэты стан самакантролю, дзявочая стрыманасць перарастала тут у штосьці больш значнае. Чалавек, які так сочыць за сваімі думкамі і паводзінамі — нешта значыць, нешта можа. Многае можа! Бо такі чалавек адчувае высокую адказнасць за справу, жыве справай, абслугоўвае справу...

І тут жа мільгнула спакуса: «А што, калі ў справе паявіцца хіба, лопацень? У планах, у намеры памылка? На выручку прыйшоў Яраслаў. Ён з'явіўся ў думках як жывы і сваім ціхім памяркоўным голасам сказаў з дакорам: «Што ты, Толя? Хіба так можна?.. Гэта ж сафістыка».

— Ну, чаго ж змоўклі? — вярнула яго да рэальнасці спадарожніца. І ён азваўся дзяжурным запытаннем:

— А хто тваe бацькі? Заможныя людзі, знатныя? Мо і я іх ведаю?..

— О, яшчэ якія знатныя! — падхапіла яна тэму і перавяла ў іранічны план.— Напэўна, ведаеш. Запытай у Беластоку, хто такія Абрам і Лея Цыгельніцкія, і табе кожны сустрэчны адкажа: «Гэта той глухі кравец, што на Млынавай вуліцы, і яго жонка. Шые, як задарма. А гарнітуры, пане мой, не ўступаюць тым, што з салонаў моды. Пан хоча заказаць гарнітур? Ідзі і закажаш, каяцца не будзеш. Зробіць — рэхт, толькі не хутка, не паспявае. А калі на жартаўніка трапіш, дык скажа яшчэ: «Цыгельніцкія — гэта не Цыгельніцкія, а Ігельніцкія».

— Чаго ж раней не сказала. Люблю добра пашытае адзенне. Гэта мая слабасць. Мяне за гэтую звычку панічыкам абзываюць нашы пурытане з Вільні.

— А я люблю хораша апранутых...— Роза хацела сказаць кавалераў і запнулася, хаця б яе правільна зразумеў востры на слова Юрка. І яна замест «кавалераў» сказала людзей і апраўдалася, што гэта слабасць з маленства, бо і сама займалася шытвом.

— У нас у хаце яшчэ да вайны былі і майстэрня і цэлы штаб падпольшчыкаў. Мама ў мяне знаецца на кравецтве і на палітыцы, была заядлым праціўнікам самадзяржаў'я, можа

нават і па асабістых прычынах. Гэта ж тату акалечылі царскія жандары. У часе забастоўкі ткачоў ударылі яго па галаве. І ён ледзь выжыў, застаўся глухім. Тата з мамай на фабрыцы працавалі. Потым, як здарылася гэта, вымушаны былі пераходзіць на рамесніцтва. Машыну «Зінгер» на выплату ўзялі і так халупнікамі зрабіліся. Тата ж зусім не чуе. Толькі па губах маму і разумее. І яна ў яго за перакладчыцу з усімі кліентамі гаворыць. Распытвае, якое той хоча адзенне, які фасон, і пераказвае тату. А тата ўвесь час маўчыць. Робіць і маўчыць. Ён як бы не на гэтым свеце. Думае нешта сваё і жыве ў вечным маўчанні.

— То ў вас у хаце матрыярхат,— перапыніў Юрка сяброўку, адчуўшы, што яна пачала расчульвацца.— А ў нас таксама маці — галава ўсёй хаце. Па крайняй меры, у справах сямейных. Бацька не ўмешваецца, усё ідзе пад маміну каманду. А гэтае прыгожае плацце,— Юрка нібыта незнарок абняў Розу за плечы,— мама пашыла?

— Так, яна перадала цераз знаёмую дзяўчыну з «тэхнікі». І цяпер у нас у хаце падпольшчыкаў кішма кішыць. Днююць і начуюць таварышы. Пасля работы майстэрня не пустуе. Там вечна хто-небудзь з бяздомных, такіх як мы вось з табою — гасцююць. Яшчэ я дзяўчынкай была, дык з сястрой на раскладушцы валецікам спалі — да вайны было гэта, а на канапе — вядомы беластоцкі дзеяч рабочага руху Юзэф Захар'яш пахрапваў. Аднойчы, памятаю, ноччу жандары наляцелі, а ў Захар'яша некалькі пачак літаратуры было пры сабе. Дык мама тыя пачкі да нас, пад коўдру. І наказ дае: «Рабіце выгляд, што вы спіце і не паднімайцеся з ложка, хоць бы вас сілай паднімалі». Мы так і ляжалі з заплюшчанымі вачыма. Не рашаліся жандары нас будзіць.

— О, якія ветлівыя былі царскія жандары. Польскім бы троха тых якасцей. Лягчэй бы нам жылося,— пажартаваў Юрка.

— Цяпер да нас на кватэру адказных асоб «тэхніка» стараецца ке пасылаць. Кватэра, сам ведаеш, на падазрэнні, паліцыя папракае маму. Я, па іх буржуйскім разуменні, на заработках у падполлі. Багацею, капітал збіваю, пасаг?.. Кожны аб другім па сабе судзіць.

— Не абурайся, дзяўчынка! Ува мне маеш сведку. Я на «Капітале» Маркса прысягну ў разе патрэбы, што падпольны камісар Палесся і Навагрaдчыны Роза Абрамаўна Цыгельніцкая жыла звышскромна, берагла кожны грошык партыйны, нават на балаголах эканоміла, з-за чаго і я, пасланец ЦК, вымушаны быў сядзець аднойчы, не раўнуючы, як дзед пад царквой — у Іваніках, памятаеш? Абое былі мы, як мокрыя куры. Курка і Пеўнік. Падабаецца, Роза, параўнанне?..

— Я хоць і мокрая курка была, але гэтаму непаседліваму пеўніку грабянец пашчыпала і цяпер пашчыпаю,— гразілася Роза, пратэстуючы супраць абдымак.— І я ніякая не Роза, а Фейгла. Непрыгожае імя, праўда? Таму і забыў?

— Фейгла?.. Давай не Фейгла, а Фейга. Лягчэй вымаўляецца і гучыць музычней, як бы на скандынаўскі лад. Фейга! Толькі на жаль не магу цябе называць гэтым імем. Хіба, як нас запросяць на чарговы пленум у Саюз. Дазволіш зваць сябе тады Фейгай?

— А ты ведаеш, што хутка будзе пленум?

— Не ведаю, а хачу. Душа хоча!

Юрка ўпадабаў Навагрaдчыну нават больш, як Палессе, прыемна здзівіла яго хвацкая дзёрзкасць тутэйшых падпольшчыкаў. Цэлыя вёскі былі тут ахоплены камуністычным рухам і ніхто не смеў нават у бытавых пытаннях адступіцца ад устаноўленага рэжыму. А рэжым быў жорсткі — устанаўліваўся сухі закон, і ніводзін вясковец не асмельваўся зайсці на вечарыну падвыпіўшым, бо супраць яго ўчыняўся байкот. У вёсках традыцыйныя абрады пераасэнсоўваліся і выкарыстоўваліся для вызваленчай барацьбы. Розныя фэсты, калядаванні, валачобніцтва — усё было шырмай для падполля.

Вера ў сваю ўдачлівасць і ў надзейнасць сяброў па змаганню рабіла Юрку таксама рызыкоўным. На пачатку восені ён прыехаў на пасяджэнне Баранавіцкага акружкома на дзень раней тэрміну. Роза запрапанавала яму адпачыць на патайной кватэры. Але ён рашыў зрабіць начную вылазку ў Бярозу, дамоў. Гэта не месцілася ў правілы капспірацыі, і Юрка не стаў дзяліцца сваім намерам з Розай, каб не рабіць ёй прыкрасці. Выбраў начны цягнік, купіў білет і паехаў. Разлічваў на цёмную ночку.

Станцыя Бяроза-Картузская ад горада далёка, убаку. Да мястэчка трэба ісці праз доўгую, як вужака, вёску Блудзень. Анатоль яшчэ ў цягніку гадаў-думаў: як лепш прайсці? Ці проста па вуліцы, ці загуменнем, цераз аселіцы і агароды... Загуменнем яно бяспечней, там не сустрэнеш ні начной варты, несці якую ўлады абавязвалі сялян па чарзе, ні паліцэйскага патруля, які кантраляваў, ці пільна вартуюць жыхары свае вёскі. Але, ідучы загуменнем без ліхтарыка, можна было заблытацца ў платах і пярэплатках, якія любілі ставіць гаспадарлівыя мужычкі, абгароджваючы свае агурочнікі ад суседскіх курэй ды парасят. А самае паганае, што магло натрапіцца на загуменні — гэта спушчаны нанач з ланцуга куслівы сабака: палатае порткі, наробіць галасу і, чаго добрага, гаспадар прачнецца, выскачыць лавіць злодзея, тады мусіш апраўдвацца, чаго ты не спіш, як усе людзі, куды цябе нялёгкая носіць па задворках, чаго людзям ноч калоціш... Такая сітуацыя здавалася Анатолю не проста прыкрай, а зневажальнай. Яшчэ чаго не хапала, каб падпольшчык, член ЦК прыдумваў выкруткі і тлумачэнні для ўсялякага печаседа. Недачаканне ваша, уласнікі цёплых хат ды злосных сабак. Прайду вось вуліцай, як пасланец гісторыі, абвяшчаючы хуткі канец уласніцкім парадкам. Прайду, прытупваючы па сваёй зямлі. Зрэшты, можа, бяспечней будзе вытлумачыцца перад паліцыянтам, чым перад якімсьці дасужым запечнікам. Улада абавязана пытацца афіцыйна, а гэты мудрагель вантробы выматае. Яму ўсё цікава: і хто ты такі, і да каго ідзеш, і ці чуў, што здарылася надоечы ў шынкаркі Белі...

Усе аргументы былі за тое, каб ісці вуліцай, але, тым не менш, калі ён, адарваўшыся ад асветленай электрычнасцю прывакзальнай плошчы, апынуўся ў поцемках, яго ахапілі ваганні. Падышоўшы да крайніх блудзеньскіх хат, нават прыпыніўся, затрыманы ўнутранымі словамі: «Ну што? А можа... Вунь, налева, ледзь прыкметна пайшла сцяжына якраз на загуменне...» І падумалася падпольшчыку: «От бы мець дар прарочы, каб загадзя ведаць, дзе і што з табою можа быць!» Нават казка такая прыпомнілася з дзяцінства пра знахара, што наперад ведаў, што будзе, і ўмеў разгадваць сны і даваў прадказанні добрым людзям аж покуль яму самому, знатнаму ведуну, надакучыла жыць. Нецікава стала пражываць усё вядомае загадзя. Прыгадаў гэта Анатоль і засмяяўся са сваёй

нерашучасці: «Альбо пан, альбо прапаў!.. Камунары не будуць рабамі!» І пайшоў вёскаю, пільна ўслухоўваючыся ў начныя шолахі. Ноч для надпольшчыка — самая гаманкая пара. Ён пільна лавіў шолахі, разгадваючы, што гэта наперадзе зарыпела, як бы весніцы ці мо журавель ля калодзежа. А каму б гэта спанадабілася сярод ночы па ваду ісці? Відаць, усё ж весніцы. Мабыць, варта!.. І калі здавалася, што прамінуў ужо тую скрыпучую мясціну, адчуваў радасць удачы.

Усё ж злыбедай ночы аказаліся сабакі. На вуліцу яны не выбягалі. Улады штрафавалі гаспадароў, якія трымалі сабак без прывязі, але часам, спачуваючы Лыску ці Бобіку, іншы дабрадзей спускаў яго нанач з ланцуга, калі панадворак быў добра агароджаны. І вось з удзячнасці за дабрату гэтыя спушчаныя з ланцугоў прыяцелі аддзячвалі гаспадарам такою старожкасцю і такім уедлівым брэхам, што было чуваць не то што ў Бярозе, а мо ў Брэсце ці ў самой Варшаве.

Ад станцыі да бацькавага дома было кіламетры чатыры. Покуль перамераў іх упоцемку, добра такі ўзмакрэў. Не ад хады, а ад гэтага старожкага брэху, што неадчэпна ішоў за ім следам, адзначаючы шлях. Спыніўся на сваім двары, чакаў, покуль усё навокал сціхне. Наслухоўваў. Думаў ужо падацца назад. Але...

Пастукаў у акно раз і другі. Хата маўчала. Новая хваля трывогі ахапіла яго, памкнуўся ўжо адыходзіць, але разважыў: «Світанне ж зараз». Цягнікоў не будзе да раніцы. Сядзець повідну на маленькім вакзале — гіблая справа.

Адчайна — што будзе, тое будзе — загрукаў трэці раз.

Нарэшце адкрылася фортка, і паказаўся бацькаў твар:

— Хто тут? Чаго ж вы ноччу людзей трывожыце?

— Ці-іха, гэта я... Толя,— прашаптаў ён у адказ.

— Хто такі?

— Толя, ваш сын.

— Няма ў мяне тут сына. Не беспакойце па начах, ідзіце сваёй дарогай.

Стары пачаў зачыняць фортку, але пальцы, спрасоння ці з хвалявання, ніяк не маглі злавіць гачыка, які вымыкаўся і бразгаў па раме.

У Анатоля набеглі на вочы слёзы. Пачаў стукаць зноў. І прыплач, як дзіця, папракнуў бацьку:

— Вы не верыце, во, паглядзіце на палец. У мяне ж палец адсечаны. Памацайце.

Стары прасунуў цераз фортку руку, памацаў, і Анатоль адчуў, як задрыжала халодная старэчая рука. Горка было несці спалох у родную хату. Страх азмрочваў радасць сустрэчы. Завесіўшы вокны, бацька расказаў яму, як жандары ў 20-м годзе пераманалі шампаламі ўвесь агарод, шукалі, быццам тут закапаны чырвоны сцяг, сакрэтныя дакументы, нібыта пакінутыя сынамі. Адама Іванавіча пасадзілі ў турму, некалькі месяцаў трымалі, дапытвалі. На яго шчасце, не знайшлі чагосьці забароненага. Але потым усё роўна не давалі работы. Нядаўна толькі неяк уладкаваўся пісарам у гарадскі міравы суд.

Сямейнікі з удзячнасцю расказвалі пра пераводы, якія атрымлівалі ад Ярослава,— рэгулярна па пяць долараў штомесяц. Зайздросцілі ім знаёмыя і цікавіліся, кім жа там Яраслаў, што ажно доларамі «варочае». Толю было ніякавата ў ролі малодшага, безграшовага... Вырашыў папрасіць дазволу і перадаць частку грошай, якія атрымліваў на пражытак, бацькам. Можна было гэта зрабіць і раней, але не рашаўся, каб не дражніць мясцовых падпольшчыкаў, што і так часам дакаралі іх, прафесіяналаў, жыццём на шырокую нагу.

Балюча было чуць бацькаву старэчую скаргу і адчуваць сябе міжвольна вінаватым, бо бяссільны абараніць яго ад самаволі, падтрымаць, дапамагчы. Пастанавіў тады Анатоль цвёрда — не наводзіць больш небяспекі на родную хату. Даў сабе слова не прыходзіць дамоў.

За гады падполля Юрка Пружанскі добра авалодаў навукай канспірацыі. На здымках 20-х гадоў ён так падобны на польскага інтэлігента, што цяжка паверыць, быццам здымкі гэтыя зроблены ў пралетарскім Мінску, а не ў Вільні ці ў Варшаве. На адной фотакартцы ён сам жартам напісаў: «З выгляду буржуй, але сэрца пралетарскае». Назіраючы на гэтага прыстойна апранутага ягамосця, так і хочацца сказаць: «Проша пана». Але, напэўна, і паліцыя ўдасканальвала сваё майстэрства. А галоўнае, ад восені да канца 1926 года ўсё нарастала апантанае публічнае цкаванне Грамады. Кансерватыўная прэса, правыя групоўкі ў парламенце заядла нагаворвалі і пад'юджвалі адміністрацыю і паліцыю, суд — усе рэпрэсіўныя органы расправіцца з «гідрай». Легальная Грамада

ў гэтых умовах стала мішэнню, б'ючы па якой, ахоўнікі рэжыму траплялі ў падпольны актыў КПЗБ. Тое, чаго так баялася Роза,— растварэння падпольных камуністычных ячэек у легальных гуртках Грамады, у нейкай меры спраўджвалася: за грамадскую работу плацілі турмой камуністы.

Складвалася, як кажуць, пікавая сітуацыя: чым больш нарасталі рэпрэсіўныя дзеянні ўлад, тым менш было шанцаў у камуністаў захоўваць дыстанцыю ад легальнага вызваленчага руху. Маса радавых грамадаўцаў зразумела б такі манеўр як падвох, разрыў саюза ў цяжкую часіну. Зрэшты, персанальныя повязі кіруючага актыву КПЗБ з актывістамі Грамады проста не дазвалялі правесці на практыцы сепарацыю. Заставалася адно: удасканальваць тактыку ўзаемадзеяння, вучыцца больш тонка канспіраваць сувязі падполля з легальным пластом вызваленчага руху. Інакш КПЗБ не мела мажлівасці зберагчы свой актыў і асабліва кадры прафесійных рэвалюцыянераў, кіруючае ядро падпольнай партыі.

У канцы 1926 года пайшлі чуткі, што паліцыя рыхтуе новую серыю судовых працэсаў над арыштаванымі дзеячамі Кампартыі і Грамады з намерам ачарніць у вачах грамадскасці Грамаду як рух, «інспіраваны» камуністамі і аплочваемы з-за мяжы. Урад хацеў падрыхтаваць польскую грамадскасць да расправы над Грамадой, якая станавілася бяльмом на воку санацыйнага рэжыму. Набліжалася пара новых выбараў у парламент, і пілсудчыкі ведалі, што Грамада патрапіць увесці ў парламент яшчэ больш сваіх дэпутатаў, чым іх мела цяпер. А ў разліку Пілсудскага ўваходзіла аслабленне парламентарызму. Вось у гэтай абстаноўцы рыхтавалася новая хваля судовых палітычных працэсаў. Сведкам абвінавачання на судовых працэсах меўся выступаць даўні верхавода «сэцэсіі» Міхась Гурын-Маразоўскі.

Кастрычніцкая дэманстрацыя ў Карэлічах удалася на славу. Паліцыю ахапіў шок ад самой прысутнасці, небывалай у гэтым невялічкім мястэчку, соцень фурманак і некалькі тысяч прыезджых людзей. З часоў шляхецкіх наездаў, каларытна апісаных Міцкевічам, не памяталі Карэлічы такой табалы. І натоўп аказаўся на дзіва арганізаваным, ведаў, чаго хацеў. Мітынг і дэманстрацыя, што накіравалася да будынка гміны, прайшлі без інцыдэнтаў. Улады адчулі, што грамадскую пагоду ў наваколлі робяць не яны. Паліцыя, відаць, атрымала

ўшчуванне за слабую інфармаванасць і пачала ліхаманкава шукаць і засылаць у падполле тайных інфарматараў, канфідэнтаў. З'явіўся ў Карэліцкай зоне нават агент буйнага рангу, але пратрымаўся не доўга. Паліцэйскі патруль неўзабаве выявіў прыбітую да парэнчы моста ў Ярэмічах таблічку, у якой невядомы звяртаўся да каменданта і прапанаваў пацягнуць за драціну, што спускалася з моста ў Нёман, і выцягнуць сваю прапажу. На канцы драціны, пад вадой, аказаўся тапелец, у якім паліцыя апазнала свайго агента «Кузьму». Помсцячы наўгад, улады арыштавалі групу грамадска актыўных людзей: у мінулым удзельніка грамадзянскай вайны, Уладзіміра Царука і нават Паўла Жалезняковіча, які працаваў парабкам у памешчыка Кашыца. На іх усклалі віну за забойства і асудзілі на пажыццёвае турэмнае зняволенне.

У падполлі Альшэўскі шмат наслухаўся расказаў пра допыты, пра катаванні ў дэфензіве. Лацінскім словам дэфензіва — абарона — называлі ўлады органы контрразведкі, тайнай паліцыі і следчай службы. Польская буржуазія сама наступала на працоўных ды скрозь трубіла, што абараняецца ад наступу камуністаў, ад змовы супраць дзяржавы. Анатоль часта ўяўляў сябе ў кіпцюрах дэфензівы. Асабліва чамусьці страшныя ўяўленні прыходзілі перад сном і ў сне, пасля трывожнага дня. Яму ўяўляліся скажоныя нянавісцю твары следчых, адчуваў нават удары гумавых палак — найноўшага тэхнічнага вынаходніцтва. Фізічна адчуваў, як яму на допыце звязалі рукі і ногі, улілі ў нос нафту... Спрабаваў цяпер уявіць на допыце таварыша Мертэнса. І бачыў толькі насмешліва прыжмураныя вузкія вочы ды схаваную пад вусікамі насмешку. Высока тырчаў яго ўпарты падбародак. Твар Мертэнса рабіўся скульптурным. Юрка памыкаўся паставіць побач з гэтаю бронзай мармуровы бюст Веркі, але нічога не атрымлівалася. Верчын твар заставаўся жывым, гарэзным, не застываў, не камянеў

## «УСЫПКА»

У студзені 1927 года ў адным з раёнаў Варшавы ўпотай сходзіліся на нараду кіруючыя работнікі КПП і КПЗБ. Сітуацыя была вельмі складаная. Пілсудчыкі пачулі сябе бяспечнымі і пэўнымі ля дзяржаўнага руля, пачалі выпрабоўваць палітыку

санацыі на землях Заходняй Беларусі: Грамаду аб'явілі партыяй, «апанаванай» камуністамі, шкоднай і падрыўной. Паліцыя па сігналу зверху кінулася шукаць факты антыдзяржаўнай работы, сакрэтныя дакументы, зброю ды цынічна граміла нізавыя гурткі, закрывала клубы і чытальні, захоплівала ўсю літаратуру на беларускай мове, бланкі партыйных дакументаў, нават партыйныя грошы, і скрозь арыштоўвала актывістаў. Каб прыдаць паліцэйскаму разгулу бачнасць рацыі, у Брэсце быў наладжаны вялікі судовы працэс над актывам акруговага камітэта КПЗБ. На лаву падсудных пасадзілі 31 чалавека, сярод іх Веру Харужую як прадстаўніка ЦК КПЗБ па рабоце з камсамолам. Падсудныя былі арыштаваны ў асноўным яшчэ да ўтварэння Грамады — у 1925 годзе, але суд над імі ўсё роўна быў разлічаны адцягваць увагу грамадскасці ад паліцэйскага тэрору ў адносінах да Грамады.

Кіруючаму актыву Камуністычнай партыі трэба было абмеркаваць становішча.

Юрка Пружанскі звычайна прыходзіў на нарады пунктуальна. Калі ён пераступіў парог явачнай кватэры, якую здымала падпольшчыца Юхнавецкая, замест гаспадыні яго сустрэла паліцыя. Абшарылі ад галавы да пят, пад рэвальверам завялі ў бакавы пакойчык. Неўзабаве ж туды прыгналі і яшчэ аднаго наведвальніка «спаленай» яўкі — Шайкоўскага. Правілы і этыка падполля забаранялі прызнавацца пра знаёмства на вачах у ворагаў. Арыштаваныя сядзелі адзін супраць аднаго, напускаючы на сябе выгляд пакрыўджаных без віны. Але як толькі цеплыня і ўтульнасць пакоя размарылі сышчыка, які іх пільнаваў, падпольшчыкі знайшлі агульную мову. Раптоўна накінуліся на ахоўніка, звалілі на падлогу, вырвалі зброю і заткнулі рот кляпам. Сышчык вырываўся, адчайна лупіў нагамі, і покуль яны разглядаліся па пакоі — чым бы звязаць палоннага,— той злаўчыўся і брыкнуў нагой у тумбачку, на якой стаяла лямна. Грукат, дым і пах нафты пайшоў па ўсёй кватэры. Гаспадары, якіх трымалі ў трэцім накоі, перапалохаліся, пачалі крычаць: «Пажар! Гарыць ратуйце!»

Трэба было ўцякаць. Шайкоўскі паспеў яшчэ ўпоцемку ўдарыць шпіцля рукаяццю трафейнага пісталета на карку. Той перастаў шаматацца, заціх. Альшэўскі дастаў з кішэні агента ключы ад пакоя, адамкнуў дзверы і выбег першы на калідор, Шайкоўскі следам за ім. Вобмацкам прабраліся на гарышча,

каб па лесвіцы іншага пад'езда падацца на выхад. Альшэўскі ішоў першы, Шайкоўскі з трафейным пісталетам — за ім. Вось ужо канчаецца лесвіца, засталося тры крокі — і воля. Сваё моцнае дыханне не дае распазнаць цішыню. Альшэўскі стаў, прыслухаўся. Здаецца, нікога няма — удалося! Ён рашуча ступіў да дзвярэй, і раптам з цемры зусім блізка лязгнуў затвор і пачуўся піскрівы з перапуду выкрык: «Стой! Страляю!»

Падпольшчыкі ведалі, што ў такіх сітуацыях самы небяспечны сярод ворагаў — баязлівец. Са страху ён такі стрэліць. Нападаць на ўзброеную засаду праціўніка было безнадзейна і недарэчна: дом быў акружаны, усе хады і выхады прадбачліва забяспечаны паліцыяй. У трывожнай цішыні Альшэўскі пачуў, як бразнуў аб нешта дашчанае выкінуты Шайкоўскім браўнінг. Анатоль збочыў на крок і прыліп да шула. Фортка дзвярэй з двара адчынілася і засланіла яго. Два дулы, лязгаючы адно аб другое, усунуліся ў праём. Вось-вось грымнуць стрэлы па Шайкоўскаму. Анатоль спрабаваў адарвацца ад вушака, але адчуваў, што цела не слухаецца яго.

— Не страляць! Я – член ЦК! - вырвалася ў Альшэўскага, і ён не пазнаў свайго голасу. Абмяклы, абыякавы, выйшаў з-за дзвярэй.

Не заўсёды дабро для чалавека развітая ўражлівасць…

Праз некалькі секунд, калі святло паліцэйскага ліхтарыка ўпала на яго твар, Альшэўскі ўжо ўсміхаўся і жартаўліва жмурыўся. «Што тут, маўляў, за прыгода, якоесь непаразуменне». Іх акружылі паліцэйскія ў мундзірах і «тайнякі» ў цывільным адзенні, усе ўзбуджаныя, задыханыя, як харты на паляванні.

— А, пся крэў, папалася жыдакамуна! Альшэўскі абурыўся, загаварыў жаргонам варшаўскіх піжонаў:

— Панове владзо!.. За каго мяне маеце? Я з тым фацэтам у камітыве? Іду ад дзяўчыны…

…Альшэўскі апрытомнеў, адчуўшы холад і боль. Абмацаў пальцамі камяні бруку пад галавой. Адчуў на губах саланаваты смак крыві.

— Адзін ужо вяртаецца з таго свету.

— Не з таго свету, а ад дзяўчыны фраер вяртаецца,— іранічна хрыпеў іншы голас.

Усвядоміў, што адбылося толькі ў кузаве паліцэйскай машыны. Допыт пачаўся з ходу: —- Назавіце ваша сапраўднае прозвішча.

— Я не буду адказваць ні на якія пытанні, покуль не дасце мне абмыць кроў... і бруд ад лап вашых спадручных.

— О, які ганаровы, шэльма. Штось такое!.. Чырвоны арыстакрат,— здзекваўся следчы, але загадаў канваіру завесці арыштаванага пад умывальнік.

Варшаўская паліцыя ведала пра яго больш, чым ён спадзяваўся. Адразу ўстанавілі прозвішча і дапытвалі жорстка і метадычна. Следчыя абыходзіліся з ім, як з агентам чужой дзяржавы, асобай, якая апынулася па-за аховай закона, суб'ектам, чыя смерць на допыце лёгка спішацца.

Вясёламу, рухаваму, жваваму па натуры чалавеку вельмі цяжка прывыкаць да цеснай каменнай адзіночкі. Ратаваўся ад упадку духу, успамінаючы Веру Харужую, якая пасля звонкага працэсу ў Брэсце зноў трапіла пад следства, ужо ў складзе іншай, яшчэ большай групы кіруючых партыйных работнікаў, і таксама сядзела недзе ў поўнай ізаляцыі, чакала суда.

Натхнёная, звонкая Вера і стрыманая, дзелавітая Роза разам прыходзілі ў думкі вязня, хоць у жыцці сустрэцца ўтраіх разам не давялося. Ён адчуваў, што недзе на волі Роза метадычна і нетаропка робіць усё, каб абараніць яго ад судовай расправы. Ён адчуваў яе руку ў першай пасылцы, якую атрымаў з МОПРа ад Стэфаніі Семпалоўскай, пазнаў яе клопат і ў паведамленні, што бараніць яго будзе славуты адвакат. Роза была як частка яго самога, пакінутая там, на волі. А Вера была як бы ім самім, вязнем асобага рэжыму. На сабе ён адчуваў яе нясцерпную прагу свабоды, жаданне вырвацца на волю і зноў ісці шляхам змагання. Цераз яе, як яму здавалася, вучыўся перамагаць сябе, трываць тады, калі трываць немажліва. Недзе на дне душы знаходзіў задаволенасць у тым, што вось собіла яму раздзяліць яе лёс, яе цяжар. Думаў, што цяпер, калі вестка пра яго ўсыпку дойдзе ў Брэсцкую турму, дык Вера адменіць сваё колішняе «пракляну». Пратрымаўся ж ён досыць доўга.

Анатоль адчуваў сябе пры Веры, як пры строгай старэйшай сястры, хоць розніцы ў гадах паміж імі істотнай не было — некалькі месяцаў не лічылася. Аднак лічылася яе

няспынная і нястомная мабілізаванасць, гатоўнасць з усёй суровасцю судзіць сябе і ўсіх, да каго мела дачыненне.

Часам Анатоль спрабаваў разгадаць таямніцу сваёй камеры, стараўся ўявіць людзей, якія тут пакутавалі да яго. Можа, тут сядзеў адзін з герояў Варшаўскага падполля — камуніст Гібнер ці камсамолец Руткоўскі або Кнеўскі, нядаўна асуджаныя на смерць. Пра што думалі ў апошні час гэтыя таварышы? Пра што павінен думаць камуніст, чакаючы смерці,— пра заслужаную несмяротнасць? Мажліва... Але ж хіба ўтрымаешся не думаць пра маці, пра блізкіх, пра гора, якое ім прынясеш, і пра свае нязбытыя надзеі на маладое шчасце... Усяго, мабыць, не здолее дакладна ўявіць і перадаць ніводны псіхолаг, ніводны мастак слова... Так, пачуццё кроўнай еднасці з братамі па партыі, пачуццё сумленна выкананага абавязку перакрые, павінна перакрыць усё астатняе. Юрка адчуваў, што ён не адзін і што ён застанецца насуперак смерці. Гэта напаўняла гордасцю. Заўважыў, як паскаралася дыханне, а ў вушах выразна гучала мелодыя песні, якую яны, камсамольцы, спявалі там, за Вільняй, у лесе Веркі, на сваёй канферэнцыі. Спявалі напаўголаса. Запявала Вера, і кожны, далучыўшыся, прыўзнімаўся над будзённымі жаданнямі і чалавечымі межамі, над сваім зямным лёсам. Песня ўздымала над небяспекай, над віною за хваляванні родзічаў і сяброў, акунала ў ясноту, у сонечнае ззянне вялікай ідэі, дзеля якой яны жылі і дзеля якой варта было жыць:

Если дрогнут при ударе
ряды измученных борьбой,
восставший юный пролетарий
подхватит флаг своей рукой!

Допыты ў дэфензіве хутка закончыліся. Пачалося следства судовае, як кажуць, па ўсёй форме і без прымянення сілы.

Альшэўскаму дазволілі атрымліваць газеты і кнігі, пісаць пісьмы родным і знаёмым. Ён разумеў, што гэты дазвол быў не ад добрага сэрца. Следчыя хацелі шырэй раскрыць яго сувязі і знаёмствы з людзьмі на волі. Але Анатоль нават са знаёмымі і таварышамі па турме стараўся не кантактавацца,

ажно да пары калі адбудзецца суд. І неўзабаве ўпэўніўся, што дзейнічае правільна. Аднойчы яго вывелі на праходку, і, нібы выпадкова, ён сутыкнуўся вочы ў вочы са Стэфанам Мертэнсам. Абодва прайшлі міма, не падаючы выгляду, што знаюцца. Стэфан не павёў нават вусам. Затое адвячоркам Анатолю перадалі ў камеру патайную пісульку: «Вывучаю статыстыку і двойчы сустрэўся з мамай. Рабі тое ж. Дапамагае. Трымайся! Стэфан». Анатоль адчуў нейкі прыліў дзіцячага шчасця, як калісь у саюзе «Дзетвара», калі яго хвалілі дарослыя за спраўную работу. Вельмі хацелася пакінуць на намяць Стэфанаву пісульку. Але ён ведаў, чым гэта пагражае. Зноў прыгадалася забытая ўжо чутка пра фотакартку Мертэнса, якую нібыта знайшлі пры арышце ў Веры. Юрка знішчыў аркушык папяроснай паперы, на якой былі напісаны друкаванымі літарамі цёплыя словы.

З усіх дазволаў Анатоль цалкам скарыстаў толькі адзін — перапісвацца з роднымі. І гэтая перапіска, як сонечны праменьчык, нарэшце звязала яго з рэальным светам, з сённяшнім днём, з роднаю хатай. Пісьмы ён пісаў, разумеючы, што яны будуць перачытвацца следчым, пракурорам і турэмным начальствам, а толькі пасля — родзічамі. Але ўсё ж яны дойдуць і да блізкіх, каму адрасаваны. Там, на волі, па яго пісьмах і настроях будуць меркаваць аб маральнай вынослівасці падполля, якое ён увасабляе.

«Не ведаю,— піша ён 21 сакавіка 1927 года,— ці атрымалі вы маё першае пісьмо, якое я пісаў у канцы студзеня, праз некалькі дзён пасля майго арышту... Пісаў я там, што мяне вінаваццяць за прыналежнасць да Камуністычнай партыі, пісаў, як непрыемна мне гаварыць вам пра ўсё гэта пасля васьмі гадоў разлукі, прасіў прабачыць мне за тыя прыкрасці, якіх вам набавіць, напэўна, гэты мой арышт. Але, галоўнае, моцна прасіў я вас не хвалявацца за мяне. Мяне абвінавачваюць па 102 артыкуле крымінальнага кодэкса, які дапускае пакаранне ад чатырох да васьмі гадоў. Цяпер яшчэ ідзе следства, да суда яшчэ далёка, сяджу вось ужо два месяцы ў адзіночцы Макатоўскай турмы. Спачатку было цяжкавата прывыкаць да адзіноты. Ну, а зараз ужо прывык і яшчэ раз пераканаўся, што няма нічога такога на свеце, да чаго б чалавек не мог прывыкнуць. Канечне, той, хто мае кроплю чалавечай годнасці, любіць жыццё, любіць прастор палёў, творчую працу... і, калі

ўсё гэта хоць часова адбяруць,— цяжка робіцца на душы. Але чалавек павінен шукаць новыя крыніцы сілы, каб развіваць свае веды, змагацца, ісці наперад.

Чалавецтва за многія гады прыдбала такія багацці думкі, што, пазнаючы іх, сорам сумаваць. У турме ёсць вельмі добрая бібліятэка, я шмат чытаю і ў кожнай кнізе адкрываю новую часцінку гэтых скарбаў. Дык вось, мае родныя, значыць, сядзім, працуем над сабой, прыбаўляем да жыццёвага вопыту кніжныя веды».

У кожным новым пісьме ён паўней, свабодней раскрывае свае адчуванні, роздумы, пераконанні.

«Асаблівых навін няма,— піша Альнэўскі 31 мая.— Сённяшні дзень падобны на ўчарашні, а заўтрашні будзе падобны на сённяшні. Калі можна гаварыць пра нешта новае, дык гэта пра свае думкі. Думка няспынна працуе, пераканаўся, што, у рэшце рэшт, няма больш высокіх асалод, чым духоўныя. Усё праходзіць, мімалётныя радасці прам'наюць, не пакідаючы глыбокага следу, толькі духоўная праца абнаўляе чалавека».

Духоўныя запатрабаванні дапамагаюць вязню захаваць раўнавагу і бадзёрасць. Дапытлівага чалавека з разбуджанымі сіламі душы цяжка зламаць турмой, бо і тут ён знойдзе спосаб, каб праявіць хоць некаторыя свае духоўныя зацікаўленні. Паглыбляючыся ў вывучэнне філасофіі, Альшэўскі не траціць смаку да зямных чалавечых радасцей.

«Кашуля,— чытаем мы ў пісьме за 20 мая,— якую вы прыслалі мне як падарунак,— цудоўная. Пра такую менавіта я марыў. Дзякуй Зоі і цалую моцна, моцна. На палітвязняў, што сядзяць са мною, кашуля гэтая зрабіла вялікае ўражанне: «Беларуская кашуля!..»

І ў турме ён не быў зусім адзінокі. Сябры па ідэі прынялі яго ў турэмны калектыў, тыя, што засталіся на волі, вялі барацьбу за яго вызваленне. Нават родным дапамагалі матэрыяльна. Маці цераз адвакатаў дабілася нарэшце дазволу наведаць сына. Паказаўшы дакументы наглядчыку, яна з годнасцю патрабавала сустрэчы. Такая пастава маці асуджанага раздражняла вартавых:

— Гэта шаноўная пані нарадзіла такога злачынцу і не выказвае скрухі? Ахвота сустракацца з такім крамольнікам…

— Я выхавала сумленнага і добрага сына,— спакойна адказала маці.— Ён не злодзей, не забойца, ён ахвяруе сваю маладосць дзеля шчасця іншых людзей.

— Ого! Мамуся-агітатар. А з выгляду цалкам прыстойная пані,— панура бурчэў наглядчык, але на сустрэчу дапусціў.

Вялікай і пустой здалася маці казённая зала сустрэч, а Толя яе выглядаў такім маленькім, здрабнелым. Ён заўважыў матчын боль і стараўся бадзёрыцца, развясельваў яе. Адно рукі хаваў між каленяў, седзячы на казённай табурэтцы.

Другі дазвол на сустрэчу атрымала Зоя. На Усходнім вакзале Варшавы яе пераняці незнаёмыя людзі і, назваўшыся сябрамі Анатоля, завялі на кватэру, дзе яе чакала высокая, па-гарадскому апранутая дзяўчына.

— Роза,—- назвала яна сябе.— Мы дружым з Толем.

Агледзеўшы Зою крытычным позіркам, яна загадала:

— Распранайся, надзенеш вось гэту сукенку,— Роза дастала з шафы пашытае па модзе адзенне.— Сястры Альшэўскага нельга выглядаць такою правінцыялкай. Кожны сталічны пан, нават наглядчык, цэніць шык. На іх дзейнічае вопратка і манеры. У табе павінна быць незалежнасць, самапавага. Не дапускай жаласці, бо падумаюць, што брат вінаваты. Трымайся горда.

Роза навучыла дзяўчыну, як паводзіць сябе з наглядчыкамі, як размаўляць з братам, і прымусіла завучыць на памяць і абавязкова сказаць яму некалькі як быццам звычайных фраз, у якіх Зоя не ўлавіла скрытага сэнсу. Тэрмін сустрэчы кароткі. Ледзь паспела Зоя выканаць даручэнне Розы і сказаць: «А старая каплічка пад Пінскам яшчэ стаіць. Ты будзеш мець найлепшага анёла-стоража», як наглядчык папярэдзіў:

— Астаецца тры мінуты.

Брат сядзеў насупраць і слухаў яе, хаваючы рукі паміж каленяў. Пасля апошняй фразы ён па-змоўніцку падміргнуў:

— Перадай, што за стоража дзякую, каплічку, як выйду, будзем наведваць штодзень.

Зоя нічога не разумела, але падтаквала галавой і старалася ўсё запомніць слова ў слова. Потым пацікавілася:

— Толя, чаму ты хаваў рукі ад маці? І цяпер?.. Той паказаў ёй руку, і Зоя крыкнула ад жаху. На нальцах не было ногцяў, адно крывавыя струны.

Ён не чакаў такой рэакцыі. Знарок гучна засмяяўся, каб перабіць яе спалох:

— Знаеш, Зоя, у Вільні мы аднойчы спыніліся ў гасцініцы. Апранутыя былі прыстойна, вячэру заказалі, адным словам — застолле. І тут як гром з яснага неба — праверка дакументаў. Падняўся пярэпалах.— Тут ён перайшоў на шэпт: — А ў мяне клопат — у руцэ вельмі сакрэтны дакумент. І я пад шумок вось так: праглынуў, як цукерку.— Ён зрабіў глыток і аблізаўся, нават пагладзіў сябе па жываце.— Загорнутую, з абвёрткай. Ну і смачна было! Ніколі такое не еў.

Зоя ўжо ўсміхалася.

— Так, ім трэба паказваць нос...

— Не шаптаць! Канец еустрэчы,— аб'явіў наглядчык, раззлаваны тым, што палітвязень парушыў правіла, а ён нічога не пачуў.

Зоя прыгадала тут павучэнні Розы, развіталася стрымана і прайшла міма стражніка паходкаю каралевы.

Хоць турэмны час, як кажуць, едзе на валах, але і на месцы не стаіць: пра «ўсыпку» даведваліся ўсё новыя і новыя людзі, сябры і знаёмыя. І, не баючыся трапіць на зуб паліцыі, людзі, нават далёкія ад палітыкі, падтрымлівалі яго. Усё часцей у пісьмах Альшэўскі дзякуе даўнім знаёмым за памяць і любоў. Пасля сустрэчы з сястрою ён напісаў:

«Зоя расказвала мне, як маці і яе чакалі родзічы і знаёмыя, я рады, што так жыва цікавяцца маім лёсам. Хацеў бы я сам падзякаваць усім вам за памяць. Калі-небудзь ды падзякую сам, асабіста. Я веру».

Ён чула цікавіўся ўсім, што адбываецца дома, пачаў завочна ўдзельнічаць у сямейных нарадах, добрым словам данамагаць Зоі і малодшаму брату Міцю. Даведаўшыся, што ў школе Міця не можа справіцца з польскаю мовай, ён просіць:

«Думаю, што Зоя і мама будуць сачыць, каб Міця рэгулярна пісаў мне доўгія пісьмы і такім чынам забіваў двух зайцаў: дастаўляў мне вялікую радасць і практыкаваўся пісаць па-польску».

Сумуючы ў турэмнай пустэлі па родных і блізкіх, ён узяўся нават кіраваць пазакласным чытаннем брата і сястры, падбіраў для іх творы польскіх пісьменнікаў, на яго думку, асабліва карысныя для выхавання. Першым у спісе ідзе «Лялька» Пруса, затым «Бяздомныя людзі», «Прадвесне» Жаромскага. Чаму Альшэўскі вылучаў менавіта гэтыя творы з усёй польскай літаратуры? Два нершыя станавіліся тады класікай польскай прозы, але ж прадстаўлялі ў ёй два розныя ідэйныя і эстэтычныя кірункі: пазітывісцкі і неарамантычны.

«Прадвесне» Жаромскага вяртала яго думкі да памятных дзён, перапоўненых высокімі шчымлівымі ўзлётамі духа, якімі жыў ён з сябрамі і сяброўкамі ў Арзамасе, Маскве, Пружанах. Анатоль зноў і зноў пачынаў адчуваць той напорысты і заманлівы час, азораны надзеяй злавіць блакітную птушку шчасця, устанавіць царства справядлівасці і братэрства між людзьмі. З тых пор ён ведаў, цвёрда ведаў, што на зямлі для чалавека няма большага шчасця, чым гэтае адчуванне поўнай свабоды дзеяння і светлай зары наперадзе. Салодка-балючая радасць злітнасці з сябрамі-аднадумцамі ў адно цэлае, у калектыў, які большы і лепшы за кожнага ў паасобку, у тым ліку і за цябе, але і немажлівы без цябе таксама, як і ты без яго. Салодкае тамленне ахвярнасці, цяпло даўняга, такога блізкага і далёкага шчасця агортвала яго душу. «Рэвалюцыя — гэта справа сумлення...» — чытаў вязень маналог Цэзарыя Барыкі, і здавалася яму, што чытае споведзь сваёй уласнай душы. У ім абуджаўся і нарастаў прыцішаны арыштамі і следствам даўні максімалізм, абуджалася дзёрзкая ўпэўненасць у сваіх поглядах, у сваёй ацэнцы жыцця, бо за ёю стаялі гады вучобы, дружбы з кнігамі, барацьбы, пакут, голаду і смерці, адчуванне сваёй растворанасці ў несмяротнай адвечнай масе, якая і была ўладаром гісторыі. Марксісцкія ідэі, якія ён пачаў вывучаць пасля рэвалюцыі ў гуртку Марыі Валяр'янаўны Гопіус, а потым глыбей асэнсоўваць у Свярдлоўскім універсітэце, сутыкаліся ў яго свядомасці з мройнымі ўяўленнямі гістарычнага ідэалізму, якія афіцыйна выкладаліся на ўроках гісторыі ў рэальным вучылішчы. Гістарычная дзея нагадвала там займальны спектакль, акцёрамі ў якім былі выдатныя асобы, а рэжысёрам сам бог. Кожная фраза «Камуністычнага маніфеста» была для яго вялікім адкрыццём і адоленнем самога сябе, адмаўленнем

памылак у свядомасці грамадства. Рэвалюцыя і марксізм увялі яго ў царства свабоды духа, у храм ісціны. Кідалі яго ў скруху суровыя сцверджанні Маркса і Энгельса ў «Васемнаццатым брумера Луі Банапарта» пра ролю асобы і мас у гісторыі. І прыгадаўся Анатолю паэтычны адгалосак, вялікая перыфраза марксавай формулы ў Маякоўскага: «Единица — вздор, единица — ноль...»

Спачувальна думаў Анатоль пра бацьку і сына Барыкаў. Цэзары ўяўляўся яму часам такім блізкім, як родны брат Яраслаў, то зноў — рамантычна-нястрыманым, маланкавым, як Гайдар. Вязень адчуваў у сабе яго шчымлівую прагу справядлівасці і не разумеў, як мог Цэзары, ахрышчаны святым агнём рэвалюцыі, трапіць да пілсудчыкаў, стаць легіянерам і са зброяй у руках выступаць супраць рабоча-сялянскай арміі, фактычна, супраць рэвалюцыі, супраць адраджальнай веры сваёй.

Альшэўскаму здаваліся вельмі знаёмымі размовы старога Барыкі з сынам: горкі пратэст стваральніка супраць сляпых сіл разбурэння, якія міжвольна вызваляла рэвалюцыя. Здавалася, гэта яго родны бацька выказваецца словамі Барыкі, што рэвалюцыя — гэта творчая сіла і праца, яна спакойна і надзейна рухае грамадства наперад па сталёвых рэльсах розуму і прагрэсу...

З захапленнем і ўдзячнасцю, то зноў з расчараваннем і дакорам думаў Анатоль пра аўтара рамана, вялікага мастака слова, які прывёў яму ў камеру-адзіночку новых знаёмых, цікавых людзей, але і засмуціў яго сваім скепсісам, раздвоенасцю. Чаму ў яго гэтыя крытычныя рэплікі ў адрас рэвалюцыянераў? Чаму?..

Неспакойна рабілася на душы ў Анатоля Альшэўскага. Не хацелася вязню прызнаць права на крытыку праметэеўскай ідэі за кім бы то ні было, нават за Жаромскім. А той крытыкаваў вуснамі старога Барыкі, гаварыў крыўдныя рэчы: «Цяпер у палацах заселі камісары, новыя паны...» — Не згодзен!.. Старэчы скепсіс гэта нашаптаў, а не праўда жыцця. Не раскошы палацаў, а справядлівасці шукаем мы. Справядлівасць — адзіная спажыва для душы. Справядлівасць дазваляе адолець усё — холад, голад, нават жах смерці.

Як палёгку прыняў Анатоль заключныя словы маладога Барыкі, правільныя словы: «Рэвалюцыя — гэта гуманізм, чалавечнасць, адзіная справядлівасць...» Вязень згадаў, што менавіта гэтае прызнанне наклікала на пісьменніка гнеў пілсудчыкаў. Яны ж дзеля ўлады імкнуліся задушыць праметэеўскую ідэю служэння народу агнём праўды і свабоды. Рэвалюцыя стала для іх прыступкамі на вяршыню ўлады.

Героі раманаў Жаромскага і Пруса былі, па сутнасці, антаганістамі, увасаблялі дзве арыентацыі, дзве плыні ў польскай нацыянальнай свядомасці: Вакульскі з «Лялькі» — рацыянальную і дзелавую, а Юдым з «Бяздомных людзей» — рамантычную і летуценную. Баляслаў Прус быў прыхільнікам пчалінай работы, якая, паводле яго разумення, лепш за паўстанцкія выбухі, рамантычныя зрывы, што столькі забралі крыві, а ўзамен давалі адну горыч паражэнняў, здолее адрадзіць край, верне плоднасць здзірванелай ніве. І для Пруса прыйдзе нацыянальная незалежнасць — вынік і вянок сацыяльнага прагрэсу. Жаромскі таксама цаніў работу на роднай ніве, але не траціў рамантычнай веры і ў паўстанні. Ён хацеў перадаць паўстанцкую эстафету ад пакалення рамантычнай шляхты ў рукі дэмакратычных нізоў. Стэфан Жаромскі быў для палякаў не проста пісьменнікам — ён быў апошнім нацыянальным прарокам, які ў сваіх патрыятычных вешчаваннях усіх бічаваў за нястачу патрыятычнай любві і ахвярнасці: арыстакратаў і мужыкоў, чыя сляпая нянавісць да шляхты, паводле яго ўяўлення, дапамагла ворагам задушыць паўстанні. У 20-я гады афіцыйная думка выдавала Пілсудскага за таго нацыянальнага героя, які пайшоў прарочым шляхам рамантыкаў, разлічваў на патрыятызм, а не на цягу да прагрэсу і сацыяльнай роўнасці, як гэта рабілі пазітывісты і сацыялісты, выйшаў з чырвонага трамвая на прыпынку «Незалежнасць» і толькі так здзейсніў прадказанні нацыянальных вешчуноў ад Міцкевіча да Жаромскага, здабыў для ўсёй нацыі вольную Польшчу.

Чаму ж заходнебеларускі рэвалюцыянер паставіў раманы Пруса і Жаромскага на роўную нагу? Можа, павярхоўна ўспрымаў творы? Але ж павярхоўнае ўспрыманне павінна было б якраз прывесці да аднабаковасці выбару, да вузкасці, а не да шырыні...

Альшэўскі падышоў да герояў Пруса і Жаромскага так, як падказвала тагачасная палітычная сітуацыя ў заходнебеларускім вызваленчым руху. Ён мог бачыць у жыцці людзей падобных да адзначаных літаратурных тыпаў. Тады ў вызваленчым руху Заходняй Беларусі яны не толькі выступалі, але і супрацоўнічалі паміж сабой: адзін тып — «легальнік», што вёў пчаліную работу ў розных дэмакратычных арганізацыях — ад кааператываў да рэдакцый газет і Беларускага нацыянальнага банка, а другі тып — непрымірымы, ахвярны — бунтар, падпольшчык, паўстанец, які, аднак, у абстаноўцы адзінага фронту цярпеў, калі не ўхваляў, і сціплую працу свайго антыпода. Відаць, Альшэўскаму было важна тое, што для яго сястры і брата героі Пруса і Жаромскага могуць быць прыкладам грамадзянскага служэння, узорам сацыяльнай актыўнасці.

Цяжэй растлумачыць пытанне з «Прадвеснем». Герой яго, Цэзары Барыка, меў, праўда, больш біяграфічнага падабенства да самога Альшэўскага, чым двое папярэдніх. Барыку таксама вайна загнала ў глыб Расіі. Недзе ў горадзе нафтавікоў Баку ён сустрэў рэвалюцыю, набраўся рэвалюцыйных ідэй і цяпер, вярнуўшыся ў незалежную Польшчу, не мог пагадзіцца з існуючымі тут парадкамі. Ён крытыкуе, абураецца і кліча да супраціўлення, але і сумняваецца, баіцца знішчальнай стыхіі.

Па гэтай праблеме вяліся дыспуты ў Віленскай беларускай гімназіі. Аднак Альшэўскі не змог падказаць такога аспекту ўспрымання твора сваім родзічам.

На рахунак Альшэўскага-палітвязня варта запісаць хіба тое, што ён узняўся над вузка асабістым успрыманнем «Прадвесня» і «дараваў» аўтару расплывістасць сацыяльных ацэнак. У раздзеле «Балада пра засмучанага пана вартавога» Жаромскі спачатку абрынваў выкрывальны гнеў на паліцэйскага: «Маеш жа права ўстаўляць карандаш паміж пальцаў, а потым сціскаць іх машынкаю»,— але неспадзявана, быццам апамятаўшыся, пашкадаваў ахоўніка парадку: без яго, маўляў, «людзі павыдзіралі б адзін другому вочы, а з дрыготкіх вантробаў вырвалі б жывую душу, каб растаптаць яе на вуліцы, вось у гэтым балоце». Альшэўскі ўзняўся над ваганнямі славутага мастака і над уласным горкім вопытам, ён вылучыў і

ў гэтым творы пафас грамадскай актыўнасці. Відаць, яшчэ не трапіла да яго напісаная год раней у адной з польскіх турмаў праца Юльяна Бруна-Брановіча, дзе супярэчлівасці Жаромскага акрэслены выразам «трагедыя памылак». Аднак, у прынцыпе, погляд Альшэўскага на творы апошняга польскага нацыянальнага вешчуна быў вольны ад сацыялагізатарскага спрашчэнства. Палітвязень успрымаў і ўлічваў спецыфіку літаратуры, яе эстэтычную шырыню. Альшэўскі хацеў бачыць сваіх родзічаў і сяброў менавіта ў шырокім складаным свеце, у кантэксце сучаснасці. Ён пісаў брату:

«Нельга па Бярозе меркаваць аб усім свеце. Трэба заглядаць далей, а для гэтага патрэбна «добрая кепэлэ»... На сялянскім возе ды на санях далёка не заедзеш, іх замяніць самалёт і аўто.

Мы жывём у цікавую эноху, эпоху ўлады навукі, тэхнікі, ведаў, і трэба станавіцца чалавекам свайго часу, калі хочаш жыць, а не існаваць».

У пісьме ад 12 мая гэты вобраз сучаснасці Альшэўскі расшырае, дапаўняючы сацыяльнымі характарыстыкамі: «...на шырокім небасхіле — прадвеснікі трывожных бур і новых страшных сутычак. Кожны чалавек міжвольна сочыць за падзеямі трывожным позіркам. Так, яшчэ свежае паданне аб крывавым кашмары першай сусветнай вайны. Няўжо ўрок мінулага прападзе дарэмна і чалавецтва дазволіць уцягнуць сябе ў разбуральны віхор смерці?»

Думаючы пра будучыню свайго брата і сястры, вязень бачыць праз турэмныя краты, як абое яны становяцца не толькі культурнымі і адукаванымі людзьмі, але і людзьмі перадавымі, здольнымі свядома ісці ў шэрагу арміі прагрэсу. Гэтае прыгожае відовішча расчуляла і радавала яго.

## НА ШЧАСЛІВЫ КРУГ

Вялікая радасць прыйшла ў камеру Анатоля Альшэўскага хмурым кастрычніцкім днём, калі вязень адганяў тугу адзіноты, прымаючы ўдзел у патаемнай падрыхтоўцы да Кастрычніцкіх свят. Якраз прыпадалі дзесятыя ўгодкі рэвалюцыі, і палітвязні хацелі як найлепш ушанаваць вялікую

дату. У гулкім турэмным будынку, як у вуллі, усчынаўся рабочы гуд. Перастукваліся паміж сабой камеры і паверхі, перашэптваліся вязні на праходках і ў месцах агульнага карыстання — турма накоплівала матэрыял для святочных рэфератаў і гутарак пра Кастрычніцкую рэвалюцыю і яе водгалас у сучасным грамадскім працэсе. Папаўняючыся новымі зняволенымі, а гэта былі пераважна кіруючыя партыйныя работнікі з розных раёнаў Польшчы, турма акумуліравала інфармацыю пра сацыяльныя і палітычныя канфлікты ў маштабах усёй дзяржавы. Звесткі, атрыманыя ад удзельнікаў і сведак рэвалюцыйных выступленняў, дазвалялі ўстанавіць праўду, абвяргаць або ўносіць папраўкі ў карціны, намаляваныя афіцыйнаю прэсай. Анатоль таксама меў сваю дзялянку ў гэтай калектыўнай рабоце палітзняволеных. Ён збіраў звесткі пра расправу над Грамадой. Асабліва ўразілі яго падзеі ў Косаве — магутная дэманстрацыя пратэсту і паліцэйскі расстрэл.

Цяпер, удакладняючы, як гэта ўсё там было, Альшэўскі прыгадваў сабе мястэчка Косава, рыначную плошчу, на якой збіраліся дэманстранты, вуліцу, па якой ішлі са сцягамі і лозунгамі да будынка павятовага старасты, нават дакладна ўяўляў усхваляваны твар сакратара Целяханскага райкома партыі Мікалая Дзяхцярыка, які прамаўляў на мітынгу. Расчульвалі Анатоля факты грамадскай самадзейнасці землякоў. Колькі знаходлівасці праявілі яны ў часе падрыхтоўкі дэманстрацыі! Дзяўчаты пранеслі ў кашолках, у якіх звычайна насілі на рынак грыбы, яйкі ды ягады — чырвоныя палотнішчы сцягоў і транспарантаў, найбольш давераныя і смелыя пранеслі нават пару рэвальвераў для аховы сцяга. Зброя, аднак, не спатрэбілася. Напалоханыя паліцэйскія адкрылі агонь зводдаля. Кулямётамі скасілі шэсць дэманстрантаў, пятнаццаць чалавек паранілі. Але знамянальна было тое, што косаўскі расстрэл не запалохаў абуджаных да грамадскага жыцця людзей. Дэманстрацыя пратэсту паўтарылася 8 сакавіка ў Любішчыцах. Там чырвоны сцяг несла жанчына — Малання Макарэвіч.

Альшэўскі збіраў і ўпарадкоўваў факты змагання са сваіх родных мясцін, і шчымлівае пачуццё тугі агортвала душу. Радзімая хата, родныя мясціны асацыіраваліся чамусьці ў яго думках з воляй. Інакш ён не мог іх успрымаць. З элегічнага

роздуму абудзіў вязня нечаканы выклік у турэмную канцылярыю. Альшэўскі насцярожыўся: няўжо наглядчыкі пранюхалі пра святочную падрыхтоўку? Пазбавяць, чэрці, права карыстацца бібліятэкай... Хаця б не «завесілі» права на перапіску з домам...

Не паверыў насцярожаны чалавек турэмнаму начальству, якое аб'явіла, што Савецкі ўрад вядзе перагаворы пра абмен палітвязнямі і ён разам з Мертэнсам, Гжэльшчакам, Рвалем і Лазарам Аронштамам занесены ў спіс для абмену. Спачатку так і падумаў Анатоль — новая правакацыя, хоць усё абвяшчалася афіцыйна, у пісьмовай форме пад распіску. Вярнуўся ў камеру ўстрывожаны. Неўзабаве па каналу сувязі з волі прыйшло пацверджанне і разам з ім нахлынула ў душу радасць. Сапраўднасць радаснага факту пацвердзіў і Стэфан Мертэнс, які меў паралельную інфармацыю па лініі МОПРа.

Анатоль так праняўся гэтаю звесткай, што адклаў убок сваё захапленне мастацкаю літаратурай і засеў за бягучую прэсу, за публіцыстыку. Хацелася набрацца як мага больш ведаў, патрэбных для выступленняў перад рабочымі і моладдзю там, у Саюзе. Цяпер можна было адкрыта сустрэцца і пагутарыць са сваімі калегамі па рабоце ў ЦК — таварышам Мертэнсам і Лазарам Аронштамам. Мертэнса, аказалася, вазілі ў Беласток і там прадаўжалі следства з намерам далучыць да судовага працэса 133-х над членамі ЦК. Ён расказваў пра гэта з эпічным спакоем, як той асілак з казкі, што любіў спаць пад грукаты грому. У Макатоўскай турме Стэфан Мертэнс падрыхтаваў працу па праблемах палітычнай эканоміі і прафсаюзнага руху ў буржуазнай Польшчы. Анатоля крыху збянтэжыла гэтая цягавітасць: трэба падцягвацца.

У тое прадчуванне радасці, што стала агульным настроем душы, зрэдку нечакана ўрываўся нейкі трывожны акорд, сігнал чагосьці нядобрага. У спіску вязняў, прапанавапых для абмену Савецкім урадам, не было Шайкоўскага. Увогуле, следчыя органы ізалявалі іх з таго самага першага допыту ў дэфензіве, калі ў пакой, дзе дапытвалі Анатоля, увялі скрываўленага Шайкоўскага. Каржакаваты здаравяк, цяпер ён выглядаў жахліва. Пышная шавялюра звісала мокрымі ліпучымі касмылямі, закрываючы лоб. Пухлявыя губы нагадвалі суцэльную крывавую рану. Час ад часу ён сплёўваў на цэментны пол згусткі крыві. Быў ён у

споднняй расхрыстанай і пашкуматанай кашулі. Праз дзірку ў надарваным рукаве вытыркаў пасінячаны плячук.

Анатоль міжвольыіа адвёў позірк ад Шайкоўскага, каб не выдаць спачування. Наперакор унутранаму жаданню, ён прадаўжаў адмаўляцца ад знаёмства.

Варшаўскія газеты ўхапіліся за выпадак з іхнім арыштам. Распісалі справу так, што два агенты Камінтэрна напалі на супрацоўніка паліцыі ў часе арышту, абяззброілі і спрабавалі забіць. Ахвяра нападу знаходзіцца ў шпіталі ў цяжкім стане. Нападаючым пагражае ваенна-палявы суд і пакаранне смерцю.

На шчасце, пабіты ім тайняк выжыў, пагроза палявога суда і смяротнага пакарання прайшла. Анатоля непакоіла тое, што Шайкоўскі заставаўся ў ізаляцыі, не шукаў з ім сувязі нават па турэмным тайным тэлеграфе. Маўчанне таварыша цяжка было зразумець. Думалася ўсякае і было шкада, што няма яго тут поруч, каб можна было па-сяброўску вытлумачыць сваю тактыку самаабароны, давесці, што яна, урэшце, была карыснай абодвум.

Трывожна было Анатолю і за Розу, якая, застаючыся на нелегальным становішчы, так горача непакоілася аб ім, што сама магла стаць здабычай паліцыі. Сумавала душа, што з любімай дзяўчынай ён не мог нават пабачыцца, сказаць ёй шчыры дзякуй...

У стоена-радасным і трывожным чаканні шпарка дабег да канца 1927 год. На другі дзень Новага года вязням выдалі цёплае адзенне, часткова тое, у якім іх затрымала паліцыя, часткова новае — па зімоваму сезону, прысланае родзічамі і апекунамі з МОПРа. Апрануўшы дэмісезонныя курткі, а то і «ясёнкі» вязні змяніліся, што не пазнаць. Гжэльшчак, Альшэўскі і Лазар Аронштам па-інтэлігенцку хадзілі ў капелюшах. Стэфан Мертэнс надзеў сваю ўжо не модную кепачку з верхам пад шахматную дошку. Твары ў вязняў свяціліся радасцю, як у нованароджаных. П'яніла прадчуванне свабоды.

— Колькі раз, Юрка, цябе наведала мама? — не то жартам, не то ўсур'ёз спытаў у Альшэўскага Стэфан.— Мяне — тры!

— Я надоечы бачыўся другі раз. Але раней прыязджала сястра.

— Значыць, будзем лічыць, рэміс[10],— Мертэнс зацягнуўся папіроскай і, прыжмурыўшы левае косае вока, памалу пусціў дымок з-пад вясёлай шчоткі вусоў. Дабрадушны выгляд яго і нетаропкая манера гаварыць — дзейнічалі, як бальзам. Анатоль не разумеў, чаму такі ўраўнаважаны чалавек падтрымлівае фракцыю, якая збірала найбольш задзірыстых, схільных да сектанцкіх перагібаў людзей. Карцела пагаварыць пра гэта, але не дазваляла дыстанцыя ўзросту.

Прысутнасць Мертэнса наводзіла на думкі пра Веру. На жаль, яе таксама чамусьці не было з імі. Гаварылі, што яна цяжка хварэе на туберкулёз. Вера засталася ва ўспамінах адкрыта сяброўскай, але рабілася чамусьці недаступнай. Умацоўвалася даўняе перакананне, што яна нечая дзяўчына. Унутраная хлапечая інтуіцыя пацвярджала тыя чуткі, што сноўдалі ў вузкім коле прафесійных падпольшчыкаў. Там гаварылася, што Вера дружыць са Стэфанам Мертэнсам. І, мабыць, нейкая зайздрасць пераносілася на Веру. Незадоўга да яе арышту Юрка пачаў трымацца з Верай знарок задзірыста, спрабаваў на людзях «прабіваць» свае рашэнні, так што зласліўцы мелі повад гаварыць пра «вождистские замашки» Пружанскага.

Адносіны з Розай складваліся прасцей. Роза прытрымлівалася субардынацыі да прадстаўніка вышэйшага кіруючага органа. Не давала поваду сапернічаць з ёю, хоць і Розе ўпэўненасці ў сабе не трэба было пазычаць. Але амбіцыі ў яе пагашаліся звычайнай цягавітасцю. Юрка ўсміхнуўся да яе ў думках, наткнуўшыся ў кішэні на прадбачліва прысланыя Розай пальчаткі.

Трэцяга студзеня, у абед, палітвязні былі ўжо на пагранічнай станцыі Коласава. Абмен праходзіў у прысутнасці ўрадавай дэлегацыі і камандавання пагранічнай заставы. Фармальнасці былі нядоўгія. Уся група перайшла на савецкі бок, і нечакана госці ўбачылі ў пасёлку спецыяльна збудаваную ў іх гонар святочную арку, на якой красаваўся паміж ёлачнымі гірляндамі прывітальны транспарант. Збоку ад аркі выстраіўся вайсковы аркестр. Вязняў стрэла мелодыя «Інтэрнацыянала». Ідучы да групы вайскоўцаў, апранутых у доўгія кавалерыйскія шынялі і вастраверхія будзёнаўкі, Анатоль міжвольна шукаў

---

10 Роўны вынік, тэрмін са спартыўнага лексікону.

вачыма Яраслава, хоць і ведаў, што той служыць цяпер у Казахстане і збіраецца пераязджаць у Маскву на пасаду выкладчыка вайсковай акадэміі.

Перад ад'ездам у Мінск палітвязні сфатаграфаваліся ўсёй групай на памяць. Старэйшыя таварышы — Стэфан Мертэнс, Францішак Гжэльшчак, Густаў Рваль і Мечыслаў Красінскі селі на лаўку, а Альшэўскі з Аронштамам і яшчэ некалькі чалавек, малодшых, сталі за імі і так зняліся на фоне нейкага драўлянага чыгуначнага склада.

Прывітальныя выступленні расчулілі вязняў. Анатоль ажно да Мінска ўсю дарогу прыгадваў апошнюю сустрэчу з маці:

— Сыночак, родны мой, цяжка было табе гэтыя гады? Чаму ты толькі раз зайшоў да нас?

У вачах маці ён чытаў любасць і смутак. Яе цешыла, што яму не трэба будзе пакутаваць доўгія гады ў няволі, як думалася раней, яна была ўдзячна тым людзям, якія знайшлі спосаб вырваць сына з турмы, але сэрца яе не пакідала трывога: маці ведала, што сын яе не сыдзе з той цяжкай і небяспечнай дарогі, на якую стаў яшчэ падлеткам там, у далёкім Арзамасе. Сэрца маці напаўнялі трывожныя здагадкі і прадчуванні, на твар яе набягаў выраз жальбы, адвечнага смутку ўсіх матак, жанчын, якім з таго часу, як памятае сябе чалавецтва, даводзілася прыносіць трагічныя ахвяры, смуткаваць і аплакваць сыноў сваіх. Ён не мог развеяць яе жальбы ні бадзёрым словам, ні вясёлым жэстам, як развейваў разгубленасць Зоі тады, пры сустрэчы ў турме. Ён вінавата пазіраў ёй у вочы, такія родныя і такія далёкія. Яму здавалася, што на дне вачэй гэтых ляжыць яго лёс, яго будучыня.

— Мамачка, так трэба было,— сказаў ён і пачуў міжвольную крыўдлівасць у сваім голасе.— Усё будзе добра, усё...— І ўжо апраўдваючыся, як калісьці ў дзяцінстве, ён загаварыў: — Бываў і ў Бярозе, і ў Баранавічах. Вы б не пазналі мяне. Надзяваў акуляры, мяняў адзенне, грыміраваўся. Так трэба было.

Я не мог зайсці да вас, павер, не мог... Шкадаваў вас... І добра, што ўсе вы засталіся па-за падазрэннямі, на волі ўсе. Не перажывай за мяне. Бачыш — абышлося. Усе мы на волі — вы, Яраслаў, я. Як гэта добра!

Тая сустрэча ўспаміналася яму часта, яна была апошняй сустрэчай з маці. Апошні раз ён адчуў сябе сынам, хлопчыкам, над якім ёсць яшчэ дарослая апека і ахова. У пісьмах ён будзе яшчэ пісаць пра свае мары вярнуцца ў бязвоблачнае дзяцінства, разумеючы трагічную нязбыўнасць гэтых жаданняў: «Нашы сустрэчы не выходзяць у мяне з памяці. Харошыя яны былі, ці ж не праўда, мая мілая мама?»

У Мінску палітвязняў віталі сардэчна і радасна: мітынгі, вечары на заводах, фабрыках, у школах, рэпартажы на першых старонках газет, інтэрв'ю, публікацыі ўспамінаў... Працоўныя сталіцы хацелі любоўю аддзякаваць ахвярным і мужным змагарам за ўз'яднанне народа. Альшэўскі перажыў вялікае шчасце народнага шанавання. Яго няўрымслівая натура хіба не патрабавала доўга прывыкаць да становішча героя дня? Ды і святочнасць не цягнулася лішне доўга: палітвязні раз'ехаліся па санаторыях, каб набрацца сіл і вярнуцца на арэну класавага змагання пераважна ў ролі байцоў ідэалагічнага фронту.

У пачатку 1928 года Анатоль Альшэўскі зноў шле ў Бярозу пісьмы. Цяпер у іх роздум пра перажытае і ўсхваляваныя апісанні жыцця на волі. Душа яго зноў распрастала крылы. Як дзіця, радуецца ён свабодзе, цяплу, сонцу,— усяму, чым адарыла яго Радзіма.

«Клопаты пра нас, былых палітзняволеных, вышэй за ўсе спадзяванні. Адчуваеш, што ты ў сваёй роднай сям'і, якая цябе любіць, клапоціцца пра цябе, цэніць цябе. Увогуле, я ўжо зноў здаровы і бадзёры, поўны энергіі. Да ўсяго прыплюсоўваецца турэмнае мінулае, калі я навучыўся асабліва моцна любіць волю, калі выпрацаваў жалезную дысцыпліну, калі навучыўся па-сапраўднаму і любіць, і ненавідзець».

Неўпрыцям сын і брат ператвараецца на старонках пісьмаў у гарачага агітатара, пачынае пісаць пра палітыку. Ведаючы, з якіх бедных і мутных крыніц інфармацыі даводзіцца родзічам і землякам пазнаваць жыццё Савецкай краіны, ён шле ім доўгія і займальныя рэпартажы з месцін гістарычных падзей.

«Сёння Першае мая — вялікае свята вясны і працы. Усё ахоплена нейкім пачуццём радасці захаплення жыццём. Горад жыве святкаваннем. Масква кіпіць. Масква гарыць пунсовым

колерам сцягоў, Масква святкуе дзень вызваленай працы, радуецца вялікай радасцю пераможцаў. І нельга не з'яднацца сэрцам, нельга не жыць адным з ёю жыццём, нельга не адчуваць сябе часцінкай гэтай агромнай, па-святочнаму вясёлай масы, якая адчувае сябе гаспадыняй у сваім краі. Першамай тут так увайшоў у побыт усяго насельніцтва, што вы, бадай, не знойдзеце ні аднаго працоўнага чалавека, які б не рыхтаваўся да гэтага свята і не святкаваў яго як дарагі дзень. Кажуць, што сёння на дэманстрацыі было больш чым восемсот тысяч чалавек.

...Сёння па радыё перадалі звестку, што ў Варшаве пэпээсаўскія «баёўкі» стралялі ў рабочых. Вось вам істотная розніца паміж тым, што робіцца тут і там. Тут — радасць перамогі, чырвоны колер сцягоў, там — чырвоны колер крыві, які заклікае наперад, наказваючы «не плакать над трупами павших бойцов».

У другім пісьме Альшэўскі расказвае, як савецкія людзі сустрэлі Максіма Горкага ў час яго вяртання ў СССР з вострава Капры:

«Яго прынялі так радасна, так цёпла, што цяжка апісаць. Ніколі ніводны пісьменнік не меў такое сустрэчы шырокіх мас народа, як Горкі цяпер у Расіі. Не магу ўстрымацца, каб не пераказаць адну прамову Горкага на з'ездзе чыгуначнікаў у Маскве:

«Сардэчна вітаю вас, дарагія таварышы будаўнікі жалезных шляхоў сацыялізма... Я не мог уявіць, што калі-небудзь будзе вось такі дзень, як сёння, што я буду бачыць перад сабой такіх людзей, як вы, такіх цудоўных людзей...

Учора я быў у вашым выдатным Свярдлоўскім універсітэце, у той установе, якая з вашага асяроддзя робіць настаўнікаў, будучую інтэлігенцыю, вашу інтэлігенцыю, вашу кроў і косць, тую, якая стане на месца пастунова адыходзячых нашых правадыроў.

Калі я пабачу такі дзень, як учаранші, як сённяшні, як тыя дні, якія я яшчэ заўтра, паслязаўтра пабачу, калі я не здохну ад радасці, гэта будзе цуд, чорт вазьмі!»

— Жыві доўга! — крыкнуў у адказ нехта з дэлегатаў.

— З прыемнасцю,— адказаў пад бурныя апладысменты і клічы «ўра» Максім Горкі.

— Мне ўвогуле,— працягваў ён,— жыць хочацца! Добра пражыць яшчэ шэсцьдзесят год, таму што жыць з вамі, таварышы, страшэнна цікава, незвычайна цікава».

Так сказаў Горкі... Як вялікі пісьменнік ён здолеў прыкмеціць у тым, што тут робіцца, самую вялікую з'яву ў свеце. Робіцца нябачаная дасюль будоўля — шчаслівай долі, змястоўнага жыцця. Цяжка будаваць, вельмі цяжка! Шмат перашкод, шмат недахопаў. Але хіба можна абысціся без цяжкасцей?.. Хіба можна ныць пра недахопы, калі ствараецца новае жыццё?»

Жыццё рэвалюцыянера поўна нечаканасцей, багата ў ім выпадковых і непрадбачаных учынкаў, так фантастычна спалучаюцца тут удачы з няўдачамі, што нікому не прыходзіць і ў галаву планаваць асабістае шчасце. Спадзявацца можна хіба на шчаслівыя збегі акалічнасцей і мімалётныя ўсмешкі лёсу. Лета 1928 года стала ў жыцці Юркі і Розы такою цудоўнай парой, калі шчаслівыя выпадкі пасыпаліся, як з чарадзейнага рога. Звычайна каскады шчаслівых выпадковасцей ап'яняюць, а потым пачуццё раўнавагі пачынае шаптаць, што недзе чакаюць сваёй чаргі няўдачы і няшчасці...

Анатоля Альшэўскага абмянялі да суда, лёс злітаваўся над вязнем, не дазволіў стаць аб'ектам здзеклівага судовага фарса. Прыезд у Савецкі Саюз супаў з падрыхтоўкай да Першага з'езда КПЗБ, які меў адбыцца ў канспіратыўнай мясціне, саўгасе «Высокае» пад Оршай на Віцебшчыне. Прыехала Роза — цяпер з дакументамі на імя Марыі Шафран. Сябры сустрэліся ў Маскве, былі разам на з'ездзе. Анатоль Альшэўскі зноў быў абраны членам ЦК КПЗБ і накіраваны на работу ў замежную рэдакцыю, якой кіраваў Леапольд Родзевіч. Роза атрымала накіраванне на вучобу ў Камвуз імя Свярдлова ў Маскве.

Захопленыя рамантыкай цудоўных перамен, яны не адразу ўсвядомілі важнасць таго пералому, які пачынаўся ў камуністычным руху Польшчы з прыходам да кіраўніцтва левай «меншасці», узначаленай цяпер Юльянам Ленскім. На Першым з'ездзе КПЗБ думкі дэлегатаў падзяліліся, толькі большасцю ў некалькі галасоў была прынята пастанова аб змене тактыкі ў сувязі са зменай сітуацыі — набліжэннем сусветнага крызісу. У Польшчы захоўвалася яшчэ стабілізацыя, і новыя тактычныя ўстаноўкі не ўсіх пераконвалі. Барацьба

фракцый у КПП не ўцягвала заходнебеларускіх камуністаў, з'езд нязначнай большасцю прагаласаваў за лінію Ю. Ленскага.

У пісьмах, якія шле Альшэўскі з Мінска ў Бярозу, няма трывогі, чуваць узнёслая радасць. Купаючыся ў прамянях славы, нядаўні вязень пачынае нават праяўляць павышаную ўвагу да сваёй асобы. «У вазе прыбавіў 12 фунтаў. Моцна развіўся спортам, пра што сведчыць значнае павелічэнне грудзей і агульнае развіццё мускулатуры. Стаў дужэйшым. На шчацэ — здаровы румянец, нервовая сістэма ўмацавалася, мозг працуе ясней». Не наведвалі ахмялелага радаснага Анатоля трывожныя прадчуванні. Зрэшты, такія прадчуванні не былі б зразумелыя родзічам.

## ЗМЕНЛІВАСЦЬ ЛЁСУ

Прафесіянальнаму рэвалюцыянеру, які ўжо раз пабываў у руках паліцыі, вяртацца зноў у край на падпольную работу было небяспечна і, увогуле, непажадана. Альшэўскага выкарыстоўвалі ў рэдакцыі Прадстаўніцтва як журналіста, на ІІ пленуме ЦК КПЗБ у пачатку 1929 года яго і Леапольда Родзевіча ўвялі ў склад рэдакцый цэнтральных органаў. Ён быў супрацоўнікам партыйных перыядычных выданняў, пісаў артыкулы, лістоўкі і іншыя агітацыйныя матэрыялы для заходнебеларускага чытача. Надрукаваныя на пелюрнай паперы выданні замежнай рэдакцыі ЦК КПЗБ перапраўляліся цераз граніцу і разам з мясцовай прэсай, якая выходзіла з падпольных друкарань Беластока, Вільні, Брэста, накіроўваліся па каналах партыйнай «тэхнікі» ў гушчу мас. Як сведчыць справаздача кіраўніка замежнай рэдакцыі ЦК КПЗБ Леапольда Родзевіча, за восем месяцаў 1929-1930 гг. тут быў выдадзен 31 нумар перыядычнага друку, 19 брашур, 51 лістоўка. Сярод гэтых матэрыялаў былі і творы, напісаныя Юркам Пружанскім.

Пад канец 1928 года Альшэўскі выступае ў друку Савецкай Беларусі, падпісваючы артыкулы сваім сапраўдным прозвішчам. Прыклад яму даваў хіба Леапольд Родзевіч, які здаўна падпісваў прозвішчам апавяданні, што з'яўляліся ў «Полымі» і потым выйшлі асобнаю кніжкай пад назвай «Рэвалюцыйным шляхам», а публіцыстыку (нават у мінскіх часопісах) азначаў псеўданімам Антось Сталевіч. Няцяжка

заўважыць тут прыём канспірацыі, разлічаны на тое, каб увесці ў зман дэфензіву: няхай пакруцяць мазгамі варшаўскія шэрлакі холмсы, хай даходзяць, чаму гэта небяспечны падпольшчык раптам легалізаваўся ў Мінску. Страціў рэпутацыю? Напалохаўся? Хай радуюцца. Папсуецца іх радасць, калі стрэнуць у падпольнай прэсе новыя псеўданімы. Такая тактыка падыходзіла Родзевічу без засцярог, бо ён шмат пісаў і друкаваў апавяданняў і мог стварыць уражанне, што чалавек жыве з літаратурных ганарараў. Альшэўскаму падобны прыём мог залічыцца хіба што авансам. Журналістыка была ў яго дасюль аматарскім і пабочным заняткам, цяпер ён толькі адольваў рубеж прафесіянала. Праўда, меў ён добрыя задаткі: інтэлігентнасць, шпаркасць арыентацыі, тэмперамент, навык выступаць публічна і вопыт работы ў падполлі. А яшчэ яму шанцавала: побач жа аказаўся добры настаўнік — Леапольд Родзевіч, вядучы майстар заходнебеларускай камуністычнай публіцыстыкі. На жаль, толькі не ўсё спрыяла настаўніцтву і вучобе. Сярод маладых пісьменнікаў модна было брацца ў рожкі са старымі. На газетных палосах часам вадзілі рэй безадказныя дылетанты і гарлапаны, падрываючы цану прафесіяналізму.

Родзевіч быў натураю паэтычнай, эмацыянальнай. Ахвяраваўшы партыі імя і талент пісьменніка, падпарадкаваўшы жыццё партыйнай дысцыпліне, ён у душы заставаўся мастаком, адчуваў у сабе і шукаў у людзях праявы чалавечай індывідуальнасці, каларытнасці асобы, умеў ацаніць непаўторнае, жывое, нават калі яно мела гратэскавыя контуры.

Герой апавядання Родзевіча — заходнебеларускі селянін — мог праявіць сябе як персанаж старой інтэрмедыі: «Дзівіўся Яўхім, гледзячы на жонку: яе не так бяда сушыць. Вось яна сабе пастогне, пакрэхча, як вярбіна старая, але не бярэ ў душу свайго гора, не паддаецца роспачы. Дай, думае Яўхім, пачну і я стагнаць, можа, гора сваё выстагну». А калі стогны не памаглі бядзе, дзівак-чалавек прыдумаў іншы спосаб:

«І пачаў шукаць Яўхім пералазу да партыі. Чуў, дагадваўся, што сусед па вёсцы Клім мае дачыненне, даходзіць да Кампартыі. Ну і прыстаў неадчэпна да Кліма.

— Запішы ў партыю, бо не вытрываю».

Апошняя рэпліка вельмі пасуе да любімага Родзевічавага жанру — фацэціі. Нібы недарэчна, але гучыць!.. У публіцыстычных артыкулах Родзевіч таксама любіў увасабляць і канкрэтызаваць палітычныя ідэі, набліжаць да жывога чалавека, «ацяпляць» лозунгі. Лепшыя яго артыкулы напісаны жывою мовай, няма там заношаных слоў і штампаў, трапляюцца мясціны смелыя, ёсць насмешлівыя і разважныя, а разам усё гэта вельмі даходліва, нібыта даверліва расказана знаёмаму, а не пісана для ўсіх і кожнага.

«Гаспадарчйе становішча Польшчы,— чытаем мы ў адным з выступленняў канца 1928 года,— пагоршылася і пагоршваецца. Дзяржаўны бюджэт перагружаны ваеннымі выдаткамі, замежныя крэдыты не паступаюць, і няма надзей на іх атрыманне. Ураджай гэтага года ніжэйшы за сярэдні, а па Заходняй Беларусі і таго горш. На Навагрудчыне і паўночнай Віленшчыне востры недарод». Здаецца, апісанне як апісанне, без прэтэнзій, але на фоне газетнай крыклівасці, якая дзе-нідзе сустракалася, такая прастата была своеасаблівай стылёвай маркай, ледзь не прынцыпам. Прастата, натуральнасць, пераканальнасць... Іх не так лёгка дасягнуць: трэба быць уражлівым, навучыцца ставіць сябе на месца прыдзірлівага чытача і пісаць так, як бы напісаў ён. Толькі падаць яго думкі належыць спраўней і зграбней — прафесійна. Яднанне з чытачом у пачуццях, думках і словах — чыста мастакоўская тамяніца. Справа таленту.

Родзевіч і на вызваленчы рух любіў глядзець, нібы на чалавечую індывідуальнасць, шукаў самабытныя рысы, завастраў і перабольшваў асаблівае. Аднойчы ён заўважыў, што ў параўнанні з Заходняй Украінай, дзе нацыяналістычная буржуазія моцная і рэжым Пілсудскага вымушаны шукаць з ёю згоды, на заходнебеларускіх землях «не то што няма беларускай буржуазіі, але і вельмі тонкая праслойка верхавіны дробнай буржуазіі... І разам з тым ёсць... усхваляванае мора шырокіх працоўных мас, ахопленых вызваленчай барацьбой». Гэтыя меркаванні мелі растлумачыць, чаму польскі ўрад прымяняў у Заходняй Беларусі пераважна палітыку тэрору, а не шукаў кампрамісаў, як на Заходняй Украіне. Пра заходнебеларускага кулака Родзевіч сказаў здзекліва, што за агрызак з панскага стала ён не толькі «душою і целам прадасца», але «і ахвотна асімілюецца, бо ён не толькі аднадворны па класу, але ў

дадатак невыразна ўяўляе сваю нацыянальнасць». Нацыянальная спецыфіка грамадскіх з'яў — рэч важная, але і тонкая, складаная. Беручыся за яе выяўленне, вопытны публіцыст разумее, што тут будуць і суб'ектыўныя меркаванні, будуць, напэўна, памылкі, няўдачы, і ад прыкрасцей яго засцеражэ хіба падтрымка сяброў і давер чытачоў. Родзевіч карыстаўся тым і другім. Але і ён для пэўнасці даваў прачытаць рукапісы артыкулаў супрацоўнікам замежнай рэдакцыі. Сябры ўхвалялі. Не было засцярог і ў Юркі Пружанскага. Названы артыкул выйшаў у першым нумары «Полымя» за 1929 год. А ў красавіку пачалося...

Два выступленні Альшэўскага ў «Звяздзе» ў апошнім месяцы 1928 года наводзяць на здагадку, што ён паспяхова вучыўся прафесіі публіцыста ў Леапольда Родзевіча. Першае выступленне напісаў яшчэ, відаць, стыхійна: фарсіраваў словы, як у лістоўцы, сыпаў штампамі. Малая плошча лістоўкі не дае месца на спрэчку з праціўнікам, там даволі бывае заклеймаваць яго. Але ў артыкуле, які займае цэлы газетны «падвал», адным клеймаваннем не абыдзешся. Чытач жа чакае аргументаванай спрэчкі. Паміж лістоўкай і артыкулам тая ж дыстанцыя, што паміж агітацыяй і прапагандай.

Альшэўскі пісаў пра канфлікт у Віленскай беларускай гімназіі. І не хапіла аўтару, акрамя ўсяго іншага, прамога вопыту, непасрэднага, асабістага ведання той атмасферы, якая панавала ў часе сутычкі. Факты пачуў, відаць, з трэціх вуснаў, апісанне атрымалася прыблізным. Выкрывальны пафас публіцыст направіў супраць адыёзнай, але другараднай фігуры Янкі Станкевіча. Многа месца заняў расказ пра байкот вучнямі гэтага мастадонта буржуазнага нацыяналізму, а фігура галоўнага пагромшчыка вучнёўскай сябрыны дырэктара гімназіі Астроўскага міжвольна адсунулася на задні план. Відаць, узяўся Альшэўскі за малавядомую яму падзею таму, што пачуваў сілу і права зрабіць прынцыповую палітычную ацэнку. Але ідэалагічныя ацэнкі тады толькі бываюць і прынцыповыя, і пераканальныя, калі яны строга адпавядаюць фактам — вынікаюць з фактаў. Тут жа парушалася прапорцыя паміж сціплымі маштабамі прыблізна апісаных фактаў і глабальнаю пасылкай. Факты не дацягвалі да слушнага тэзіса, выказанага ў загалоўку і паўторанага на пачатку артыкула,

што ў Заходняй Беларусі «самы шалёны тэрор выліваецца ў фізічнае знішчэнне рэвалюцыйных элементаў рабочага класа і сялянства побач з шырокаю дэмагогіяй, бачнасцю «ўступак» і «рэформ». Інцыдэнт у беларускай гімназіі, на шчасце, абышоўся без ахвяр. Гіпербалы, дапушчальныя ў жанры лістоўкі, не апраўдвалі сябе ў артыкуле. Падводзіла неспрактыкаванасць публіцыста, тэмперамент заносіў яго.

Інакш і значна лепш напісаў Альшэўскі свой другі артыкул для «Звязды» —«Новая хваля белага тэрору ў Заходняй Беларусі». Ён расказвае тут пра масавыя арышты сярод актыву Таварыства беларускай школы напярэдадні з'езда гэтай арганізацыі. Увесь расказ падводзіць чытача да высновы аб тым, што існуе змова паміж рэпрэсіўнымі органамі буржуазнай дзяржавы і нацыяналістычнай групоўкай Астроўскага — Луцкевіча. Выступаючы на судзе Грамады супраць радыкальнага ядра, гэтыя нацыяналісты намерваліся апанаваць Цэнтральную ўправу ТБШ і павесці культурна-асветны рух па шляху згоды з урадам пілсудчыкаў. Мова публіцыста ачысцілася ад штампаў, стала больш натуральнай, магчыма, не без уплыву Леапольда Родзевіча.

Увесь мінскі перыяд жыцця Анатоля Альшэўскага я меў бы прыемнасць апісаць выключна цёплымі фарбамі, каб віхура фракцыйнай барацьбы не закружыла яго і не сутыкнула са старэйшым аўтарытэтным таварышам, наносячы горкі пыл і сажу на іх адносіны. Кажуць, з песні не выкінеш слова, з дакументальнага ж твора нельга выкінуць факта. Гэтага патрабуе годнасць жанру.

Фракцыйныя перапалкі зноў ахапілі камуністычны рух у Польшчы, калі Альшэўскі сядзеў у турме. Прычын тут было шмат, але галоўнымі трэба лічыць наступленне сусветнага эканамічнага крызісу, абвастрэнне класавых антаганізмаў у свеце і ў краі, незвычайную жорсткасць рэакцыі. Партыя павінна была выпрацаваць новыя формы барацьбы і самаабароны. І вось спрэчкі вакол абнаўлення тактыкі перараслі ў вострую барацьбу.

Публіцысты левай меншасці ўзяліся падводзіць фракцыю Варскага і Кастшэвы пад апартунізм. На іх думку, сусветны крызіс ужо так распаліў антаганізмы ў Польшчы, што час брацца за зброю. У 1930 годзе «Бальшавік Беларусі» апублікаваў рэзалюцыю ЦК КПЗБ пра пастановы пятага з'езда

польскіх камуністаў. Кіраўніцтва яшчэ да з'езда перайшло ў рукі левай меншасці на чале з Ленскім. Новым арганізацыйным метадам партыі была аб'яўлена «дысцыпліпа і канспірацыя», а галоўнаю задачай падполля — «барацьба за вуліцу» і ўтварэнне «масавай рабоча-сялянскай самаабароны».

Жыццё паказала, што гэта былі завышаныя імкненні гарачых галоў. Рэзалюцыя, аднак, запэўнівала, што «партыя згуртавала вакол абноўленага кіраўніцтва КПЗБ і КПП усіх членаў, нягледзячы на прыналежнасць іх да ранейшых груповак, ізалявала непрымірымых і непапраўных прыхільнікаў групы Кастшэвы».

Змена тадтыкі ў КПЗБ супала з няспыннаю хваляй судовых працэсаў над Грамадой. Адносіны да Грамады і да нацыянальна-вызваленчага руху занялі важнае месца ў палітычнай лініі. Партыйныя публіцысты ў артыкулах асуджалі хістанні, праявы панікі і рэнегацтва інтэлігентаў, адрачэнне ад Грамады, якую судзілі ўлады.

Як на цвярозы погляд, факты былі розныя. Кіруючы актыў Грамады ў цэлым аказаўся на высокім ідэйным і маральным узроўні. На судзе стала вядома, што следчыя органы не мелі ў Галоўнай управе нават свайго інфарматара. Ім давялося выцягваць «здохлую кошку» — даўно скампраметаванага і выгнанага з КПЗБ правакатара Міхаіла Гурына-Маразоўскага.

Ветэран правакацыі павінен быў даказаць на судзе, быццам Грамада не самастойная палітычная сіла, а нейкая «прыбудоўка», прылепленая да КПЗБ. Грамадою, маўляў, таксама ўпотай кіруе Камінтэрн.

Гурын рэдка выходзіў з дому, нават у рэдакцыю газеты «Беларускі дзень» заглядаў пад аховай паліцэйскіх агентаў, ды і то раз ці два на тыдзень, хоць значыўся там намеснікам рэдактара. Часта мяняў кватэры, а ўрэшце пасяліўся ў адным доме з начальнікам віленскай следчай службы. Дом ахоўваў спецыяльны патруль. Аднак караючая рука вызваленчага руху дастала адшчапенца. Камуніст Сымон Клінцэвіч застрэліў Гурына сярод белага дня, калі той пераходзіў разам з агентам следчай службы з рэстарана «Джордж» у кафейню на Ягелонскай вуліцы. Сенсацыя абляцела польскую прэсу. Бульварныя газеткі смакавалі дэталь, як Клінцэвіч па-джэнтэльменску абышоўся з гасцямі кафейні: «Панове, вам ніц

не грозіць! Будзьце спакойны!» І ў паліцэйскіх, што наганялі яго, не страляў, толькі ўгору — страшыў.

Простыя людзі маглі сказаць, старое як свет: а ўсё ж ёсць нешта нейкае — ад свайго не ўцячэш... Рэвалюцыйнае падполле магло ўздыхнуць з палёгкай, ухапіць паветра ў грозны час выпрабавання.

Следчыя органы пачалі спехам шукаць замену Гурыну. І ў нейкай меры знайшлі сабе памагатых сярод так званых «экспертаў», спецыялістаў. Кіраўніцтва Грамады прыцягвала іх для выканання асобных даручэнняў, якія патрабавалі вузкаспецыяльных кваліфікацый. Выступаючы супраць Грамады ў зале суда яны пачалі дапамагаць пракурору. Гэта былі Радаслаў Астроўскі, Антон Навіна (Антон Луцкевіч) — аглядальнік з грамадаўскай прэсы, Фабіян Акінчыц — юрыдычны кансультант Цэнтральнай управы. Гэтыя «дзеячы», якія ніколі не былі прыхільнікамі рэвалюцыйнай барацьбы, да прынцыповых сакрэтаў доступу не мелі. Іх паводзіны ў атмасферы фракцыйнага напружання выкарыстоўваліся для абагульнення, быццам інтэлігенцыя наогул хісткая і няпэўная.

Павел Корчык у артыкуле «Небяспечныя ўхілы» назваў галоўнаю прычынай няўдач заходнебеларускага вызваленчага руху тое, што на яго чале стаялі інтэлігенты: «Гэтая інтэлігенцкая верхавіна,— растлумачваў публіцыст,— уносіла ў грамадаўскі рух элементы дробнамяшчанскай нацыяналістычнай ідэалогіі...» Такую ацэнку падказвала папулярная сярод «меншасцёўцаў» догма. Яна засланяла марксісцкае палажэнне, што буржуазная інтэлігенцыя — міжкласавая праслойка, таму да яе могуць належаць людзі розных сацыяльна-палітычных арыентацый. Гэта пацвярджалі вядомыя ўсім факты тагачаснага жыцця. У часе суда над Грамадой салідарнасць з вызваленчым рухам Заходняй Беларусі прадэманстравала лепшая частка польскай інтэлігенцыі, выступаючы ў друку і на парламенцкім форуме. Пратэст супраць суровай расправы над Грамадой падпісала і накіравала польскаму ўраду трыццаць вучоных, пісьменнікаў і журналістаў з Чэхаславакіі. Салідарнасць з асуджанымі прывяла ў Віленскім універсітэце да ўтварэння студэнцкай радыкальнай групы Генрыха Дэмбінскага, якая ў сярэдзіне 30-х гадоў стане ядром народна-франтавога антыфашысцкага руху.

Фракцыйная вузкасць скоўвала думкі, перашкаджала бачыць жыццё і творча прымяняць рэвалюцыйную тактыку.

Апантаных фракцыйнасцю публіцыстаў заносіла ў розныя бакі.

Крыху перад тым, як Павел Корчык, сам настаўнік па прафесіі, развенчваў інтэлігенцыю, сябар яго Леапольд Родзевіч шукаў рысы нацыянальнай адметнасці сялянства і інтэлігенцыі ў краі, ахопленым вызваленчым рухам. У адным артыкуле ён заўважыў, што нават кулак станавіўся там нетыповым: страчваў нацыянальную амбіцыю ды лучыўся з польскаю рэакцыяй, шукаў абароны ад патрыятычных сіл усяе вёскі. Пра інтэлігенцыю Родзевіч мог гаварыць розныя вольнасці: «Чаму не паверыць інтэлігенту з іншага класа — у яго шчырасць да пралетарыяту? Чаму не прыняць яго новай прадукцыі, вытворчасці новых ідэй? Мы ж ад краўца, які шыў фракі, прымаем скураныя курткі і талстоўкі».

Многае ацэньвалася са скідкай: вядома, паэт! Фантазія... Юрка ведаў, што Родзевіч смела мог браць на сваю адказнасць рэчы сур'ёзныя. Прадбачлівы быў, незалежны і вязучы. У маі 1925 года, хоць нядаўна толькі з сэцэсіі абтросся і да левых прымкнуў, а ўжо крытыкаваў задуму важака тых жа левых Домскага вывесці на вуліцу першамайскія калоны дэманстрантаў. Гродзенскі акружком на чале з Родзевічам, адзіны ў Заходняй Беларусі, не далучыўся да гэтага: прадбачыў Антось, што паліцыя атрымае ўсіх падпольшчыкаў проста на далонь. Застанецца толькі заціснуць жменю. Так і сталася тады на Брэстчыне, нават часткова ў Беластоку і Вільні. Домскі паплаціўся за перагіб: сышоў са сцэны.

Родзевічу кругом шанцавала: ні разу не пабыў ён у кіпцюрах дэфензівы, як Юрка Пружанскі. Неяк, праўда, яго арыштоўвалі, але даўно, недзе ў часы «Сярэдняй Літвы», ды так і выпусцілі лёгка, без суда. Цяпер Антось быў самым папулярным публіцыстам, пісаў не толькі лістоўкі ці артыкулы, але і прасякнутыя палітыкай апавяданні і баявыя ды сатырычныя вершы. Гэта цанілася: не кожны патрапіць.

Юркава становішча аказалася іншым. Ён цяпер належаў да фракцыі пераможаных. Герой падполля, якога ў Саюзе працоўныя са слязамі радасці сустракалі, слухалі затаіўшы дыханне, ледзь не на руках насілі, апынуўся раптам у складзе фракцыі, якая была пад агнём крытыкі, і сыходзіў

разам з усімі на другі план: чаго добрага, так і ў катэгорыю «непапраўных» можна трапіць. А хіба пераможцы, «меншасцёўцы», без грахоў? Ці яны вышэй крытыкі? Няма ў іх памылак?

Сітуацыя, што складвалася тады ў камуністычным руху Польшчы, непазбежна штурхала Альшэўскага на канфлікт. Мажліва, справай выпадку было тое, што паядыншчыкам аказаўся Леапольд Родзевіч, кіраўнік замежнай рэдакцыі ЦК КПЗБ, дзе тады Альшэўскаму давялося часова працаваць. Вясна 1929 года была для Юркі момантам, здавалася б, неадпаведным для баталій: Юрка хутка стане бацькам — Роза чакала ў Маскве шчаслівай развязкі. Аднак логіка страсцей бывае іншай, чым логіка арыфметычных задач. Там свае паслядоўнасці.

Гледзячы з вышыні нашых дзён не проста зразумець, як увайшоў у фракцыйны азарт Юрка Пружанскі. Чаму не стрымаўся на рубяжы аб'ектыўнасці? Ведаючы яго біяграфію, можна толькі падзівіцца той каварнай сіле, з якою віры фракцыйнасці засмоктвалі і кружылі людзей самастойных, тэарэтычна падкаваных, выпрабаваных грамадска-палітычнаю працай, узвышаных таварыскасцю, дружбай.

Пачалося з выпадку. У сакавіку 1929 года, пры сустрэчы з намеснікам прадстаўніка ЦК КПЗБ у Мінску таварышам М. Блінчыкавым (Мотэле), Юрка зазначыў, між іншым, што ранейшы артыкул Антося пра палітычнае становішча ў Польшчы месцамі разыходзіцца з найноўшымі ўстаноўкамі. Заўвага як заўвага — адпавядала нормам партыйнай этыкі: убачыў памылку — пакажы яе, дапамажы выправіць, бо памылка аднаго таварыша — клопат усіх, яна кладзецца на рахунак усёй партыі. Зразумела і тое, што Юрку як прадстаўніку адхіленай ад кіраўніцтва фракцыі, якой некаторыя дасціпнікі пачалі прышпільваць ярлыкі правых апартуністаў і «хвасцістаў», карцела даказаць, што ён быў і застаецца не менш класава чуйным, пільным і цвёрдым за некаторых «меншасцёўцаў». Жыццё падсоўвала прыклады. Нават у загалоўку артыкула Сталевіча «Імперыялізм польскага фашызму і беларускае пытанне» ён прыкмячаў хібны падтэкст: у палякаў, маўляў, фашызм, а ў беларусаў толькі пытанне. А якое пытанне? Аказваецца — самабытнасць!.. Нацыянальная спецыфіка. Нават заходнебеларускі кулак мае ў Антося сваю

«самавітасць». Антось прапануе мабілізаваць на барацьбу супраць нацыянальнага ўціску ўсю вёску?! А дзе ж класавы падыход? Блінчыкаў усміхаўся, тлумачыў яму вядомыя рэчы пра дзве фазы рэвалюцыі. І паўтараў любімую фразу Мертэнса, што на першай, дэмакратычнай фазе сялянства спяе сваю песню... Юрка не ўступаў, звярнуўся ў Прадстаўніцтва на арбітраж. Чакаў, што туды выклічуць яго і Антося, выслухаюць іх дыскусію як роўнага з роўным. Але кіраўнік Прадстаўніцтва Станіслаў Будзінскі не палічыў справу вартай ажно такой вялікай увагі. Абмеркавалі без Юркі і паведамілі яму, што Антось прызнаў недакладнасці фармулёвак, а Прадстаўніцтва прапанавала яму напісаць новы артыкул, удакладніць там сваю пазіцыю. Так ён і зробіць.

Юрка Пружанскі якраз уваходзіў тады ў новы калектыў «замежнікаў», супрацоўнічаў у рэдакцыі ЦК КПЗБ і быў павышана чулы на прызнанне. Яму здалося, што яго абышлі ўвагай. Тут і пачалі падмываць Юрку віры крыўды. Чалавек чуллівы, ён балюча ўспрыняў тое, што таварышы з Прадстаўніцтва абышлі яго. Закранула гэтая няўвага Юрку за жывое. І ён падаўся са сваімі прэтэнзіямі вышэй, напісаў пісьмо пра артыкул Антося і пра нязгоду з разглядам справы адразу ў тры інстанцыі: прадстаўніцтву ЦК КПЗБ, сакратарыяту ЦК КПЗБ і прадстаўніку ЦК КПП пры Камінтэрне. Фармулёўкі завастрыў так, як гэта рабілася тады ў міжфракцыйных сутычках: Антось, глядзіце, выстаўляе немарксісцкі тэзіс аб поўнай адсутнасці беларускай буржуазіі, прыпісвае Заходняй Беларусі нейкія самабытныя рысы. А што азначае гэтая самабытнасць? Ці не самабытны шлях развіцця беларускага народа? Партыя ж наша, нагадваў Юрка, заўжды рэзка змагалася супраць тэорыі «самабытнасці!» Ці не выходзіць, паводле Сталевіча, што ў беларускім народзе няма і ў паміне беларускай буржуазіі? І ўвогуле,— Юрка перакінуўся на злабадзённую тэму,— Сталевіч не бачыць небяспекі стварэння пілсудчыкамі беларускіх ваенізаваных арганізацый на выпадак вайны з СССР, узброеных атрадаў з той самай буржуазіі, якой, паводле Сталевіча, у беларусаў няма!..

Юрка дамагаўся, каб пытанне аб памылках Сталевіча было пастаўлена на дыскусію ў прэсе і ў партыйнай школе. Атрымлівалася, што ён, свядома ці не, імкнуўся звярнуць на сябе ўвагу. Мажліва, згрызоты пра Шайкоўскага, які чамусьці

пакрыўдзіўся на яго, штурхалі Юрку сцвярджаць сябе, так дэманструючы сваю класавую і партыйную прынцыповасць, быццам нехта ў гэтым сумняваўся.

Прадстаўніцтва паслала на гэты раз артыкул Родзевіча і пратакол свайго абмеркавання ў Вільню, у Сакратарыят (Краёвае бюро ЦК). У суправаджальным пісьме Будзінскі і Блінчыкаў назвалі артыкул Родзевіча «злополучной статьей», але засталіся пры думцы: паколькі Антось (Ігнат) прызнае памылкі і бярэцца выпраўляць іх, дык немэтазгодна разгортваць адкрытую дыскусію ў партыйным друку і партыйнай школе. Сам Антось, заклапочаны канфліктам і абураны Юркавымі ператрымкамі, паслаў 16 красавіка 1929 года апраўдальнае пісьмо ў Сакратарыят. Ён засведчыў на паперы, што памылкі прызнае, агаварыўся толькі, што яны абумоўлены аб'ектыўнымі прычынамі і ні ў якім разе не выцякаюць з яго «палітычнай установкі і лініі». Адначасна з пісьмом ён паслаў гатовы тэкст новага свайго артыкула, дзе былі выпраўлены неадпаведныя фармулёўкі папярэдняга. Антось напамінаў у пісьме, што пра намеры польскага фашызму стварыць ваенізаваныя арганізацыі з заходніх беларусаў, ён гаварыў яшчэ летам 1928 года на нарадзе ў Маскве, а затым у сваім артыкуле «Сялянскія партыі». У канцы пісьма Антось зазначыў, што тэкст яго артыкула пра сялянскія партыі чыталі ў рукапісе паасобныя члены замежнай рэдакцыі ЦК, у тым ліку і Юрка.

З Краёвага бюро прыйшоў адказ, там падтрымалі ацэнкі Прадстаўніцтва. На пасяджэнні ў Вільні ў красавіку 1929 года была прынята пастанова, у якой адзначалася, што Ю. Пружанскі, даючы правільную крытыку асобных памылак артыкула, усё ж тэндэнцыйна прыпісвае т. Сталевічу тэорыю «бяскласавасці беларускага народа і адзіных нацыянальных інтарэсаў усіх беларусаў». Краёвае бюро адхіліла Юркава дамаганне адкрытай дыскусіі і расцаніла гэта як спробу штучна распаліць у партыі спрэчку па пытаннях, якія не выклікаюць у камуністаў рознагалосся.

Такая ацэнка азначала для Юркі фактычна паражэнне. Але ён не збіраўся здавацца, пайшоў на таран: прыдзірліва разабраў усю публіцыстыку Антося і звярнуўся са сваімі высновамі да III Пленума ЦК КПЗБ.

Гадамі працаваў Родзевіч партыйным публіцыстам. Пішучы рэгулярна, ён міжвольна фіксіраваў змены стратэгіі і

тактыкі, рух палітычнай думкі, абнаўленне ацэнак. У пазнейшых працах натуральна адхіляў ці папраўляў ранейшыя. Фіксіравалася на паперы эвалюцыя грамадскай думкі і яго ўласных поглядаў. Кіраўнікі практычнага складу абнаўлялі погляды бясследна, а ў публіцыстыцы — сляды. Напісанае застаецца!.. Родзевіч, мабыць, разумеў пікантнасць сітуацыі, бо часта мяняў псеўданімы. Адмяжоўваў такім спосабам пэўныя этапы ў сваім жыцці, поглядах і творчасці. На пераломе дзесяцігоддзяў ён адхіліў псеўданімы Юргілевіч, Лявон Жыцень, Ігнат Замежны і ўзяў катэгарычны — Антось Сталевіч. Новы псеўданім падкрэсліваў салідарнасць з новаю лініяй.

Не цяжка было знайсці ў Родзевіча ўстарэлыя палажэнні. Яны сапраўды тлумачыліся аб'ектыўнымі, незалежнымі ад аўтара прычынамі, але фракцыйная практыка не прызнавала незалежных прычын...

Антось вымушаны быў 10 кастрычніка 1929 года напісаць на імя III Пленума ЦК КПЗБ заяву, у якой прызнаў цалкам і поўнасцю слушнай крытыку яго «нацыянал-апартуністычных памылак, якія заключаліся ў непрызнанні існавання беларускай буржуазіі». Ён раскайваўся і апраўдваўся: «Я не адразу поўнасцю ўсвядоміў карэнні гэтых памылак, якія ляжаць, галоўным чынам, у нязжытых да астатку перажытках нацыяналістычнага адраджэнчаскага беларускага руху».

Анатоль Альшэўскі перамог, аказаўся на кані, але гэта была не толькі яго перамога, перамагаў левацкі напрамак, дух і стыль у падполлі Заходняй Беларусі і Польшчы. Фракцыя меншасці на чале з Юльянам Ленскім пачынала сцвярджаць сябе, праводзячы новую тактыку, якая звужала палітычныя арыенціры. Неверагодна, але факт, што прыхільнікам звужэння ленінскай шкалы ацэнак сялянскага руху і нацыянальна-вызваленчай барацьбы аказаўся Анатоль Альшэўскі — прадстаўнік фракцыі большасці, якая больш гібка за «меншасцеўцаў» прымяняла марксізм да канкрэтных абставін жыцця, а яго антаганістам — чалавек, які належыў да фракцыі меншасці і сам часамі аддаваў даніну левым ухілам, таму, між іншым, змог так лёгка, як тады гаварылі, «адсамакрытыкавацца». На самай справе ён не заўважаў буйной буржуазіі ў Заходняй Беларусі 20-х гадоў і меў рацыю: буйная буржуазія не паспела тады яшчэ вырасці. Сталевіч

выказаўся недакладна: не ўжыў прыметніка «буйная». Прыметнік падразумяваўся.

Альшэўскі з Родзевічам былі людзі розныя. Абодва гарачыя, эмацыянальныя, уражлівыя, але ў таго, мастака, сілы фантазіі ішлі ў творчую думку, у слова. А Юрка пры ўсёй каларытнасці асобы быў усё ж чалавекам справы, агітатарам, арганізатарам, пастаўленым на работу прапагандыста. Узніклі, відаць, ноткі рэўнасці і зайздрасці да майстра слова, які меў неаспрэчны аўтарытэт у замежнай рэдакцыі ЦК і ў Акадэміі навук, дзе загадваў камісіяй па вывучэнню Заходняй Беларусі, і ў Інстытуце Гістпарта, дзе кіраваў заходнебеларускім сектарам.

Апынуўшыся ў вірах фракцыйнай крутухі, Альшэўскі, напэўна, і не заўважыў, што траціць шчаслівы выпадак стаць пры сяброўскай дапамозе Родзевіча прафесійным літаратарам, упускае шанц паяднаць грамадзянскія пачуцці з асабістымі, што часта і хораша, але стыхійна праглядвала са старонак яго пісьмаў у Бярозу, паднімаючы іх да ўзроўню добрай літаратуры.

Вопытныя партыйныя работнікі з Краёвага бюро і Замежнага прадстаўніцтва ЦК КПЗБ стараліся дапамагчы Альшэўскаму, прынялі нават пастанову, дзе ўказвалі яму на ператрымкі.

Пісьмы Юркі да родных гэтага часу нясуць у сабе нават нейкую павышаную чуласць, патрэбу цеплыні і даверу. У адным з іх, дзе стаіць зваротны адрас «Мінск, Музыканцкі завулак, д. 6, кв. 6, М. Зарэцкаму (для Т.)», чытаем: «Пасылаю вам,—піша Альшэўскі з курорта ў Абхазіі,— пялёсткі ружы і зялёныя галінкі дрэва мімоза. Усё гэта расце тут». Толькі часам яму здаецца, нібыта сямейныя пачуцці трацяць ужо сваю колішнюю абсалютную вартасць і сілу. «Мы жывём цяпер у такую эпоху,— піша ён,— калі вельмі часта сваяцкія сувязі рвуцца толькі таму, што не супадаюць погляды на жыццё. Таму што цэль, мэты жыцця розныя. Сваяцкія пачуцці адыходзяць на задні план перад пачуццямі, якія куюцца ў змаганні з жыццём. Гэта суровая праўда суровых часоў».

Але адчуванне змен у сістэме маральных каштоўнасцей не псуе добрага настрою, не паслабляе заўсёднай замілаванасці да жыцця, цікавасці да найдалікатнейшых яго сфер — кахання, сямейнага шчасця. Звяртаючыся да сястры, якая

збіралася замуж, Альшэўскі заводзіць павучальную гаворку пра шчасце: «Помні толькі адно, мая дзяўчынка, асабістае шчасце людзей ніколі не будзе грунтоўным і моцным, калі яно пабудавана толькі на вонкавым захапленні або на мінутным кіпенні маладой крыві. Для таго каб быць сапраўды шчаслівым, і надоўга, трэба штосьці большае, чым захапленне вонкавым выглядам, чым толькі адны асалоды «раніцы кахання». Трэба, каб людзі разумелі адзін аднаго, каб сыходзіліся ў поглядах на жыццё трэба, каб яны давалі адзін аднаму спажыву не толькі для пачуццяў, а і для розуму, трэба, каб людзі дапаўнялі адзін аднаго не толькі фізічна, а і духоўна, трэба, каб яны ў гэтым супольным жыцці ўвесь час раслі і заўсёды былі адзін. для другога новымі, іншымі».

Абмяркоўваючы перамену ў асабістым жыцці сястры, ён просіць яе не забываць пра бацькоўскую хату. «Наша сям'я надта ж харошая, каб можна было адарвацца ад яе, яна многае дала нам...» Светлай радасцю азараюцца радкі пісьма, дзе ён паведамляе родным пра нараджэнне сваёй дачкі: «Вось так, тата і мама, можаце павіншаваць мяне з дачкою. Праўда, вы не чакалі гэтага. Ну што ж, зрабіў вам нечаканы і, па-мойму, надта прыемны падарунак... Нарадзілася ў Маскве, 17 красавіка. Маці яе вам вядомая Роза. Зараз ужо дзяўчынка расце і здаравее — проста ажно радасць бярэ, калі глядзіш на яе, падобная на мяне: чорныя валаскі і цёмна-шэрыя вачаняты. Імя яе Інга. Імя гэта прыдумаў я ёй. Імя дужа рэдкае і арыгінальнае. Інга! Можна і Іначка, і Інгачка, і Інушанька...

Дачку сваю я палюбіў вельмі моцна, мне здаецца, што і вы будзеце яе любіць як вашу ўнучку, пляменніцу Зоі і Міці. Ваша любоў да маёй дачушкі прынясе мне радасць. Дарэчы, я запісаў яе на сваё прозвішча. Інга Альшэўская! Маці дзяўчынкі адчувае сябе цудоўна, яна ўжо ходзіць ва універсітэт. Вам усім шле самае гарачае прывітанне.

Я ведаю, што многае тут выдасца вам дзіўным, але, бачыце, мы людзі новыя, і ў нас усё гэта выходзіць куды прасцей і лепш».

Былі нейкія сілы ў Юркі, якія ўпэўнівалі, што дзейнічае ён правільна, што крытыка Родзевіча, наат прыдзірлівасць да яго носяць прынцыповы харак-тар і патрэбны справе.

## ЛАНЦУГІ ПРАМЕТЭЯ

Уражлівая натура Альшэўскага хутка пераарыентавалася, пачала ўбіраць у сябе і памнажаць апантанасць ідэяй хуткага рэвалюцыйнага выбуху, прагу расплаты, помсты старому свету, якая прарастала ў камуністычным падполлі 30-х гадоў. Надыходзілі апошнія дні ненавіснага свету капіталу. Здавалася, што патрэбны толькі адзін рашучы ўдар молата, адзін узмах сярпа — і спадуць ланцугі няволі з рук і ног Праметэя.

Збавіцелем закаванага Праметэя, вестуном канца яго нязмерных пакут накіраваўся ў студзені 1932 года Анатоль Альшэўскі ў край, у партыйнае падполле. Гэта быў смелы крок. Чалавеку, які ў выніку абмену палітзняволенымі нядаўна выехаў у СССР, зноў трапіць у лапы дэфензівы азначала не што іншае, як смерць — добра, калі будзе яна хуткай,— ад паліцэйскай кулі, а можа быць павольнаю ў турэмнай адзіночцы пасля калецтва на допытах. Альшэўскі адважыўся на смяротную рызыку, і гэта лішні раз намякае, што зацятасць, з якою крытыкаваў ён Родзевіча, насіла не асабісты і не карыслівы характар. Для яго гэта было прынцыповае сцверджанне сябе, і нам належыць залічыць многае да грахоў міжвольных, памылак аб'ектыўна-гістарычнага характару.

Альшэўскі ехаў у край як кіраўнік Краёвага бюро ЦК КПЗБ, якое — як гэта сабе ўяўляў — неўзабаве можа стаць штабам паўстання і рэвалюцыйнай барацьбы на землях Заходняй Беларусі, першым урадам, што здзейсніць вялікі акт уз'яднання народа ў адзінай сацыялістычнай дзяржаве.

Не віна Альшэўскага і такіх, як ён, гарачых гадоў, што бабуля гісторыя аказалася непаваротлівай. Забастоўкі ў гарадах і хваляванні ў вёсках хоць і дасягалі ўзроўню палітычных актаў, не перараслі ва ўсеагульную стачку і тым больш у паўстанне. Але і стаўка на паўстанне не была голаю выдумкай. За першую палавіну 1932 года ў Польшчы кожны рабочы двойчы ўдзельнічаў у стачцы. На вуліцы выходзілі беспрацоўныя з дзецьмі і жонкамі, патрабавалі: «Працы або ўспамогі!», урываліся ў будынкі магістратаў, білі вокны, разганялі служачых. Колькасць беспрацоўных стала ў час крызіснага піку роўна колькасці занятых рабочых.

У ліпені 1932 года ў Варшаву прыехала змена Краёвага бюро ЦК: Юзэф Кавальскі, Эдварда Арлоўская і Фаіна Цыгельніцкая. Роза з'явілася раней за ўсіх, яна і прымала партыйныя справы ад Альшэўскага і Людвікі Янкоўскай. Яны ўтраіх да змяркання працавалі на канспіратыўнай кватэры. Цэлы дзень гаварылі пра палітыку, пра крызіс, які дасягнуў свайго дна, і адтуль, з глыбінь вулкана, зараз выбухне полымя, прагрыміць... Радаваліся поспехам рэвалюцыі ў Іспаніі, якая зваліла манархію, прадказвалі памысны зыход выбараў у рэйхстаг, дзе сутыкнуліся камуністы з нацыянал-сацыялістамі — гітлераўцамі. Параўноўвалі сітуацыю за мяжой і ў краі, дзівіліся, як гуртуецца міжнародная рэакцыя, не маглі ўразумець, чаму ЦК нямецкай Кампартыі адступіў ад цвёрдай лініі і Запрапанаваў адзіны фронт сацыялістам...

Юрка расказваў пра новыя метады паліцыі, якая замучыла на допытах у Пінску знаёмага ім члена акружкома камсамола Марцінчука і селяніна Кароліка. Уводзіў Розу ў курс шырокай кампаніі, якую вяло бюро, абараняючы жыццё кіраўнікоў Валынскага акружкома КПЗУ, якіх жахліва катавалі ў паліцэйскіх засценках Луцка. Камуніст Сцяпан Бойка быў забіты на допытах, таленавітая рэвалюцыйная паэтэса Ніна Матуліўна захварэла псіхічна.

Настрой кіраўнікоў Краёвага бюро быў мужны і баявіты. Нягледзячы на карныя экспедыцыі, пагромы і жорсткасць, рэвалюцыйны рух, як ім здавалася, ішоў угору, напружанне расло, ідэя ўсеагульнай забастоўкі і перамога рашаючай бітвы за ўладу выглядала дасягальнай, блізкай.

Юрка расказваў Розе пра партыйныя таямніцы, паролі і яўкі, не закранаў толькі таямніц іх асабістага жыцця, якое захацела вярнуцца на колішнюю стадыю дружбы. Былі яны цяпер сябрамі, праўда, больш чым сябрамі, бо абое належалі да пароды максімалістаў і духоўная роднасць іх не трымалася той мяжы, якую звычайна вызначае для сяброўства развага і этыкет.

Альшэўскі выязджаў у Мінск цераз Берлін. Яго чакала сустрэча з Савецкай краінай, дзе гадавалася іх дачка Іна. Выходзячы познім вечарам з кватэры, каб сесці на берлінскі цягнік, Юрка з любасцю і шчымлівым болем пацiснуў Розе руку. Яна адказала моцным поціскам, які мог азначаць і пацвярджэнне палітычнага братэрства, і нешта большае: можа,

трагічнае прадчуванне, што сустрэча гэта — апошняя ў іх жыцці. Развітваліся яны, як належала рэвалюцыянерам,— бадзёра, з традыцыйнымі словамі «Да сустрэчы!». І ў думках дабаўлялі: «На вольнай зямлі».

Перамяшчэнні кіруючых работнікаў заўжды маюць свае глыбінныя падтэксты. Альшэўскі гэта ведаў і, вяртаючыся ў Мінск, напэўна, думаў-гадаў, чым жа выклікана замена ўсяго складу Краёвага бюро? Напэўна, шкада было здаваць справы, пакідаць камандны пункт у разгар лета, якое магло стаць гістарычным часам вызвалення Праметэя. Яны ж стараліся як маглі. І было вунь колькі поспехаў. Забастоўкі шырыліся. Першамайскія дэманстрацыі прайшлі бурна, як ніколі. Кіраўнікі ППС адмовіліся прыняць у свае калоны камуністаў, дык яны знайшлі спосаб і сілу ўтварыць уласныя мітынгі і дэманстрацыі. Рабочыя пайшлі на гэта, хоць ведалі, што чырвоныя калоны стануць мішэнню для паліцэйскіх і можа паліцца кроў.

Альшэўскі меў права з гордасцю ўспамінаць дні і месяцы, праведзеныя ў штабе падполля. За многае яму і яго паплечнікам належала станоўчая ацэнка.

Кіраўнік Краёвага бюро КПЗБ Юрка Пружанскі ведаў, што цяпер з Польшчы ў СССР прабіралася вялікая група падпольшчыкаў — дэлегатаў VI з'езда і членаў VI пленума ЦК КПЗБ. Ён таксама ехаў на з'езд і пленум. Недзе ў свядомасці смылела пытанне: «Што далей?» І адказ на яго напрошваўся, здаецца, ясны: далей, куды накіруюць... У краі, напэўна, не давядзецца працаваць некаторы час. Задоўга і так выпрабоўваў свой удачлівы лёс. Трэба і меру знаць, няхай прыстойны ягамосць з вусікамі перастане цікавіць паліцыю... Зрэшты, можа, хутчэй сама паліцыя пачне цікавіць толькі гісторыкаў... Блізіцца вялікі канец. Час развязкі.

Пра тое, дзе давядзецца працаваць пасля з'езда, можна было не турбавацца. Альшэўекі ведаў, што часова яго зноў могуць выкарыстаць на рабоце ў партшколе, ну і ў замежнай рэдакцыі, у гаспадарцы Антося. Перад Антосем Юрка не адчуваў віны: ну, была фракцыйная сутычка. Урэшце, як тады гаварылася: усякая крытыка — карысна. Хто не зазнаў тады смаку крытыкі і самакрытыкі? Вунь, усё тадышняе кіраўніцтва КПП прызнала на пленуме, што быў дапушчаны перагіб з прафсаюзамі. Усё кіраўніцтва самакрытыкавалася, а то адзін

чалавек. Зрэшты, і Антось не заставаўся ў даўгу. І ён жа, выступаючы на пленуме, гаварыў, што ў справаздачы Юркі Пружанскага зусім нічога няма пра небяспеку апартуністцкага ўхілу.

Гэта быў паядынак, з такіх сутычак і складалася фракцыйная баталія.

У дарозе думкі павялі Юрку назад, да пачатку 1926 года. Прыгадалася яго першае вяртанне з падполля ў Маскву на III канферэнцыю КПЗБ. Тады быў на душы падобны неспакой і трывожна-радаснае хваляванне: ці зможа ён добра выступіць? Ці ўдасца расказаць пра ўсё коратка і цікава? Не лёгка зацікавіць такі высокі форум, данесці кіраўніцтву падполля настроі і справы юных пераможцаў! Юрку бянтэжыла тады адна акалічнасць: рабіў справаздачу ён фактычна за Веру Харужую, за яе амаль двухгадовую работу па арганізацыі заходнебеларускага камсамола. Сам ён працаваў на гэтым участку толькі год. І гэта, як ні кажы, скоўвала. Магло выглядаць, што не зусім сціпла з яго боку ўжываць рытарычныя пытанні: «Што зрабіў наш камсамол за два гады існавання? З якімі вынікамі прыехалі мы на партыйную канферэнцыю»? І самому катэгарычна адказваць на іх: «Камсамол вырас у вялікую арганізацыю. Яго рады налічваюць больш за тысячу членаў. Усе яны аб'яднаны ў ячэйкі, раёны, акругі. Сама арганізацыя ўмацавалася, вылучыла са свайго асяроддзя добрых кіраўнікоў і стала рэальнаю баявою сілай! Калі год назад камсамол наш быў пераважна гарадскім, мястэчковым, дык цяпер у сваіх радах ён налічвае да 60 працэнтаў вясковай беларускай моладзі. Маладая вёска прачнулася, устае ў рэвалюцыйным пратэсце».

Дэлегаты канферэнцыі зразумелі Юрку правільна: ён гаварыў не ад сябе, а ад імя заходнебеларускага камсамола. Засталіся ў памяці радасныя ўсплёскі, салодкае заміранне, калі заўважыў, што яго слухаюць. Ветэраны рэвалюцыі задаволены камсамолам...

Цяпер Юрка вёз у Маскву яшчэ больш важкія вынікі. Ды і заданне выконвалася больш адказнае. А выканалася ў цэлым паспяхова. Цяпер можна далажыць пленуму, што, нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі, Кампартыя Заходняй Беларусі вырасла. У яе радах — больш за сем тысяч членаў! І хоць

палавіна з іх сядзіць за кратамі турмаў, надзвычайныя суды бязлітасна косяць пад корань адважных байцоў — за мінулую зіму вынесена ажно 60 смяротных прысудаў — партыя далей расце, партыя гартуецца, партыя становіцца ўсё больш грознаю для ворага сілай.

Юрка адбіраў у думках найбольш паказальныя факты, якія павінны былі пацвердзіць наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі ў краі, такога становішча, калі нізы не хочуць жыць па-старому, а вярхі не здольны ўтрымаць панаванне старымі метадамі. Ён унікліва думаў над тым, якую ж спецыфіку мае сусветны крызіс у Заходняй Беларусі? І зноў прыгадаўся яму Антось. Выходзіла, як бы на яго баку была пэўная рацыя. Ва ўмовах крызісу ў Заходняй Беларусі супраць улады польскай буржуазіі і памешчыкаў выступала практычна амаль уся працоўная вёска. «Амаль уся,— гаварыў ён сабе і растлумачваў прычыны такой анамаліі: — Крызіс абвастрыў супярэчлівасці паміж польскай і беларускай буржуазіяй. Галоўнае тое, што меўся сказаць і з трыбуны пленума — галоўнае, што маса нам верыць, маса спадзяецца, маса чакае сігналу да апошняга бою. І ўжо па ініцыятыве з нізу пачалася падрыхтоўка. Гэта заўважана кіраўніцтвам. Для зручнасці кіравання народнымі выступленнямі створаны новыя поруч з шасцю ранейшымі акругамі.

Юрку хацелася далажыць з'езду польскіх камуністаў пра сітуацыю ў Заходняй Беларусі не толькі дакладна, але і эфектна. Хацелася дабіцца ад з'езда ўхвалення наступальнай тактыкі. Трэба рыхтаваць усеагульную стачку. Ад стачкі перайсці да паўстання. Галоўны плацдарм, на якім павінна пачацца сутычка,— армія. Выйграем бітву за армію — пераможам у паўстанні.

Юрка рыхтаваў спецыяльна некалькі цікавых фактаў, якія, спадзяваўся, дэлегаты ўспрымуць як сімптом таго, што войска можна перахіліць на свой бок. Летам, у час набору рэкрутаў, цэлы эшалон навабранцаў па дарозе з цэнтральнай Польшчы ў Вільню пачаў бунтавацца. На прыпынках, дзе спыняўся эшалон, актывісты склікалі мітынгі і адкрыта выкрывалі агрэсіўную палітыку ўрада. Заклікалі не ваяваць супраць дзяржавы рабочых і сялян, мелі послух у народзе. На станцыі Варэна дайшло да сутычкі з паліцыяй. У Вільні

ўзбунтаваны эшалон сустрэла жандармерыя, на пероне былі выстаўлены кулямёты. Штаб паўстаўшых салдат забарыкадзіраваўся ў вагоне. Толькі пасля ўпорнай сутычкі жандарам удалося захапіць штаб паўстанцаў.

І ўсё ж, чым больш ён паглыбляўся ў станоўчыя факты змагання, тым вастрэй адчуваў позвы нейкай няяснай трывогі.

Прайшло гэтае адчуванпе толькі ў Маскве, калі ён памчаўся ў дзіцячы дом наведаць сваю Інгу, перадаць падрыхтаваныя загадзя ў Варшаве падарункі. Юрку ўразіла і расчуліла падабенства дачушкі да маці. Прыгадалася яму першая сустрэча з Розай у Беластоку. Яна была супрацоўніцай «Цэнтральнай тэхнікі» КПЗБ і па абавязку павінна была звязаць яго з Верай Харужай. Адчувала сябе дзяўчына ўпэўнена, свабодна, як рупная, але не назойлівая апякунка. Прывяла яго ў дом Эпштэйна на Сасновай вуліцы, дзе спынілася Вера, пабыла, покуль яны абмяняліся прывітальнымі словамі, адкланялася і пайшла. Толькі на адыходак акінула яго, добра апранутага кавалера, уважлівым позіркам і штосьці зычліва, нібы адабрэнне, прамільгнула ў яе выглядзе.

Другі раз яны сустрэліся ў часе III Канферэнцыіі КПЗБ у Маскве. Юрка быў тады сакратаром ЦК камсамола Заходняй Беларусі і адчуваў патрэбу апекаваць асабліва тых дэлегатаў, якія былі ў Маскве ўпершыню. Ён збіраў іх у групу, вадзіў па памятных мясцінах сталіцы. Тады і вылучыў з гурту высокую шатэнку з вялікімі, як бы здзіўленымі вачыма. Прыгадалася беластоцкае знаёмства. Запамяталася яму Роза і тым, што лягчэй за іншых ужывалася ў рытм вялікага горада і не скардзілася на зморанасць. Яны тады жылі ў адным атэлі, разам харчаваліся і неўпрыцям пазнаёміліся асабіста. А потым прыйшлі сустрэчы ў Пінску і на Навагрудчыне.

Дачушка, якая, відаць, нейкім яшчэ невядомым адчуваннем улоўлівала ў ім тую добрую і дужую істоту, якая можа абараніць яе ад усіх небяспек вялікага і невядомага ёй свету,— цягнулася і тулілася да яго. Бацька расчульваўся, тулячы да грудзей сваю малечу, самую любую на свеце, якая, на жаль, не магла зразумець яго праблем і трывог, надзей, якія зараджаліся недзе ў тым дзіўным свеце дарослых людзей. Юрку ахапіла нейкая шчымлівая скруха. І міжвольна пашкадаваў, што іх адносіны з Розай вярнуліся назад, на пройдзеную

стадыю дружбы. Хацелася пабыць вось утраіх і ўдосталь нацешыцца радасцю.

На вечар у Юркі было прызначана спатканне з віленскім прыяцелем Абрамам Цукерманам, які цяпер працаваў у Камінтэрне. Юрка сустрэў у Цукермана яшчэ аднаго дэлегата з'езда, вядомага падпольшчыка Стэфана Бергмана, з якім у апошні год даводзілася рэгулярна кантактавацца ў Варшаве. Яны прасядзелі далёка за поўнач. Кожны шчыра гаварыў аб праблемах сусветнай палітыкі. Гаварылі як адзінадумцы, сябры пра складаны, супярэчлівы свет, стараючыся прадбачыць, угадаць шляхі яго руху ў будучыню. Палітыка для іх, прафесійных рэвалюцыянераў, стала сэнсам жыцця, найвялікшаю страсцю, заманлівай і трывожнаю таямніцай. Яна іх яднала, узвышала над звычайнымі клопатамі падобна да таго, як чыстая любоў узвышае закаханых паэтаў.

Неўзабаве Юрка даведаўся, што VI з'езд КПП адбудзецца не ў Маскве, а пад Магілёвам, і выехаў у Беларусь.

У Мінску гаварылі, што чакаецца абмен вялікай групы палітзняволеных з польскіх турмаў, пачынаецца падрыхтоўка да VI з'езда КПП і адпаведнага пленума КПЗБ. Уключыўся ў гэтую работу, пераносячы назіранні і вывады, сабраныя ў краі, на старонкі праектаў будучых пастаноў.

Акт абмену палітвязняў адбыўся 15 верасня. Сярод абмененых былі Вера Харужая, паслы «Змагання» Дварчанін, Гаўрылік, Крынчык, быў там і таварыш Альшэўскага па варшаўскаму арышту Шайкоўскі. Судзілі тады яго ў славутым працэсе «трыццаці пяці» і далі ажно 15 гадоў турмы — тэрмін, які і на дваіх падзяліўшы нялёгка было перажыць. Пасля абмену Альшэўскага ён амаль чатыры гады пакутаваў у катаржнай турме. Сябра па ўсыпцы меў падставу адчуваць сябе ахвярай, як бы казлом адпушчэння, забытым, не ў прыклад напарніку, і абойдзеным увагай. Альшэўскі, напэўна, прымаў удзел ва ўрачыстай сустрэчы і шанаванні герояў падполля, вітаўся з Верай Харужай.

У кастрычніку праходзіў VI з'езд КПП і VI пленум КПЗБ.

На з'ездзе і пленуме было прызнана, што рэвалюцыйны рух у Польшчы ідзе на ўздым. Пачатак жнівеньскіх халадоў падагрэлі сялянскія паўстанні ў Камень-Кашырскім павеце, забастоўкі лесарубаў і вазакоў Ружанскай пушчы і

партызанскія баі з карнікамі па ўсім Палессі. З'езд растлумачыў камуністам, што партыя павінна падтрымліваць усе стыхійныя паўстанцкія дзеянні, але не фарсіраваць іх. Абвешчаны быў курс на ўсеагульную забастоўку ў гарадах і павелічэнне дружын масавай самаабароны ў вёсках. Летам наступнага года зноў выбухнула сялянскае паўстанне — Кобрынскае, яго лозунгам было падтрымаць хваляванні кракаўскіх сялян. Гэтыя падзеі, што адбываліся ў родных мясцінах Альшэўскага, а таксама барацьбу за беларускую школу па ўсёй Заходняй Беларусі апісала ў лістоўках, артыкулах і брашурах Вера Харужая, якая пасля вяртання ў БССР пэўны час працавала ў замежнай рэдакцыі КПЗБ. На жаль, рэвалюцыйныя выступленні і тады не перараслі ў той апошні ўдар, які мог разбіць ланцугі Праметэя.

## ЭПІЛОГ

Час чалавечы працякае не так роўна, як цурок пяску ў клепсыдры. Імпульсамі прабіваецца праз лабірынты жыцця набраклая драматызмам плынь чалавечага часу. Пульсуе час разам з крывёю ў жылах. З ракою параўноўвае мастацкая фантазія цячэнне жыцця: як у сапраўднай рацэ, ёсць тут свае крутыя віры і глыбокія адвоі, быстрыя солы і роўныя плёсы, пясчаныя гакі, сонныя старыцы і нястрымныя прорвы. Толькі з адлегласці гадоў рэчышча жыцця выглядае роўным, нібыта і не было ў ім тых кіпучых парогаў і санлівых бухтаў, а толькі адзін прамы плёс, шырокая эпічная плынь пад высокім сонцам. Так абсалютна роўна і ясна працякае не час, а ідэя часу, яго абстрактнае іншасказанне і дыялектычнае вытлумачэнне...

Званок міжгародняй лініі пазнаецца адразу — настойлівы, нецярплівы, загадны, як на пажар. Хутка здымаю трубку. «Адкажыце Гродна».

— Здароў, Іны маёй у вас няма? — я пазнаю Аляксея Карпюка. Вітаюся і, як заўсёды, Аляксей дзелавіта вядзе сваё: — Там у вас, у Брэсце або недзе пад Брэстам, Іна. Заўтра, напэўна, будуць у крэпасці, пастарайся перадаць ёй...

— Я не разумею.

— З вучнямі сваімі, ну турыстамі. Дык перадай ёй, што Лена здала апошні экзамен на «пяць». Хай не турбуецца.

Гляджу на гадзіннік — адзінаццаць вечара. На дварэ зябка, збіраецца на дождж. Я ведаю, што Іна, Алёшава жонка, не мае спартанскай загартоўкі. Трэба адшукаць яе, забраць дамоў. Начаваць у палатцы такою ноччу без прывычкі... Выпытваю Алё шу, але ён цвердзіць сваё:

— Не трэба, не шукай. Замерзне? Дык гэта ж ёй і трэба. Дзеля таго і паехала, каб паспытаць цяжкасцей. Калі ласка, не адбірай у чалавека гэтай прыемнасці. Раніцой у крэпасці сустрэнеш.

Падпарадкоўваюся. Раніцай знаходжу гродзенскі аўтобус. Вучні ля сцен гераічнай цытадэлі ідуць павольна, адчуваюць сябе не па гадах дарослымі. Шукаю настаўніцу і ледзь пазнаю яе ў турысцкай куртачцы. Бачу — змораная, але задаволеная, хіба не падарожнымі цяжкасцямі, пра што гаварыў Аляксей, а тою прыемнай і цяжкай патрэбай педагога аддаваць па частках сябе выхаванцам — свой час, свой сон, свой вопыт. Гэта недаспаная клопатная ноч у дарозе, падарожныя гутаркі зблізілі вучняў з настаўніцай. І ёй прыемна.

— Ведаеш, Валодзя, гэтых жа сурвіцеляў у класе не пазнаеш. Там я за дваццаць без малага год работы ніколі голасу не павысіла, а сёння ноччу ахрыпла. Што на іх найшло? Падурэлі проста. А цяпер зноў вунь, глядзі, якія сур'ёзныя. Люблю чамусьці павалтузіцца з імі.

Я гавару пра ўчарашні тэлефонны званок. Іна рада за дачку-дзесяцікласніцу: медалісткаю будзе. Здаўшы вучняў у рукі экскурсавода, мы гутарым аб сваіх педагагічных клопатах, пераходзім на літаратурныя, і раптам я прыкмячаю, што Іна хоча і не рашаецца нешта сказаць мне. Чакаю, не настойваю, каб не пагасіць яшчэ не цвёрдага намеру.

— Я нешта прывезла табе, ты ж займаешся гісторыяй Заходняй Беларусі і літаратурай. Можа, табе прыдасца, зацікавіць...

— Што, Іна?

— Бацькавы пісьмы. Ты ж, напэўна, чуў пра яго?

— Так, сустракаў даволі многа матэрыялаў і ў падпольнай прэсе, і ў архівах. А як жа...

— У мяне пра яго нейкія светлыя-светлыя дзіцячыя ўспаміны. Адзін час даволі часта прыходзіў наведваць мяне ў

дзетдоме. І заўсёды нейкі сонечны, ясны, як чарадзей, з поўнымі прыгаршчамі шчасця. Можа, гэта суб'ектыўнае... Я, мабыць, сентыментальная?..

— У такія моманты твой бацька, Іна, звык гаварыць: «Ну, добра!» І спускаў гаворку на гаму ніжэй. Так казалі мне яго знаёмыя. Гледзячы збоку, мне таксама здаецца, што ён меў няўрымслівае, гарачае сэрца.

— Маці мая, пасля майго з'яўлення на свет, скончыла партыйныя курсы ў Маскве і зноў пайшла сюды, у Заходнюю Беларусь, у падполле, а бацька вярнуўся, працаваў пад Масквой, на прафсаюзнай рабоце. Я вырасла ў дзіцячым доме, разам з дзецьмі многіх іншых рэвалюцыянераў — польскіх, іспан-кіх, нямецкіх...

Я прыпамінаю тры тамы судова-следчых матэрыялаў па справе Фейгі Цыгельніцкай (Розы), якія чытаў у Вільнюскім архіве, нібы сапраўдную прыгодніцкую аповесць.

— Дзесьці я сустракаў — пра такіх дзяцей.

— У Гайдара? — пытаецца Іна. І я прыгадваю той твор. Дапамагаем адзін аднаму ўзнавіць дэталі.

Дзейнічае ў аповесці «Ваенная тайна» хлопчык, савецкі піянер родам з-пад Брэст-Літоўска, паляк з абеларушаным імем Уладзік Дашэўскі. Ад яго пераймае беларускае слова «дапытваць» Алька Ганін, сын былога чырвонаармейца, савецкага інжынера і румынскай рэвалюцыянеркі. Слова «дапытваць» стала зразумела і савецкім дзецям, за тысячы кіламетраў ад Польшчы, у сонечным Крыме, дзе размясціўся піянерскі лагер. Дружаць тут піянеры розных нацыянальнасцей, іх родніць любоў да камуністычных ідэалаў і непрыманне эгаістычнай маралі ўласніцкага свету, дзе пакутуюць людзі працы, гібеюць і гінуць за свабоду лепшыя сыны народа, сярод іх сястра Уладзіка і маці Алькі.

Няўрымслівы сурвіцель, рамантычны фантазёр, Уладзік нагадваў, мабыць, аўтару Анатоля Альшэўскага з арзамаскіх далёкіх часоў. Але Уладзік дзейнічаў у іншую пару, калі Альшэўскі быў Юркам, калі, паводле слоў Гайдара, «моцна пахла навальніцамі, войнамі і цэментам новабудоўляў». Прадчуванне непазбежнай сутычкі паміж новым і старым светам перадаецца піянерам. Клімат сусветнага напружання больш сталы, чым прыродны клімат, тут не мяняюцца нават поры года. І пад промнямі крымскага сонца не аціхае

напружанне, пільнасць, піянерская гатоў насць. Дзеці жывуць трывогамі дарослых. Іх фантазія працуе сурова. Уладзік марыць здабыць цудоўны парашок, стаць чалавекам-нявідкай, каб пранікнуць у Варшаву і перабіць турэмных стражнікаў, вызваліць сястру і ўсіх зняволеных, падняць рэвалюцыю. Яго сябар Алька ведае трагічную казку пра Мальчыша-Кібальчыша. Сюжэт казкі расказала дзецям з дазволу Алькі піянерважатая Ната. І ўвесь лагер слухаў яе затаіўшы дыханне. Нават сігнал на абед не перашкодзіў дaслухаць гісторыю нязломнага Мальчыша, які мужна памёр, не выдаўшы «буржуінам» ваеннай тайны.

Альшэўскі мог чытаць аповесць Гайдара, калі быў ужо на пасадзе старшыні мясцкома вялізнай фабрыкі ў Мыцішчах пад Масквой. Аказалася карыснай яго біяграфія падпольшчыка. У вачах рабочых ён быў прамым сведкам агоніі старога свету, насіў на сваім целе сляды катаванняў. Прафсаюзны лідэр удзельнічаў у выхаванні рабочых, памнажаў ваенную тайну сацыялізма, тайну згуртаванасці духу, вернасці ідэі. Маральная сіла савецкіх людзей, зразумела, была тайнай толькі для верхаводаў старога свету, якія жылі па законах уласніцтва, эгаізму і таму не маглі ўразумець і ацаніць гэтай незвычайнай тайны.

У жудасным каскадзе трагічнага і пераможна-радаснага Альшэўскаму мог нагадацца дух Веры Харужай, матывы яе нарысаў пра байцоў камсамольскіх баявых дружын, што на вуліцах Варшавы, Кракава, Львова каралі смерцю правакатараў і гінулі ў няроўных баях з паліцыяй. Перанесеныя ў дзіцячы свет суровыя «дарослыя» законы барацьбы адзываліся ў асобных мясцінах аповесці Гайдара.

Напэўна, расчульваўся Анатоль Альшэўскі над старонкамі аповесці Гайдара, прыгадваючы лёс сваёй дачкі, якая падобна Альку, ледзь памятала сваю маці-падпольшчыцу, ды і яго самога не часта.

— Ад бацькі,— вяртаецца да пачатку нашай размовы Іна Анатольеўна,— у мяне адзіная памятка: пісьмы да родных ды здымкі. Зоя Адамаўна захавала і перадала. Яшчэ, праўда, рушнічок вафельны. Пакінуў, як заходзіў да бацькоў у Бярозу апошні раз. Дамашні льняны ўзяў, а свой крамны пакінуў…

Словы гэтыя пераносяць мяне ў Бярозу, у драўляны домік на вуліцы Альшэўскага, 56. Бачу паважаную Зою Адамаўну, чую яе ўсхваляваны голас:

— Яраслаў у вайну ўступіў у апалчэнне. Ён заўсёды быў і застаўся сумленным і да канца верным рэвалюцыі. Паведамленне сям'я атрымала: «Старшы лейтэнант Яраслаў Адамавіч Альшэўскі загінуў смерцю мужных 21 студзеня 1942 года».

Разглядаю фотаздымак: аскетычны твар, адкрыты погляд вострых і крыху летуценных вачэй, перакінуты цераз плячо шалік хавае пятліцы і афіцэрскія знакі камісара Альшэўскага. Здымак зроблены ў Маскве, калі ён працаваў выкладчыкам у вайсковай акадэміі. Яраслаў Адамавіч здымаўся, відаць, спецыяльна так, каб можна было паслаць фотакартку за мяжу, у Бярозу. Хай такім ён і застанецца ў памяці нашчадкаў.

## ПРАЦЯГ ЭПІЛОГУ

Прайшло некалькі год пасля таго, як я апублікаваў газетны варыянт гэтай аповесці. Апынуўся я ў Гродна, прывёз экскурсію брэсцкіх студэнтаў і гасцюю ў Карпюкоў, у новай кватэры, якую яны абжываюць, вядуць сямейнае спаборніцтва па частцы густу і знаходлівасці. Аляксей асвойвае занадта вялікую, як на меркі былога вяскоўца, плошчу балконаў — носіць зямлю і садзіць кветкі. Іна занята размяшчэннем кніг, якіх у хаце набралася столькі, што нялішнім было б нейкае спецыяльнае сховішча. Ды хіба архітэктары маглі прадбачыць такую нестандартную сямейку, дзе гаспадар пісьменнік, гаспадыня загадчыца кафедры педагогікі ў пядінстытуце, а дачка настаўніца замежнай мовы. Тры спецыялізаваныя бібліятэкі ў адной кватэры, хоць і добрай сучаснай кватэры, не так проста размясціць. І вось пасталі кніжныя шафы, адны з выразам нерашучасці, як выпадковыя госці, у прыхожай, другія на правах сяброў зайшлі ў гасціную, а трэція трапілі ў рабочы кабінет гаспадара і ў пакой дачкі, чацвёртыя — з прэтэнзіяй на статус любімчыкаў — у спальню, пад крыло самой гаспадыні.

— Гэта ўсё ў нас яшчэ часовае. Вось нажывём сучасныя стэлажы, і тады эстэтыку ў інтэр'ерах навядзём. Ты ж у гэтым павінен разбірацца, выкладаеш эстэтыку,— паддобрываецца Іна,— кніга ж можа стаць і дэкаратыўным кампанентам, праўда?

— Напэўна. У Пімена Панчанкі,— жартую я,— ёсць сатырычны верш пра аднаго ўладальніка бібліятэкі, дзе кнігі толькі дэкаратыўную функцыю і выконваюць. Праўда, кнігі ўрэшце ўзбунтаваліся, пакрыўджаныя класікі падалі ў суд на кнігаўладальніка. Вам, на шчасце, не пагражае такі судовы працэс. Дарэчы, можа, у цябе ёсць яшчэ адзін лішні экземпляр твайго аўтарэферата? Той, што ты мне прыслала, «зачыталі» нашы маладыя педагогі.

— Святое зладзейства?

— Хіба так. На пацеху прымі радок Ясеніна: «Плохую лошадь вор не уведет...»

«Праблема самасцвярджэння старэйшых школьнікаў у класным калектыве» — так па-навуковаму фармулюецца тэма Інінай дысертацыі.

Не з кніжных захапленняў зарадзілася ў Іны Анатольеўны Карпюк жаданне шукаць сродкі педагагічнага кіраўніцтва працэсамі самасцвярджэння падлеткаў. Усё гэта вырастала з жыцця, з вопыту настаўніцы і маці траіх дзяцей, у якой адна дачка пайшла следам за маці, сын закончыў спецыялізаваны інстытут і штурмуе недзе таямніцы атама, а другая дачка якраз «самасцвярджаецца». На ўжытак навукі дысертантка ставіла, напэўна, і ўласны колішні боль, калі ёй, пачынаючай настаўніцы, даводзіласл пакутаваць ад бяссілля і скардзіцца сваёй маці, а тая адказвала ёй формулай: «Уліся ў калектыў».

Формула была слушнай, праверанай. Маці, трапіўшы ў камуністычнае падполле, спазнала сілу салідарнасці таварышаў, ведала сілу калектыву. Ужо на схіле год пайшла яна, патомная гараджанка, у адсталы калгас, узначаліла партком і яшчэ раз выпрабоўвала даўнюю зброю, цераз калектыў перавыхоўвала людзей і выцягвала адсталую гаспадарку ў перадавыя. Сакратар парткома калгаса «Расія» Фаіна Абрамаўна Цыгельніцкая выходзіла пасля некалькіх гадоў

работы на пенсію, узнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. І дзякавала калектыву, з якім сама мела шчасце зліцца і ўзняцца на невядомы дасюль ёй рубеж.

У маці заўжды ўсё было ясна і пэўна. Яна ведала, што ўсім людзям патрэбен калектыў — носьбіт грамадскай і стваральнай сілы.

Мы гаворым з Інай пра новую для яе работу на кафедры ў педінстытуце, жартуем, але ніяк не магу я вызваліцца ад дзіўнага пачуцця: увесь час бачыцца мне яна, дарослая жанчына, вучоны, педагог, тым дзіцём, што, выхоўваючыся «калектыўна», з першых дзён сваёй свядомасці ахвяроўвала калектыву бацькоў. А яны ішлі служыць той справе, цаны якой яшчэ не ведала дзіцячая галоўка. І ажывае гэтае адчуванне, калі гаворка заходзіць пра бацьку. Мы, дарослыя, ведаем, што лепш бывае асабістага не закранаць. Але яно само выплывае на паверхню. Прыгадвае дачка вафельны бацькаў ручнічок. Падпольшчык прынёс яго калісьці дамоў у Бярозу, аддаў сястры Зоі памыць, а тая паглядзела і сказала, што тут, у Польшчы, такіх ручнікоў не прадаюць, не ўжываюць і лепш яму ўзяць ручнік саматканы. Так і захаваўся ў куфры бацькаў ручнік. Сямейная рэліквія — адзіная асабістая рэч няўрымслівага, слаўнага чалавека, рэвалюцыянера.

Заляжаўся, стаў шэрым ручнік, устарэлі многія артыкулы, лістоўкі, пісаныя гарачаю рукою Юркі Пружанскага, не старэюць толькі тыя добрыя справы, якія ён зрабіў, не старэюць цёплыя пачуцці да родных і хараство душы, якая найпаўней раскрывалася ў пісьмах дамоў. Засталася памяць сяброў па змаганню тут, на Палессі, і па ўсёй краіне. Імя яго носіць школа-інтэрнат у Пружанах і піянерская дружына ў сярэдняй школе на Броннай Гары, там, дзе здзейсніў неўміручы свой подзвіг юны мінёр-партызан Коля Гойшык. Жыве і шырокае гучнае рэха легенды.

## ЗМЕСТ

Да юных чытачоў . ........ 6

Пісьмы ў Бярозу .................. 7
Арзамас .......................... 11
Памятны 1920 .................... 24
Весткі з выраю . . . . . . .32
Поплеч з Верай ........ 46
Другі заход ......................... 60
Новае заданне ..................... 65
Хмурая Наваградчына ........ 92
«Усыпка» ............................. 108
На шчаслівы круг ................ 121
Зменлівасць лёсу................. 130
Ланцугі Праметэя ................ 145
Эпілог ................................. 153
Працяг эпілогу .................... 157

ВЛАДИМИР АНДРЕЕВИЧ КОЛЕСНИК ПОСЛАНЕЦ ПРОМЕТЕЯ
Документальная повесть
Для старшего школьного возраста
Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке
Рэдактар У. Б. Ідэльсон
Мастацкі рэдактар В. І. Клгменка
Тэхнічныя рэдактары В. А. Калядс, Г. М. Шашко
Карэктар М. А. Паддубская
ІБ № 221
Здадзена ў набор 08.07.83. Падп. да друку 20.06.84. АТ 22527. Фармат 84Х100732. Пашра друк. № 2. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 7,80 + 0,39 укл. Ум. фарб.-адб. 8,77. Ул.-выд. ар<. 8,26 + 0,21 укл. Тыраж 12 000 экз. Зак. 3855. Цана 30 к.
Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 2206СГО, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбі-нат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.